Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

14 ЛІПЕНЯ 2009 г.
АЎТОРАК
№ 128
(26486)

Кошт 600 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

«ІНТАРЭСЫ НАРОДА— ВЫЗНАЧАЛЬНЫ ФАКТАР УДЗЕЛУ БЕЛАРУСІ Ў САЮЗАХ»

Аляксандр Лукашэнка даў інтэрв'ю аўстрыйскай газеце Die Presse.

Для Беларусі выгадная роля моста паміж Еўрапейскім саюзам і Расіяй, заявіў кіраўнік дзяржавы выданню.

«Я часта гавару адкрыта аб тым, што Богам нам прадвызначана жыць паміж гэтымі гігантамі, выконваючы ролю моста паміж Еўрапейскім саюзам і Расіяй. І выконваць ролю моста мы абавязаны, таму што такое наша становішча. І, што там граху таіць, гэта эканамічна выгадна. Таму што транзіт — гэта пэўная частка даходаў нашай дзяржавы, няхай не самая большая, але гэта вельмі важна. Гэта і палітычны, гэта і нейкі эканамічны ўплыў, нейкія рычагі. Таму адмовіцца ад гэтай ролі мы не можам, пагадзіцеся. Гэта аб'ектыўна. Так прадвызначана нам. А калі мы не можам ад гэтага адмовіцца, мы будзем жыць у гэтых умовах. Мы вымушаны будзем праводзіць шматвектарную палітыку, будуючы свае добрыя адносіны з Еўрапейскім саюзам і з Расійскай Федэрацыяй», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка пагадзіўся з прапановай выдання аб тым, што, праводзячы шматвектарную палітыку, «мы трапляем, як у жорны». «Гэта сапраўды так. Лёс наш такі. І там сусед, і тут сусед. І мы вымушаны з імі падтрымліваць нармальныя адносіны. Бывае, сапраўды краіна трапляе быццам бы «на разрыў». Ну так, на тое і кіраўніцтва ў краіне, якое абавязана неяк балансаваць сітуацыю і гэтыя адносіны. Таму мы не бачым іншага шляху, як спрабаваць утрымацца тут і выканаць ролю сувязнога звяна паміж Еўропай і Расіяй», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

У Беларусі немагчыма існаванне дыктатуры, лічыць Аляксандр Лукашэнка. Паводле слоў беларускага лідара, «калі б у нас была дыктатура, нас даўно раздавілі б». «У нас няма ядзернай зброі, энерганосьбітаў і гэтак далей. Мы ж залежныя ад свету па ўсіх артыкулах. Мы не можам тут праводзіць тую палітыку, якая сёння сусветнай супольнасцю не ўспрымаецца, у тым ліку і Аўстрыяй. Дыктатары сябе так, як я, не паводзяць. Але трэба было бірку на Прэзідэнта Беларусі павесіць, таму што Лукашэнка не амерыканскі, не праамерыканскі», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Пры гэтым ён дадаў: «Так што ніякай дыктатуры тут няма. Тое, што ў Прэзідэнта сканцэнтравана пэўная ўлада, і немалая, — гэта праўда. У нас дыктатуры быць не можа, таму што нас адразу ж задушаць, адразу ж!»

«Але вазьміце больш сур'ёзныя рэчы. Узялі і разбамбілі Ірак. З якой прычыны? Што там дыктатар, які стварае ядзерную зброю. Дыктатара няма. А ядзерная зброя дзе? Таксама няма. Дзіўна неяк атрымліваецца... Бірку вешаюць і пачынаюць пад гэта трапаць чалавека, краіну», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Адказваючы на пытанне аб негатыўных выказваннях грамадзяніна ЗША Эмануіла Зэльцэра, які быў памілаваны Прэзідэнтам Беларусі і вызвалены з папраўчай калоніі, кіраўнік дзяржавы заўважыў: «А чаму вы слухаеце тое, што сказаў Зэльцэр? Чаму вы ў гэта верыце?.. Парушыў ён наш закон? Парушыў. Ён прызнаў гэта. Ён атрымаў пэўны тэрмін па пэўным артыкуле. Ён параўноўвае КДБ з гестапа? З гестапа ніхто не выходзіў. А ён выйшаў здаровы. Мы любога заходняга дыпламата, асабліва амерыканцаў, бесперашкодна да яго дапускалі. Бесперашкодна! Не было ніякіх пытанняў. У яго тут былі іншыя мэты, яго сюды ніхто не клікаў. Таму ўсе яго словы — адна хлусня. Ён адразу ўсё расказаў: чаго прыехаў і што ён хацеў. Пайшоў у суд, атрымаў тэрмін і ўвесь час прасіў, каб яго вызвалілі».

Аляксандр Лукашэнка таксама развеяў домыслы аб тым, што быццам бы рыхтуе малодшага сына ў якасці пераемніка: «У нас гэта немагчыма. І калі я гаварыў пра свайго малога, то гэта быў звычайны жарт. Але журналісты гэта ўспрынялі чамусьці сур'ёзна».

Падчас гутаркі кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што Беларусь праз 10 гадоў бачыцца яму «квітнеючай дзяржавай, да якой ніхто не будзе мець ніякіх прэтэнзій, у тым ліку і Аўстрыя».

Адказваючы на пытанне, ці будзе тады Аляксандр Лукашэнка Прэзідэнтам Беларусі, кіраўнік дзяржавы адзначыў: «Праз 10 гадоў? Наўрад ці, вядома. Я думаю, да гэтага часу вырастуць новыя людзі, якія возьмуць у рукі краіну і павядуць яе. Але запомніце: у нашай краіне хто будзе Прэзідэнтам, чарговым, будзе вызначаць толькі беларускі народ. Я памятаю, як мяне выбіралі. Так тады вырашыў народ. І гэта святое права ніхто не можа ў яго, у гэтага народа, адабраць. І я гэта права ў свайго народа адбіраць не маю намеру».

Сусветны крызіс не прымушае Беларусь паскорыць раздзяржаўленне прадпрыемстваў або пераглядзець праграму прыватызацыі, пераканаў кіраўнік дзяржавы.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

«РАСЦЕ» СТУДЭНЦКАЯ ВЁСКА

***Аляксандр ЖЫГАР** (на здымку) — выпускнік мінскага архітэктурна-будаўнічага каледжа, майстар участка будаўнічага ўпраўлення № 1 вытворчага прадпрыемства «Маналіт».*

— Аляксандр будзе класным прафесіяналам,— распавядае пра яго начальнік упраўлення Віталь Паддубны.— Два гады таму прыйшоў ён да нас пасля каледжа, і адразу было відаць: чалавек на сваім месцы. Умее арганізаваць працу людзей (а пад яго кіраўніцтвам дзве брыгады амаль па трыццаць рабочых). Своечасова даставіць матэрыялы ў пэўны час, у пэўнае месца і ў пэўнай колькасці, неабходную тэхніку, — з усім гэтым 21-гадовы юнак спраўляецца выдатна! З такімі, як Аляксандр, вялікія справы пад сілу. А «студэнцкая вёска», у будаўніцтве якой удзельнічае Аляксандр Жыгар, і ёсць такая справа.

Зараз хуткімі тэмпамі завяршаецца будаўніцтва першага корпуса на 1030 месцаў «студэнцкай вёскі» — жылога комплексу БДУ. Гэты маштабны праект быў распачаты ў лістападзе мінулага года. А ўжо сёлета, у пачатку новага навучальнага года, студэнты паселяцца ў новым будынку. А пакуль поўным ходам вядуцца завяршальныя работы, аздабленне памяшканняў, добраўпарадкаванне тэрыторыі.

Марыя ЖЫЛІНСКАЯ.
Фота аўтара.

Так будзе выглядаць «студэнцкая вёска» ў недалёкай будучыні.

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

ПАВЕТРА «РАСПЛАВІЦЦА» ДА ПЛЮС 32

На гэтым тыдні чакаецца вельмі цёплае, але няўстойлівае надвор'е, паведаміў рэдакцыі начальнік службы гідраметэапрагнозаў Рэспубліканскага гідраметцэнтра Дзмітрый РАБАЎ.

Пачынаючы з серады, на нашу тэрыторыю пачне паступаць гарачае паветра з паўднёвага захаду Еўропы. Тэмпература паветра ўначы 10—17, удзень 24—30, на поўдні краіны — да 32 градусаў. Месцамі кароткачасовыя навальнічныя дажджы. Такі характар надвор'я захаваецца да нядзелі. А вось 19 ліпеня праз тэрыторыю Беларусі будзе рухацца актыўны атмасферны фронт, таму стане свяжэй. Пройдуць добрыя дажджы. Тэмпература паветра ўначы 13—18, удзень 20-27, па паўднёвым усходзе да 28—30 градусаў.

Сяргей КУРКАЧ.

ВУП ЗА ПАЎГОДДЗЕ ВЫРАС НА 0,3 ПРАЦЭНТА

У студзені-чэрвені гэтага года ў Беларусі аб'ём унутранага валавога прадукту ў параўнанні з адпаведным леташнім перыядам вырас на 0,3 працэнта.

Паводле звестак Нацыянальнага статыстычнага камітэта, аб'ём прамысловай вытворчасці за першае паўгоддзе скарацiўся на 3,6 працэнта, аб'ём сельгасвытворчасці вырас на 6,6 працэнта. У чэрвені ў параўнанні з маем спажывецкія цэны выраслі на 0,4 працэнта. Такім чынам, за студзень-чэрвень інфляцыя ў рэспубліцы склала 7,3 працэнта, ці 1,2 працэнта ў сярэднім за месяц. Гэты ўзровень (7,3 працэнта) адпавядае ўзроўню аналагічнага перыяду мінулага года.

Ігар ГРЫШЫН.

ГРАШОВЫЯ ДАХОДЫ НАСЕЛЬНІЦТВА ЗА 5 МЕСЯЦАЎ УЗРАСЛІ НА 5,5 ПРАЦЭНТА

Паводле аператыўных звестак, у студзені-маі гэтага года рэальныя грашовыя даходы насельніцтва Беларусі ўзраслі на 5,5 працэнта ў параўнанні са студзенем-маем 2008 года. Аб гэтым паведамілі ў Нацыянальным статыстычным камітэце рэспублікі.

Прагнозам сацыяльна-эканамічнага развіцця на 2009 год прадугледжаны рост грашовых даходаў насельніцтва ў рэальным выражэнні на 14-15 працэнтаў.

БЕЛТА.

«Прамая лінія»

СЯМ'Я, ДЗЕЦІ, ДАПАМОГА

Апошнім часам статыстыка адзначае паступовы рост нараджальнасці. А адсюль — і павелічэнне цікавасці да тэмы сацыяльнай падтрымкі сем'яў і дзяцей. Дапамогі па доглядзе, бясплатнае харчаванне для дзяцей ва ўзросце да 2 гадоў, дадатковыя гарантыі працоўнага заканадаўства бацькам — аб усім гэтым і іншым мы прапануем пагутарыць падчас «прамой лініі» газеты «Звязда» з удзелам **начальніка аддзела народанасельніцтва, гендарнай і сямейнай палітыкі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Аляксандры Васільеўны ЛІСОЎСКАЙ** і **кансультанта гэтага ж аддзела Марыны Барысаўны АРЦЁМЕНКІ.**

УВАГА! Паводле папярэдняй дамоўленасці, наша «прамая лінія» пройдзе 21 ліпеня з 15 да 16 гадзін па рэдакцыйных тэлефонах (8 017) 292 38 21 і 292 38 92. Папярэднія пытанні прымаюцца па нумары (8 017) 287 17 57.

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

«СЛАВЯНСКІ БАЗАР У ВІЦЕБСКУ» МАЕ АСАБЛІВУЮ МАГІЮ І САМАБЫТНЫЯ ТРАДЫЦЫІ

«Славянскі базар у Віцебску» — нацыянальная гордасць беларусаў, сімвал адкрытасці і гасціннасці беларускай зямлі і народа. Аб гэтым заявіў 10 ліпеня Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на цырымоніі адкрыцця XVIII Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску».

Фота БЕЛТА.

«У свеце ёсць знакавыя падзеі, такія, як, напрыклад, Алімпійскія гульні, сусветныя кінафестывалі, якія сталі сімваламі найвышэйшых дасягненняў у спорце і мастацтве. Лічу, дастойнае месца ў гэтым шэрагу займае і наш фестываль мастацтваў «Славянскі базар», — лічыць Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што ў сярэдзіне 90-х, калі ўсё вакол разбуралася, рваліся векавыя сувязі, тут, на віцебскай зямлі, зацепліўся агеньчык сапраўднага мастацтва, шчырай творчасці, дружбы і брацкай згоды.

На думку Прэзідэнта, «за плячамі ў «Славянскага базару» ўжо вельмі сур'ёзныя вынікі»: калі ў першым фестывалі прымалі ўдзел усяго каля 200 чалавек з Беларусі, Расіі і Украіны, то ў гэтым годзе ў Віцебск з'ехаліся звыш 5,5 тыс. гасцей з больш як 30 дзяржаў Еўропы, Азіі, Паўднёвай Амерыкі.

«Але галоўнае дасягненне — гэта, вядома, вялікая любоў артыстаў і гледачоў», — дадаў кіраўнік дзяржавы.

Адной з асаблівасцяў фестывалю Аляксандр Лукашэнка лічыць аўру свята, якое змяняе жыццё Віцебска. «Горад становіцца сапраўднай культурнай сталіцай славянскага свету і ўжо не толькі яго», — сказаў Прэзідэнт.

На яго думку, сакрэт поспеху віцебскага форуму і яго асаблівая магія перш за ўсё ў тым, што «Славянскі базар» мае сваё непаўторнае аблічча, самабытныя традыцыі, якія, як магніт, прыцягваюць да сябе людзей.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што апошнія гады на постсавецкай прасторы з'явілася шмат разнастайных фестываляў і эстрадных шоу. «Аднак складаецца ўражанне, што яны робяцца па шаблоне, у пагоні за гламурнасцю страчваюць арыгінальнасць, не закранаюць сэрцы людзей», — сказаў Прэзідэнт, адзначыўшы, што фестываль мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» аб'яднаў харство старадаўняй славянскай культуры з рытмамі і энергетыкай сучаснай цывілізацыі.

Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што для віцебскага фестывалю прыярытэтамі заўсёды былі не камерцыйная цікавасць і піяр, а свабода творчасці і падтрымка людзей мастацтва, незалежна ад капрызаў зменлівай музычнай моды.

«Асноўнай адметнасцю «Славянскага базару» з самага пачатку было ўменне адкрыць і падтрымаць сапраўдны талент. Вельмі прыемна чуць, калі нашы госці гавораць аб тым, што менавіта «Славянскі базар» з'яўляецца магутным стымулам для развіцця нацыянальных культур блізкіх і далёкіх краін, чые прадстаўнікі лічаць за гонар выступіць на сцэне Летняга амфітэатра», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы ўручыў народнаму артысту Расіі Валерыю Лявонцьеву спецыяльную ўзнагароду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Праз мастацтва — да міру і ўзаемаразумення».

Валерый Лявонцьеў падзякаваў Аляксандру Лукашэнку за ўзнагароду. Паводле слоў народнага артыста, «Славянскі базар у Віцебску» ператварыўся ў выдатную традыцыю, і гэта традыцыя стала сапраўды народным святам.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Дзённік фестывалю

Ад «Любэ» да самых да ўскраін

Сёння ў «базарным графіку» — дзень Масквы. Музычны гонар расійскай сталіцы выпала абараняць гурту «Любэ», што па кантрасце з Днём Расіі, на якім учора гледачы пабачылі балетны цвет тэатраў Масквы і Санкт-Пецярбурга, выклікае ў заўсёднікаў канцэртаў змяшаныя пачуцці. Тым больш, што пасля суровых мужчынскіх песень ад Мікалая Растаргуева і кампаніі гледачоў чакае бліскучы, лёгкі і нават гламурны дэсерт — шоу Барыса Маісеева «Дэсерт» з удзелам знакамітых цыркавых артыстаў з канадскага Cirque du Soleil.

Таксама сёння пачнецца першы дзень VII Міжнароднага дзіцячага музычнага конкурсу «Віцебск-2009», у якім за Беларусь выступаюць, нагадаем, дзве таленавітыя мінчанкі: 12-гадовая Лаліта Гайдукевіч і 7-гадовая Маша Новік — між іншым, самая маленькая ўдзельніца конкурсу. Усяго ж на суд журы пад старшынствам народнага артыста Беларусі Леаніда Захлеўнага свае конкурсныя нумары прадставяць 19 юных артыстаў з 16 краін свету. Дарэчы, у адрозненне ад дарослага конкурсу, у дзіцячым захоўваецца перавага дзяўчат — хлопцаў, якія мараць аб артыстычнай кар'еры, усяго трое. Тым больш прычын пажадаць нашым удзельніцам не згубіцца ў гэтым кветніку і прадэманстраваць найвышэйшы клас — а яны, не сумнявайцеся, на тое здольныя.

Нарэшце, сёння будуць падведзеныя вынікі конкурснага адбору салістаў-вакалістаў у Прэзідэнцкі аркестр Рэспублікі Беларусь. На фінальным канцэрце 25 прэтэндэнтаў прадэманструюць свае лепшыя нумары — хто сольна, хто сумесна з эстраднымі і опернымі выканаўцамі, а журы на чале з галоўным дырыжорам Віктарам Бабарыкіным нарэшце абвесціць пераможцаў. Ва ўсякім выпадку, абяцае. Яно і правільна. Пацягнуць інтрыгу яшчэ некалькі месяцаў было б, напэўна, нават неразумна — з такімі тэмпамі ў жніўні гледачы могуць ужо забыцца, хто ўсе гэтыя людзі і каго, уласна кажучы, сярод іх выбіраюць.

Дзмітрый ДАНІЛЕНКА.

«Ліра» для...

Перажыванні для ўдзельнікаў XVIII Міжнароднага конкурсу эстраднай песні «Віцебск-2009» скончыліся яшчэ ўчора. Пасля двух конкурсных дзён, узяўшы на роздум належную паўзу, прафесійнае журы раздала прызавыя «Ліры». Мы з калегамі да апошняга спрабавалі ўгадаць, наколькі рашэнне журы супадзе з сімпатыямі гледачоў, большасць з якіх безагаворачна падзялілася паміж харызматычным літоўцам Іеронімасам Мілюсам, рамантычным малдаванінам Пашам Парфеніем і абаяльным беларусам Андрэем Коласавым. Але, як паказвае практыка, гледачы мяркуюць, а канчатковы вердыкт усё адно выносяць суддзі.

Нагадаем істотны момант: акрамя прызавых статуэтак, дыпломаў і спонсарскіх падарункаў, пераможцы конкурсу ў Віцебску атрымліваюць яшчэ прызы ў грашовым вымярэнні. Гран-пры роўны 10 тысячам долараў, за 1-е, 2-е і 3-е месцы прысуджаюцца прэміі ў 6, 4 і 2 тысячы долараў адпаведна. Прычым, паводле правілаў, гэтыя прэміі могуць яшчэ і падзяляцца паміж некалькімі ўдзельнікамі (акрамя Гран-пры і першай прэміі). І менавіта гэты «перадзел» заставаўся галоўнай інтрыгай да ўчарашняга вечара, бо фаварытаў конкурсу па суме двух дзён мы ўжо і так ведалі пайменна: беларускі прадстаўнік Расіі Дзмітрый Даніленка са 192 баламі, малдаванін Паша Парфеній са 188, беларус Андрэй Коласаў і македонец Улатка Лазанаскі — са 186, нарэшце, украінец Пётр Дзмітрычэнка са 182 баламі і літовец Іеронімас Мілюс са 181. Як і прадказвалася, дзяўчаты ў барацьбе за галоўныя прызы амаль адразу саступілі пазіцыі.

А падзялілі ўзнагароды паміж сабой хлопцы ў наступным парадку:

Гран-пры — як і чакалася — Дзмітрый Даніленка.

Першая прэмія — Паша Парфеній.

Другая прэмія падзелена паміж Андрэем Коласавым і Улаткам Лазанаскі.

Трэцяя прэмія — таксама падзелена паміж Пятром Дзмітрычэнка і Іеронімасам Мілюсам.

Як бачыце, узнагарод як ніколі многа. «Пераможаных на гэтым фестывалі няма», — рэзюмаваў член журы Канстанцін Масковіч.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.
Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.



Андрэй КОЛАСАЎ.

Падрабязнасці

ТРАГІЧНАЕ НАЧНОЕ ПАЛЯВАННЕ

Стрэльба, з якой быў зроблены ракавы стрэл, разам з патранташам, знойдзена ў меліяратыўным канале каля вёскі Руднішча, паведаміў **пракурор Лельчыцкага раёна Уладзімір ТАРАСЕНКА.** З перапуду зброю кінуў туды рабочы мясцовага прадпрыемства меліяратыўных сістэм пасля таго, як выпадкова забіў свайго знаёмага, егера Нацыянальнага парку «Прыпяцкі», што вывеў яго на незаконнае начное паляванне (пра гэта «Звязда» пісала ў нумары за 9 ліпеня г. г.). Зараз прызначаны следчыя экспертызы, абвінавачаны ў забойстве па неасцярожнасці грамадзянін знаходзіцца пад падпіскай аб нявыездзе. Згодна з законам, суд можа даць яму да трох гадоў пазбаўлення волі.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 14.07.2009 г. (для б/н разлікаў)

▲ 1 долар ЗША	2 882,00
▲ 1 еўра	4 016,64
1 латвійскі лат	5 740,46
1 літоўскі літ	1 163,57
1 чэшская крона	154,07
1 польскі злоты	912,36
▼ 1 расійскі рубель	87,17
1 украінская грыўня	375,99

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РФ

USD	33,0597
10 UAH	42,8679
1000 BYR	11,5271
EUR	46,0059

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2009 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

БЕЛАРУСБАНК

Ул. Мясникова, 32, г. Минск, 220050.
Тел.: (017) 200 18 31. Факс: (017) 226 47 50.
Телекс: 252408 PION BY.
E-mail: info@belarusbank.by
Интернет: http://www.belarusbank.by

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 июля 2009 года

ОАО «Акционерный Сберегательный банк «Беларусбанк»

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	2009 г.	2008 г.
1	2	3	4	5
1	АКТИВЫ			
2	Денежные средства	1101	540022,2	380251,3
3	Средства в Национальном банке	1102	910061,0	1164211,3
4	Ценные бумаги:	1103	1518137,5	1391498,6
	для торговли	11031	-	-
	удерживаемые до погашения	11032	8,8	8,1
	в наличии для продажи	11033	1518128,7	1391490,5
5	Кредиты и другие средства в банках	1105	1064355,1	1411224,8
6	Кредиты клиентам	1106	24513803,4	15636685,9
7	Долгосрочные финансовые вложения	1107	204574,3	175114,2
8	Основные средства и нематериальные активы	1108	683593,9	517672,0
9	Прочие активы	1109	419214,2	164050,6
10	ИТОГО активы	110	29853761,6	20840708,7
11	ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
12	Средства Национального банка	1202	3934865,7	1027347,8
13	Кредиты и другие средства банков	1205	1754753,0	2159257,8
14	Средства клиентов	1206	19760591,8	14566465,4
15	Ценные бумаги, выпущенные банком	1208	743819,0	470036,3
16	Прочие обязательства	1209	302484,6	208918,2
17	ВСЕГО обязательства	120	26496514,1	18432025,5
18	КАПИТАЛ			
19	Уставный фонд	1211	2287552,6	1637535,5
20	Эмиссионный доход	1212	-	-
21	Резервный фонд	1213	175441,9	109007,2
22	Накопленная прибыль	1214	582325,7	428712,3
23	Фонд переоценки статей баланса	1215	311927,3	233428,2
24	ВСЕГО капитал	121	3357247,5	2408683,2
25	ИТОГО обязательства и капитал	12	29853761,6	20840708,7
26	ТРЕБОВАНИЯ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА НА ВНЕБАЛАНСОВЫХ СЧЕТАХ			
27	Требования	1301	56738851,9	38529019,1
28	Обязательства	1302	7411284,8	4569160,9

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ на 1 июля 2009 года

ОАО «Акционерный Сберегательный банк «Беларусбанк»

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	2009 г.	2008 г.
1	2	3	4	5
1	Процентные доходы	2011	1534024,6	824848,3
2	Процентные расходы	2012	1183678,5	557894,4
3	Чистые процентные доходы	201	350346,1	266953,9
4	Комиссионные доходы	2021	214167,7	201086,1
5	Комиссионные расходы	2022	35120,1	26249,7
6	Чистые комиссионные доходы	202	179047,6	174836,4
7	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	203	39137,0	84064,0
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204	4616,2	2443,3
9	Доход в форме дивидендов	205	526,6	551,8
10	Чистые отчисления в резервы	206	108755,4	5367,2
11	Прочие доходы	207	210309,5	29702,9
12	Операционные расходы	208	416664,6	369174,3
13	Прочие расходы	209	59722,2	32016,2
14	Налог на прибыль	210	54189,5	33778,0
15	ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	2	144651,3	118216,6

Председатель Правления Н. А. Ермакова

И.о. главного бухгалтера М. Н. Кулевская

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 28.08.2008 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.

Каментарый аб парадку індэксацыі даходаў насельніцтва Беларусі за чэрвень

Грашовыя даходы, што атрымліваюцца з бюджэтных крыніц (заработная плата; грашовае забеспячэнне ваеннаслужачых тэрміновай службы, курсантаў ваенна-навучальных устаноў і суворавцаў; дзяржаўныя стыпендыі навучэнскай моладзі; заработная плата дзяржаўных служачых і прыраўнаваных да іх асобаў; грашовае забеспячэнне ваеннаслужачых і асобаў радавога і начальніцкага складу), за чэрвень 2009 года індэксуюцца на 5,4 працэнта. Як паведамілі ў Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны Беларусі, гэта абумоўлена тым, што індэкс спажывецкіх цэнаў за чэрвень 2009 года не перасягнуў пяціпрацэнтны парог да месяца папярэдняй індэксацыі (люты 2009 года).

Паколькі індэкс спажывецкіх цэнаў за чэрвень гэтага года не перасягнуў пяціпрацэнтны парог да месяца папярэдняй індэксацыі (студзень 2009 года) дапамогі і стыпендыі беспрацоўным у перыяд прафесійнай падрыхтоўкі, перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі па накіраванні органа па працы, занятасці і сацыяльнай абароне гарадскога, раённага выканаўчага камітэта індэксуюцца на 18 працэнтаў. Насельніцтву, якое атрымлівае даходы на тэрыторыі рэспублікі з іншых крыніц, кампенсацыя стратаў ад інфляцыі ажыццяўляецца па падставах, прадугледжаных калектыўнымі дагаворамі (пагадненнямі). Індэксацыя ажыццяўляецца па нарматыве, устаноўленым Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 28 студзеня 2006 года № 55 «Аб нарматыве індэксацыі грашовых даходаў насельніцтва з улікам інфляцыі». Індэксуецца даход у межах 100 працэнтаў зацверджанага бюджэту пражытачнага мінімуму, дзеючага на момант індэксацыі. Цяпер гэты нарматыў складае Br243 тыс. 570. Частка даходу, якая перасягае гэту суму, індэксацыі не падлягае.

Паколькі індэкс спажывецкіх цэнаў за чэрвень да студзеня гэтага года не перасягнуў пяціпрацэнтны парог, мінімальная заработная плата за чэрвень 2009 года не індэксуецца і складае па-ранейшаму Br229 тыс. 700.

БЕЛТА.

ВЫБРАЛІ ІМЯ ЦЯГНІКУ

«Белый аист» — такую назву атрымаў фірмавы цягнік Мінск — Кіеў.

На Беларускай чыгунцы падвялі вынікі акцыі «Дай імя цягніку!», падчас якой прапаноўвалася прыдумаць назву фірмаваму цягніку № 86/85 Мінск — Кіеў. Як паведаміў начальнік сэрвіснай службы БЧ Андрэй Кашко, з больш чым трох тысяч варыянтаў былі выбраны пяць, пасля чаго адбылося інтэрактыўнае галасаванне. У ім узялі ўдзел 13 867 рэспандэнтаў. Большасць галасоў было аддадзена назве «Белы бусел». За яе прагаласавалі 4626 рэспандэнтаў, або 33,4 % з агульнай колькасці.

Міхаіл МІХАЙЛАЎ, «Мінск—Навіны».

Твае правы

БІЗНЭС — ВАРЫЯНТ ДЛЯ... БЕСПРАЦОЎНЫХ

Не сакрэт, што нягледзячы на адсутнасць масавых скарачэнняў, рызыка застацца без працоўнага месца ў наш час усё ж застаецца. Аднак нават у горшай сітуацыі не трэба забываць адно: кропка — толькі пачатак новага, а сам па сабе факт звальнення — часам нагода для кардынальных змен. І ў прыватнасці, шанц... для адкрыцця ўласнай справы. Прычым варта заўважыць, што ў такой сітуацыі магчыма разлічваць на дапамогу дзяржавы. Дарэчы, паводле звестак Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, на працягу мінулага года такой падтрымкай скарысталіся 2695 грамадзян нашай краіны, і ў тым ліку 364 жыхары сельскай мясцовасці.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Ад кемпінгу да мэблі

Ці не галоўнае пытанне для тых, хто вырашыў адкрыць сваю невялікую справу, — чым уласна кажучы займацца? Безумоўна, прынцып «што магу і хачу» будзе галоўным, але не заўсёды вырашальным. Апроч усяго, выпадае арыентавацца на кан'юнктуру мясцовага рынку.

— Мы зрабілі аналіз сітуацыі ў сельскай мясцовасці і прыйшлі да высновы, што цяпер найбольш запатрабаванымі з'яўляюцца некалькі напрамкаў прадпрымальніцкай дзейнасці, — распавядае **старшы навуковы супрацоўнік Навукова-даследчага інстытута працы Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Эдуард СКАРАБАГАТЫ.** — Скажам, з пункту гледжання попыту такімі напрамкамі будуць арганізацыя рознічнага раз'язнога гандлю, выкананне апрацоўчых будаўнічых работ, стварэнне прыдарожных кемпінгаў, выраб і ўстаноўка платоў і агароджаў, вырошчванне грыбоў, свінагадоўля, фотаздымка, рамонт аўтамабіляў, мэблі, гадзіннікаў і абутку, перавозка пасажыраў мікрааўтобусамі. Прынамсі, гэты спіс актуальны для Беларусі ў цэлым. Аднак можна заўважыць: перад пачаткам сваёй справы таксама ніколі не лішне вывучыць становішча ў сваім канкрэтным рэгіёне.

Колькі ўзяць і колькі ўкласці?

Другое і не менш важнае пытанне — на што можа разлічваць новы прадпрымальнік? Даць адназначны адказ тут складана, многае залежыць ад віду дзейнасці. Так, практыка сведчыць: штомесячны даход тых, хто ў сельскай мясцовасці аддае перавагу фотаздымкам або рамонту гадзіннікаў, часам складае па 200—300 тысяч рублёў. Тады як вырошчванне грыбоў можа прыносіць па тры, а выраб і ўстаноўка жалезабетонных платоў і агароджаў — нават больш за пяць мільёнаў. Аднак з адной агаворкай: калі за справу бярэцца сапраўдны прафесіянал.

— Пры гэтым мы пралічылі, колькі грошай можа спатрэбіцца для пачатку прадпрымальніцкай дзейнасці, — працягвае Эдуард Скарабагаты. — Сумы атрымаліся рознымі. І калі той жа майстар па рамонце гадзіннікаў здольны ўкласціся ў 4-5 мільёнаў рублёў, то для аказання паслуг па рамонце аўтамабіляў можа спатрэбіцца 25—30, а для ўладкавання прыдарожнага кемпінга — і ўвогуле больш за 100 мільёнаў.

Крэдыт. Але не толькі

Добра, калі «стартавы капітал» ёсць на руках. Але такое — не правіла, а толькі рэдкае выключэнне. Абсалютнай большасці трэба шукаць грошы. Дзе?

— Адна з крыніц атрымання сродкаў для індывідуальных прадпрымальнікаў — крэдыты, — адзначае Эдуард Скарабагаты. — Паводле Указа «Аб некаторых мерах дзяржаўнай падтрымкі малога прадпрымальніцтва» ад 21 мая гэтага года, такія крэдыты выдзяляюцца па стаўцы рэфінансавання Нацбанка, а ў выпадку рэалізацыі асобных, сацыяльна значных праектаў, стаўка рэфінансавання можа змяншацца напалову. Прычым у такім выпадку грошы даюцца пад рухомую ці нерухомую маёмасць, або, як варыянт, пад гарантыі Беларускага фонду фінансавай падтрымкі прадпрымальніцтва.

Крэдытныя сродкі ў любым выпадку давядзецца вяртаць. Але ёсць яшчэ адзін варыянт дапамогі — бязвыплатны. Заканадаўства вызначае, што беспрацоўным, якія распачынаюць сваю справу, могуць выдзяляцца субсідыі — у памеры 15 бюджэтаў пражытковага мінімуму для вядзення бізнэсу ў сельскай мясцовасці і рэгіёнах з неспрыяльнай сітуацыяй на рынку працы і ў памеры 11 бюджэтаў пражытковага мінімуму для ўсіх астатніх населеных пунктаў. 1 БПМ на сёння — гэта крыху больш за 243 тысячы рублёў. Такім чынам, гаворка ідзе аб даволі адчувальных сумах.

— Напрыклад, субсідыю можна накіраваць на набыццё матэрыялаў ці абсталявання, — зазначае Эдуард Скарабагаты. — Трэба толькі мець на ўвазе: беспрацоўны, які атрымлівае субсідыю, павінен даць справаздачу аб яе выкарыстанні на працягу 3 месяцаў. Прычым справаздачу з пацвярджальнымі дакументамі — у адваротным выпадку грошы давядзецца вяртаць.

Рэгістрацыя і бізнэс-план

Варта паўтарыцца: прэтэндаваць на субсідыю могуць толькі асобы, якія афіцыйна зарэгістраваныя ў якасці беспрацоўных. І да таго ж пры наяўнасці эканамічнага абгрунтавання сваёй дзейнасці, так званага бізнэс-плана. У сваю чаргу бізнэс-план разглядаецца ў раённых упраўленнях па працы, занятасці і сацыяльнай абароне.

— Па сутнасці бізнэс-план можа мець адвольную форму, і пры яго складанні магчыма разлічваць на дапамогу спецыялістаў таго ж упраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне, — заўважае Эдуард Скарабагаты. — Аднак ёсць агульныя правілы: у бізнэс-плане трэба адлюстраваць «іскрынку» праекта — патлумачыць, чаму ён неабходны. І, апроч таго, неабходна вызначыць магчымыя затраты, крыніцы фінансавання, паказаць веданне рынку і будучай справы. А яшчэ — паведаміць аб сваёй адукацыі і спецыяльнасці. Прычым пры прыняцці канчатковага рашэння апошняе мае вельмі важнае значэнне.

Выйсце ёсць заўсёды

Адсутнасць «неабходнай» спецыяльнасці па выбраным напрамку заняткаў можа стаць падставай для адмовы ад субсідыі. І ўсё ж галоўнае ў іншым — без падрыхтоўкі цяжка разлічваць на паспяховы бізнэс. Тым больш што цяпер магчымасці найму работнікаў у індывідуальных прадпрымальнікаў вельмі абмежаваныя.

— Нават калі патрэбнай спецыяльнасці няма, выйсце застаецца — беспрацоўны мае права звярнуцца ў службу занятасці свайго раёна з просьбай накіраваць яго на прафесійнае навучанне ці перанавучанне, — падкрэслівае Эдуард Скарабагаты. — І, да слова, праз накіраванне той жа службы занятасці можна асвоіць асновы прадпрымальніцкай дзейнасці. Прычым адметна: гэтыя магчымасці будуць дадзены бясплатна.

Лічыць лепш загадзя

Форма справаздачнасці і ўліку ў індывідуальных прадпрымальнікаў сёння даволі простая. Не павінна ўзнікнуць праблем і з рэгістрацыяй — яна праводзіцца за 1 дзень. У рэшце рэшт, у дачыненні да ІП дзейнічае сістэма адзінага падатку. Праўда, усё ж трэба звярнуць увагу на адзін момант.

— Цяперашняе заканадаўства вызначае: калі 20-разовая велічыня адзінага падатку перавышае выручку, то з сумы гэтага перавышэння спаганяецца 10 % падатку, — нагадвае Эдуард Скарабагаты. — На падобную норму нельга забывацца і самага пачатку планавання свайго бізнэсу. Бо часам у выніку падаткі могуць вымярацца сотнямі тысяч ці мільёнамі рублёў. І, у прыватнасці, пры намеры займацца дзейнасцю, звязанай з атрыманнем вялікай выручкі — скажам, тым жа гандлем.

Сяргей ГРЫБ.

«ІНТАРЭСЫ НАРОДА— ВЫЗНАЧАЛЬНЫ ФАКТАР УДЗЕЛУ БЕЛАРУСІ Ў САЮЗАХ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, прыватызацыя ў рэспубліцы «не мае ніякага дачынення да крызісу». «Мы акцыянавалі свае прадпрыемствы, практычна ўсе, яшчэ да крызісу. Хочаце купіць — прыходзьце, купляйце, калі дагаворымся. Таму не думайце, што мы ў сувязі з крызісам гатовы камусьці там — еўрапейцам, амерыканцам, расіянам — аддаць усё, што папросяць. Так, як мы жорстка ставіліся да пытанняў прыватызацыі, так мы і ставімся. Але калі прыстойны інвестар прыходзіць... Дапусцім, у нас былі тэлекамунікацыйныя кампаніі «Бест», Velcom. Вельмі значная сфера, вельмі даходная, прыбытковая. Нам прапанавалі добрыя ўмовы. Мы прынялі рашэнне аб продажы гэтых кампаній і выйгралі. Калі б мы пасля пачатку крызісу гэта зрабілі, калі фондавы рынак упаў, гэта было б у два разы танней», — сказаў Прэзідэнт.

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, у Беларусі гэтыя працэсы не стрымліваліся. «Галоўнае, каб гэта было ў інтарэсах нашай дзяржавы і народа», — заявіў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка перакананы ў тым, што бізнэс павінен быць адказным за сацыяльныя праекты. «Мы заўсёды ставім шэраг умоў. Іх прыкладна 20-25. І той, хто гатовы выконваць гэтыя ўмовы (а яны не намі выдуманыя, гэтыя ўмовы, гэта і ў Аўстрыі ёсць, і ў Германіі) і плаціць нармальную цану, — калі ласка, прыходзьце», — дадаў Прэзідэнт.

Унутраных прычын для крызісных з'яў у эканоміцы Беларусі няма, заявіў Аляксандр Лукашэнка.

«У нас у мінулым годзе 110 працэнтаў склаў тэмп росту ВУП да 2007 года. Гэта да таго ўжо высокага ўзроўню, які ў нас быў. Мы ж даўно перасягнулі ўзровень савецкіх часоў. А ён у нас высокі быў. І калі б не вось гэтыя знешнія фактары, наша эканоміка развівалася б дынамічна і стабільна, нягледзячы нават на моцны рост цэнаў на энергарэсурсы. Мы вытрымлівалі гэта, таму што мадэрнізавалі эканоміку і займаліся гэтымі працэсамі», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Паводле яго ацэнкі, крызісныя з'явы ў Беларусі «маюць выключна знешнюю прычыну». «Я не магу назваць ні адной унутранай прычыны. Мы залежныя, як Германія і як Аўстрыя, ад экспарту, наша эканоміка экспартаарыентаваная, мы амаль 75 працэнтаў прадаём таго, што вырабляем. І калі попыт знізіўся на міжнародных рынках, там, дзе мы працавалі, зразумела, нам стала вельмі цяжка і складана. Калі б сёння крызіс скончыўся, мы першымі выйшлі б з яго», — перакананы Прэзідэнт.

Адказваючы на пытанне аб тым, што, на думку беларускага боку, будзе з праектам Саюзнай дзяржавы, Аляксандр Лукашэнка адзначыў: «Гэта наша мэта. Калі Расія гатова рухацца наперад па гэтым шляху — калі ласка. Гэты праект не пахаваны. Мы ведаем, як ісці, і ў нас няма ніякіх у гэтым плане праблем, калі Расія да гэтага гатова».

Як падкрэсліў Прэзідэнт, саюзы павінны будавацца на раўнапраўных пачатках і на адзінстве мэтаў. «Гэта класічная формула. Ніякіх саюзаў не можа быць пабудавана, калі няма мэтаў, калі няма раўнапраўя», — сказаў ён.

Адказваючы на пытанне аб тым, што для беларускага боку больш прыярытэтна, удзел у Мытным саюзе з Расіяй і Казахстанам або ў зоне свабоднага гандлю з Еўрапейскім саюзам, Аляксандр Лукашэнка адзначыў: «Для нас прыярытэт тое, што раней мы зможам рэалізаваць. Калі Мытны саюз з 2010 года рэальна пачне дзейнічаць, гэта і будзе нашым прыярытэтам. Наша эканоміка адкрытая, таму нам чакаць няма чаго. Будзе зона свабоднага гандлю ў Беларусі, Украіны з Еўрапейскім саюзам або не, мы яшчэ гэтага не ведаем. Гэта пакуль размовы. Было б вельмі добра. І калі мы ўступім у Мытны саюз, мы і ў СГА (калі мы створым Мытны саюз з казахамі і расіянамі, нам гэта будзе выгадна, калі атрымаецца) будзем разам рухацца».

Прэзідэнт лічыць выгадным стварэнне зоны свабоднага гандлю з Еўрапейскім саюзам. «Гэта будзе проста здорава. Ну што дрэннага ў тым, што пад больш як 170 млн насельніцтва (на тэрыторыі краін Мытнага саюза), вялізны патэнцыял і тэхналагічная Еўропа аб'яднаюцца? У гэтым дрэннага нічога не будзе», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Адказваючы на пытанне аб тым, што пасля павелічэння сумы крэдыту ад МВФ у расійскіх СМІ з'явіліся загалоўкі «Захад купляе Беларусь», кіраўнік дзяржавы падкрэсліў: «Беларусь не прадаецца. На тое я і Прэзідэнт. І той, хто мяне ведае, ён проста пасмяецца над такой інфармацыяй, якая выходзіць у Маскве. Напэўна, іх гэта вельмі хвалюе. Я вам ужо гаварыў, што Расія не ведае, што тут адбываецца. Іх гэта не цікавіць, яны займаюцца сваімі праблемамі. Вось недзе нешта пачулі і адразу: «Ага, Міжнародны валютны фонд даў крэдыт Беларусі...». Ну дык і дзякуй МВФ. Ён, дарэчы, прапанаваў крэдыт на больш выгадных умовах, чым Расія. Дык што, мы ад гэтага адмовіцца павінны?»

Паводле слоў Прэзідэнта, такое рашэнне МВФ стала нечаканым для расійскага боку: «У Расіі гэтага не чакалі. Думалі, што калі яны не дадуць, то ніхто нам не дапаможа, і мы тут загінем, абвалімся. Ведаеце, нават калі ніхто і не даў бы гэтых крэдытаў, не абвалілася б наша эканоміка, выжылі б, не з такой сітуацыі выходзілі. Але, калі нам дапамагаюць людзі, чаму мы ад гэтага павінны адмаўляцца? І чаму раптам у Расіі гэта так, як вы гаворыце, успрымаецца? Мне гэта не зразумела. Яны ж карысталіся крэдытамі МВФ. І цяпер заяўкі падаюць. На будучы год дэфіцыт, гавораць, бюджэту будзе вялікі. Яны не супраць пазычыць дзе-небудзь грашовыя сродкі. Чаму нам гэта забаронена?»

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што «Расія, паабяцаўшы $2 млрд крэдыту, сваё абяцанне не выканала». «Гэта не забываецца. Трэба быць абавязковым. Не можаш — скажы: «Не магу з-за такіх прычын». Можаш (ведаю, што могуць), дамовіліся — трэба свята выконваць свае абяцанні», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Пры гэтым ён дадаў, што як Прэзідэнт будзе «доўга памятаць дапамогу Міжнароднага валютнага фонду, Захаду, нашай дзяржаве». «І буду пераконваць свой народ, каб яны гэта ацанілі як належыць», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Аляксандр Лукашэнка лічыць, што няма нічога трагічнага ў адносінах паміж Беларуссю і Расіяй.

«Скажу адкрыта: не ў сферы аб'ектыўнага ляжаць нашы супярэчнасці. Гэта выключна, як многія ў Расіі сёння ўжо гавораць, суб'ектыўнае пытанне. І яно звязана з палітыкай і пазіцыяй расійскага кіраўніцтва. Вось у чым суб'ектывізм», — растлумачыў беларускі лідар.

Гаворачы ў цэлым аб узаемаадносінах з Расіяй, Аляксандр Лукашэнка адзначыў: «У нас узровень адносінаў нармальны. Ну, былі гэтыя «малочныя» войны. Цяпер гэтага няма. Мы хутка гэта выправілі. Таму што ў нас добрыя рычагі і добрыя каналы супрацоўніцтва. Адыдзі ўбок — і жыццё само ўсё выправіць. Таму ў нас няма чагосьці трагічнага ў нашых адносінах. Абсалютна няма. Мы можам на працягу аднаго месяца, ну, да канца гэтага года вырашыць усе праблемы. І нават тыя праблемы, якія мы не вырашалі, але яны для нас стратэгічныя».

Адказваючы на пытанне аб тым, з кім на цяперашні момант адносіны лепшыя — з Расіяй або з Еўрасаюзам, Прэзідэнт заўважыў: «Ведаеце, і там нялёгка, і там. Але ж з Расіяй мы прайшлі пэўны шлях. І потым, у нас жа база адносінаў вельмі значная. У эканоміцы ў нас вельмі сур'ёзная кааперацыя. Амаль 10 млн чалавек працуюць у Расіі на прадпрыемствах, якія пастаўляюць нам камплектуючыя. Гэта значыць мы ім дзесьці даём работу. А тут у нас фінішная высокатэхналагічная вытворчасць. Таму мы вельмі далёка рушылі наперад з Расіяй па ўсіх напрамках. Я ўжо не кажу аб тым, што мы адзін народ!».

Беларусі вельмі выгадны ўдзел ва «Усходнім партнёрстве», заявіў кіраўнік дзяржавы.

«Еўрапейцы прапануюць нам вельмі выгаднае супрацоўніцтва. Амаль палова нашага тавараабароту — у Еўрапейскім саюзе. У нас пад бокам у Еўрапейскім саюзе вельмі тэхналагічная эканоміка. І нам ёсць да чаго імкнуцца, ёсць добры прыклад. Мы з імі супрацоўнічаем, гэта выгадна для нашых людзей. Там крэдытныя рэсурсы, якімі мы ўсё ў большай і большай ступені пачынаем карыстацца. І ў цэлым, гэта ж нашы суседзі», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Адказваючы на пытанне аб тым, хто з блокаў або буйных краін, што суседнічаюць з Беларуссю, больш адэкватна паводзіць сябе ў адносінах да рэспублікі, Аляксандр Лукашэнка заўважыў: «Жыццё нельга маляваць аднымі фарбамі — чорнымі, белымі або яшчэ неякімі. Бывае, што па нейкім пытанні мы з Расійскай Федэрацыяй займаем адназначна адзіную пазіцыю. З Еўрапейскім саюзам апошнім часам вырысоўваецца вельмі шмат пытанняў, па якіх мы павінны супрацоўнічаць. Пры гэтым Расія часам, можа з-за таго, што не атрымлівае дастаткова інфармацыі (можа мы і самі ў гэтым вінаватыя, трэба ўсё ж такі з саюзнікам супрацоўнічаць так, каб не было нейкіх непаразуменняў, недагаворванняў), вельмі балюча ўспрымае, у нас часам з'яўляецца недастатковае разуменне гэтых працэсаў».

У якасці прыкладу Аляксандр Лукашэнка прывёў вострую рэакцыю Расійскай Федэрацыі на «Усходняе партнёрства». «Хоць мы не аднойчы гаварылі аб тым, што «Усходняе партнёрства» для нас — гэта не дружба супраць Расіі. Нам Расію ніхто не заменіць, і аб гэтым мы адкрыта гаворым. Нават Еўропе Расію ніхто не заменіць у пэўнай ступені. ЕС больш свабодны ў гэтым плане: у яго больш аргументаў, каб размаўляць з Расійскай Федэрацыяй аб супрацоўніцтве. Але, тым не менш, энергарэсурсы — аснова эканомікі — адтуль, з Расійскай Федэрацыі.

Сярод складаных момантаў ва ўзаемаадносінах з ЕС Аляксандр Лукашэнка адзначыў візавыя праблемы і дарагоўлю візаў для беларусаў. «Каму гэта выгадна? Прычым, напалову кошт вышэйшы, чым для ўкраінцаў і расіян. І самі еўрапейцы кажуць: «Гэта ненармальна». Адносна гэтага сёння ідзе работа», — сказаў Прэзідэнт.

«Такім чынам, па-рознаму бывае. Недзе Еўрапейскі саюз прапануе лепшыя напрамкі супрацоўніцтва, недзе Расійская Федэрацыя. Недзе Расія пачынае нас падціскаць, як я ўжо сказаў, не разумеючы некаторых працэсаў, недзе Еўрапейскі саюз пачынае дыктаваць, калі можна так сказаць, пэўныя ўмовы нам. Можа яны недзе і маюць рацыю. У іх ёсць пэўныя інтарэсы — як у аднаго, так і ў другога бакоў. Але пры гэтым трэба мець на ўвазе, што ў Беларусі, на гэтай тэрыторыі, перш за ўсё інтарэсы беларусаў жыццёва важныя і іх трэба захоўваць», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

«Галоўнае — мы не сябруем тут супраць кагосьці. Вось некаторыя крытыкуюць: «Лукашэнка павярнуўся на Захад». Калі на Усходзе ў нас выбудаваны адносіны, яны зразумелыя, то на еўрапейскім напрамку, зыходзячы са шматвектарнасці нашай палітыкі, у нас не ўсё было ў парадку. І не мы ў тым вінаватыя. Апошнім часам Еўрапейскі саюз працягвае нам руку, прапануе нам супрацоўніцтва. Чаму мы павінны адмаўляцца? Адзін з фактараў — гэта «Усходняе партнёрства». Але калі нехта лічыць, што мы хочам там атрымаць нейкія ад гэтага дывідэнды, грошы атрымаць, — гэта глупства. Нам не грошы патрэбны, нам трэба адкрытае і раўнапраўнае супрацоўніцтва. Каб нашы тавары не блакіраваліся па шляху ў Еўрапейскі саюз. Мы гатовы адэкватна адказваць», — дадаў Прэзідэнт.

Выстаўленне ўмоў перашкаджае руху наперад ва ўзаемаадносінах Беларусі і Еўрасаюза, перакананы Аляксандр Лукашэнка.

«Трэба давяраць адно аднаму — гэта першае. Другое, не трэба ставіць дадатковых нейкіх умоў: мы з вамі вось гэта, калі вы вось гэта. Гэта запавольвае наш рух наперад. Трэба шукаць агульныя падыходы, выпрацоўваючы парадак дня адносінаў. А парадак дня выпрацаваны ўжо жыццём. Наркатрафік, гандаль людзьмі, адзіныя транспартныя, энергетычныя праблемы і гэтак далей. Вялікая колькасць пытанняў. Яны важныя і для Еўропы, і для нас. Давайце садзіцца за стол перагаворыў і весці дыялог. І калі ў працэсе гэтага ўзнікнуць якія-небудзь палітычныя, дыпламатычныя і іншыя пытанні, іх будзем вырашаць паралельна», — лічыць Аляксандр Лукашэнка.

«Трэба бачыць галоўнае ў нашых адносінах. А галоўнае — гэта не ставіць умовы накшталт: «Вы там дэмакратызуйце краіну». Раскажыце, як дэмакратызаваць? Дзе той стандарт? Можа ў Аўстрыі, можа ў Германіі, яшчэ дзесьці? Для кожнай краіны свой стандарт. І мы настолькі, у вашым разуменні, будзем дэмакратызавацца, наколькі гэта ў інтарэсах нашага народа. Гэта па-першае. Па-другое, я не бачу вялікай розніцы паміж дэмакратыяй у Беларусі і Еўропе. Ды ў нас людзі жывуць больш спакойна, чым у іншай еўрапейскай краіне», — дадаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, амерыканцы і еўрапейцы часта дэманструюць недасведчанасць у многіх аспектах рэальнага жыцця ў Беларусі. «Няўжо так цяжка ўдакладніць, як жа сапраўды ў Беларусі ідуць справы? Мы не забараняем ніякіх дэманстрацый, абсалютна. Але гэта ж зразумела, калі, напрыклад, у Аўстрыі, ва ўрад прыходзяць заяўкі на правядзенне дэманстрацыі (і гэта датычыцца інтарэсаў мноства іншых людзей), там, напэўна, вызначаюць маршрут для дэманстрантаў, выпрацоўваюць умовы. Прынамсі, людзі, якія выйшлі на дэманстрацыю, не павінны перашкаджаць іншым. Таму выпрацоўваецца маршрут, дамаўляемся: вось, калі ласка, парк (як у Лондане — Гайд-парк). Ідзіце туды і мітынгуйце. Вам ніхто не перашкаджае. Не, кажуць, што мы тут, у Беларусі, душым, цкуём, у турму ўсіх саджаем, хто выйдзе на вуліцы. Гэта лухта, гэтага няма ў Беларусі», — сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка згодны з тым, што на парадку дня абмеркавання з Захадам можа стаяць любое пытанне. «Але толькі для таго, каб на яго адказаць, трэба мець аб'ектыўную інфармацыю. І я да гэтага заклікаю: прыязджайце, вывучайце сітуацыю і давайце аб'ектыўную інфармацыю для таго, каб рабіць вывады. Вось што галоўнае, а не з падачы апазіцыі нейкія праблемы пералічваць і потым прад'яўляць уладам», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка лічыць разумнымі ўмовы, якія прапануюцца Беларусі з боку Міжнароднага валютнага фонду. Сярод умоў МВФ выданне прыгадала аслабленне націску на бізнэс, неабходнасць стварыць Агенцтва па прыватызацыі, рух у бок адкрыцця эканомікі або лібералізацыі эканомікі.

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, ён нармальна ставіцца да гэтых прапаноў. «Усё гэта было ў Беларусі. Так, можа, еўрапейцы хочуць, каб у нас быў працэс прыватызацыі, як у Расіі. Ведаеце, усё адразу і агулам. Мы не пайшлі гэтым шляхам. Бо што потым? Дзяліць, страляць і іншае? Мы пайшлі шляхам кропкавай прыватызацыі. Вы — інвестар, у вас ёсць грошы, вы хочаце ў нас купіць нейкую долю нейкага прадпрыемства або прадпрыемства цалкам. Прыходзьце, будзем весці перагаворы», — сказаў беларускі лідар.

«Усе ўмовы разумныя. І чаму мы хутка дамовіліся? Таму што ў нас гэты працэс ужо ідзе. І калі МВФ хацеў бы, каб мы органы, якія займаюцца прыватызацыяй (а такія ж ёсць, можа, яны крыху разрозненыя былі), аб'ядналі ў агенцтва — ніякіх праблем. Можа, гэта нават і лепш, што будзе пэўны цэнтр, куды будзе збірацца ўся інфармацыя. І гэты цэнтр будзе вам падказваць: якія прадпрыемствы для прыватызацыі, іх цана, якія перагаворы, якія ўмовы прыватызацыі. Што тут дрэннага? Мы збяром гэта ў адзіны цэнтр. Ну што тут такога асабліва ад нас запатрабаваў МВФ?» — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Гаворачы, у прыватнасці, аб прапанове знізіць націск на дзеля вых колы, Прэзідэнт заўважыў: «У любой краіне ёсць пэўныя патрабаванні да бізнэсу, але ў нас яны не празмерныя і не большыя, чым у Аўстрыі або ў Германіі»...

Інтарэсы народа з'яўляюцца вызначальным фактарам удзелу Беларусі ў саюзах, лічыць кіраўнік дзяржавы.

«Мы не можам не захаваць інтарэсы нашай дзяржавы і нашага народа. І калі мы будзем долю, частку сваіх правоў і суверэнітэту аддаваць нейкім саюзным органам, то мы павінны разумець і выходзіць з таго, што гэта не прынясе пагаршэння ў параўнанні з цяперашнім станам у эканоміцы, у сацыяльна-палітычным жыцці дзяржавы, што гэта будзе паляпшэнне. У адваротным выпадку, у імя чаго мы гэтыя тады саюзы ствараем? — адзначыў беларускі лідар. — Мы павінны дакладна бачыць нашы інтарэсы. Уступаючы ў саюз і перадаючы частку сваіх паўнамоцтваў наднацыянальным органам, мы павінны разумець, што гэта на карысць нашаму народу і нашай дзяржаве».

Прэзідэнт звярнуў увагу на тое, што любы саюз краін павінен быць раўнапраўным. «Калі мы ахвяруем нейкай доляй суверэнітэту, то і іншыя дзяржавы павінны адмовіцца ад пэўнай часткі, дакладна такой ж часткі свайго суверэнітэту. Гэта таксама вельмі важна. Гэта ўсё вызначае мяжу і тую ступень, да якой мы можам рухацца ў гэтым напрамку», — растлумачыў кіраўнік дзяржавы.

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, для беларусаў «суверэнітэт і незалежнасць — рэчы непарыўныя».

Уплыў Расіі на постсавецкай прасторы змяншаецца, лічыць Прэзідэнт Беларусі.

«Змяншаецца. Ёсць Кітай, які сёння мае другую эканоміку ў свеце, а заўтра будзе мець першую. У іх дэфіцыт энергарэсурсаў. Дзе энергарэсурсы? У суседніх дзяржаў. Казахстан, Туркменістан, Азербайджан. І ўсе яны праклалі ўжо туды трубу. Усе пастаўляюць Кітаю, а ў перспектыве — у Індыю, Пакістан, Афганістан. Усё гэта ўжо там задзейнічана. І гэта адыход ад расійскай залежнасці ў энергапастаўках. І на еўрапейскім напрамку ў тым ліку», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Адказваючы на пытанне, ці шкадуе Беларусь аб такім змяншэнні ўплыву Расіі, Прэзідэнт заўважыў: «Няхай шкадуе Расія аб гэтым. Я шкадую ў тым плане, што мы не змаглі тут аб'яднацца пасля распаду Савецкага Саюза. Усё-такі гэта пад трыста мільёнаў насельніцтва. Мы маглі б мець добры рынак. І гэта можна было зрабіць. Амбіцыі перашкаджаюць некаторым».

Беларусь з'яўляецца надзейным партнёрам любому пастаўшчыку энергарэсурсаў. Гэты факт асабліва адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Падчас гутаркі выданне цікавілася думкай беларускага лідара адносна будаўніцтва БТС-2 і газаправода Nord Stream і магчымых стратаў у сувязі з гэтым з боку Беларусі. «Дарэчы, страцім, перш за ўсё, не мы — страціце вы. Вы будзеце плаціць больш, таму што гэта вялікі круг дастаўкі. Гэта на тоне нафты, напрыклад, да 5—10 долараў страты — так эксперты ацэньваюць. Плаціце, калі вас гэта задавольвае. Гэта, па-першае», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

«Па-другое, давайце пачакаем у сувязі з усімі гэтымі абходамі, пераходамі. І паглядзім, як гэта яшчэ будзе функцыянаваць, асабліва на Балтыцы»...

Пры гэтым ён нагадаў, што нармальны маршрут для транспарціроўкі ўжо існуе. «Ёсць, дапусцім, траса газаправода «Ямал — Еўропа». І пад другую трасу створана ўся інфраструктура. Калі ласка, кладзі трубу, пампуй газ. Хто перашкаджае? Дагаворвацца трэба і пампаваць. Трэба захоўваць інтарэсы і транзітных дзяржаў. Што датычыцца Беларусі, то мы абсалютна надзейны ў гэтым плане саюзнік любому пастаўшчыку. І транзіт у нас больш танны», — дадаў кіраўнік дзяржавы.

Паводле паведамленняў прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і БЕЛТА.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

УЛАДЫ КРЫМА ЗРАБІЛІ ЎСЕ ПЛЯЖЫ БЯСПЛАТНЫМІ

Савет міністраў Крыма пастанавіў з 11 ліпеня зрабіць усе размешчаныя на тэрыторыі аўтаномнай рэспублікі камунальныя пляжы бясплатнымі. Такое рашэнне было прынята па ўказанні спікера крымскага парламента Анатоля Грыцэнкі, які выказаў незадаволенасць тым, што за ўваход на пляж патрабуюць самавольна вызначаную плату.

Рашэнне Савета міністраў датычыцца не толькі пляжаў, але і прыродных запаведнікаў і месцаў масавага адпачынку. Грыцэнка падкрэсліў, што рашэнні Савета міністраў абавязковыя для выканання ўсімі арганізацыямі на тэрыторыі аўтаномнай рэспублікі.

УКРАІНА ПАВЫСІЦЬ КОШТ ГАЗУ ДЛЯ НАСЕЛЬНІЦТВА ДЗЕЛЯ КРЭДЫТУ МВФ

Украіна паабяцала Міжнароднаму валютнаму фонду павысіць кошт газу для насельніцтва. За наступны год тарыфы могуць вырасці ўдвая. Аб гэтым піша газета «Камерсант — Украіна».

У чэрвені прэм'ер-міністр Украіны Юлія Цімашэнка заяўляла, што кошт на газ да канца года змяняцца не будзе. Апошні раз кошт газу для насельніцтва Украіны павышаўся ў снежні 2008 года — на 35 працэнтаў. У «Нафтагазе» адзначылі, што лічаць неабходным рост кошту на газ на 30 працэнтаў.

Рашэ

«Міла! Цудоўна! Фантастычна!»

Лэдзі Рэйні Спэнсэр, прадстаўніца Каралеўскай сям'і Вялікабрытаніі, знаходзіцца ў гэтыя дні з візітам у Беларусі. Карэспандэнт «Звязды» прагуляўся ўчора з высокай госцяй па Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі.

Графіня Спэнсэр параўнала нашую Нацыянальную бібліятэку з казачным караблём.

Лэдзі Рэйні Спэнсэр прыляцела ў Беларусь з гуманітарнай мэтай — высветліць, якая трэба дапамога Рэспубліканскаму анкалагічнаму цэнтру і Дзіцячаму хоспісу ў Бараўлянах. Высокая госця апякуецца таксама інвалідамі, таму хоча пільна вывучыць, якія створаныя ўмовы ў Беларусі для людзей з абмежаванымі магчымасцямі. Разам з лэдзі Спэнсэр прыляцелі два бізнэсоўцы — адзін з кіраўнікоў групы кампаніяў «Хэрардз» Радж Асананд і кіраўнік кампаніі «Хэрардз Істэйтс» Марк Колінз. Рэч у тым, што «Хэрардз» — найбуйнейшыя ўнівермагі Брытаніі, якія лічацца ці не найлепшымі ў свеце. Брытанцы прыляцелі азнаёміцца з беларускімі прадуктамі, каб ацаніць магчымасці іх пастаўкі на прылаўкі «Хэрардзу». Папярэдні прыцэл — на беларускую мэблю, гарэлку і лён.

А пакалькі лэдзі Спэнсэр да ўсяго яшчэ і дачка славутай пісьменніцы Барбары Картлэнд, абмінуць Нацыянальную бібліятэку высокая госця проста не магла.

— Божа, як жа яна цудоўна і вытанчана апранута! — усклікнулі супрацоўніцы Нацыянальнай бібліятэкі, калі графіня Спэнсэр у чырвоным плашчыку, белых пальчатках і арыстакратычнай шляпцы з'явілася на парозе бібліятэкі.

— Вандэфул! Б'ютэфул! Найс! — усклікнула лэдзі Рэйні Спэнсэр, агледзеўшы наш Дыямент Ведаў. — Сюды, напэўна, змясцілася дужа шмат кніг!

— Дзевяць мільёнаў! — адказвае высокай госці намесніца дырэктара бібліятэкі Людміла Кірухіна. — Каб не вайна, было б яшчэ больш — у часы Другой сусветнай была страчаная значная частка нашых фондаў...

— Трэба сказаць, вам цудоўна ўдалося аднавіцца, — заўважае лэдзі Спэнсэр. — Вой, а што гэта за прылада?..

Госця пабачыла апарат для падачы кнігаў са сховішча да чытачоў. Своеасаблівы гонар Нацыяналкі — любая кніга трапляе да чытача за 20 хвілін!..

— Фантастыка! — захапляецца лэдзі Спэнсэр. — Я падобныя прылады бачыла толькі ў аэрапортах і гандлёвых цэнтрах!..

Гасцей вядуць па бібліятэцы. Графіня жыва цікавіцца ўсім наўкол.

— Вось гэта фрэска з выявай Гродзенскай вобласці, — тлумачыць Людміла Генадзеўна. — Гэта нашыя пісьменнікі, а вось гэта — Каложская царква XII стагоддзя.

— Які цудоўны храм! Добра было б пабачыць яго ўжывую!

У свае 79 гадоў лэдзі Спэнсэр захавала надзвычайную яшчэ энергію і абаянне. І здаецца, што яна яшчэ вернецца ў Беларусь — графіні падабаецца!..

— А ў вас шмат пісьменнікаў? — пытаецца дачка Барбары Картленд.

— Вядома! — адказвае Людміла Кірухіна. — Нашыя пісьменнікі ствараюць цудоўныя раманы, аповесці, дэтэктывы. Беларуская паэзія — найцудоўнейшая!.. Таксама ў нас надзвычай моцная гістарычная літаратура...

— Вядома, у краіне з такой гісторыяй гэта натуральная рэч!.. — падхоплівае графіня. — А ці шмат у вас бывае моладзі?

— Так, сем з дзесяці наведнікаў — гэта маладыя людзі! У нас утульныя чытальныя залы, абсталяваныя камп'ютарамі з інтэрнэтам.

— Гэта проста цудоўна, што ваша моладзь імкнецца да адукацыі. Веды — гэта іх будучыня.

Лэдзі глядзіць карціны і габелены на сценах. На адным з палотнаў — выява заснежанага Мінска.

— Ну вось, я ўсё-такі пабачыла Мінск узімку! — жартуе графіня. Асабліваю яе цікавасць выклікае серыя габеленаў і барэльефаў, прысвечаная нашым нацыянальным традыцыям. Перакладчыца Таццяна тлумачыць графіні Спэнсэр сэнс абрадаў Гукання Вясны, Купалля. І графіня прыходзіць у захапленне:

— Беларусь — найцікавейшая краіна, калі ў вас ёсць такія старадаўнія, непаўторныя традыцыі! Вельмі шкада, што пра Беларусь так мала вядома ў свеце. Я буду ўсім распавядаць пра гэтую паездку!..

Наступны пункт — Музей кнігі, дзе можна пабачыць 500-гадовыя старадрукі, абразы і карты. Усё гэта выклікае вялікую цікавасць лэдзі Спэнсэр. Гасцям дэманструюць аўтограф Марка Шагала.

— А што, Марк Шагал бываў тут? — шэптам па-англійску пытаецца ў карэспандэнта «Звязды» Радж Асананд.

— Марк Шагал тут нарадзіўся, — шэптам адказваю я па-англійску Раджу Асананду. — Прыкладна 200 кіламетраў ад Мінска.

— Нішто сабе!.. І ў вас ёсць музей Марка Шагала?! — яшчэ больш здзіўляецца брытанец.

— Так, — кажу я, — і нават Арт-цэнтр Шагала ў Віцебску.

Спадар Асананд пераказвае наш дыялог графіні і свайму калегу, і тыя прыходзяць у захапленне, бо Марк Шагал — адзін з іх улюбёных мастакоў!..

Апошні пункт экскурсіі па бібліятэцы — аглядная пляцоўка на 22-м паверсе. Праз дождж на адкрытую ісці няма як, але з закрытай від таксама цудоўны.

— Вандэфул! — ахае графіня па выхадзе з панарамнага ліфта. — Які ў вас прыгожы парк пры бібліятэцы!..

Здаецца, што высокую госцю ўражвае ўсё. І цырк-шапіто — «вандэфул» («цудоўны»), і нават аўтавакзал — «вандэфул».

— Адсюль, зверху, ваш горад чымсьці нагадвае мне Лондан!.. — кажа графіня Рэйні Спэнсэр. — Як хораша, што я прыехала ў Беларусь — я і не ўяўляла, якая гэта цудоўная краіна!..

Глеб ЛАБАДЗЕНКА.
Фота Уладзіслава НЯКРАСАВА.

ДАВЕДКА «ЗВЯЗДЫ»

Візіт вяльможнай графіні **Рэйні Спэнсэр** стаў магчымым дзякуючы беларускаму інвестыцыйнаму форуму, які адбыўся ў Лондане ў 2008 годзе. Тады нашая дэлегацыя блізка пазнаёмілася з Махамедам аль-Фаедам, уладальнікам групы кампаній «Хэрардз». Менавіта на форуме прэм'ер Сяргей Сідорскі запрасіў лэдзі Спэнсэр наведаць Беларусь. Непасрэднай арганізацыяй візіту займаўся амбасадар Беларусі ў Злучаным Каралеўстве Вялікай Брытаніі і Паўночнай Ірландыі Андрэй Міхневіч. У час візіту графіню суправаджала жонка спадара Міхневіча спадарыня Таццяна.

Група «Хэрардз», якую прадстаўляюць брытанскія бізнэсоўцы, аб'ядноўвае шэраг кампаній у розных галінах бізнэсу. Сюды ўваходзіць і найвялікшы ў свеце гандлёвы цэнтр «Хэрардз» — 90 тысяч квадратных метраў, больш за 330 крамаў пад адным дахам. Адметна, што гандлёвы цэнтр у турыстычным рэйтынгу Брытаніі займае трэцяе месца пасля Парламента і Біг Бэна, і па колькасці наведванняў турыстамі апярэджвае нават Букінгемскі палац!.. Групай кампаній «Хэрардз» з 1985 года валодае Махамед аль-Фаед, бацька Додзі аль-Фаеда, сябра прынцэсы Дыяны, з якім яны разам загінулі ў аўтакатастрофе ў Парыжы 31 жніўня 1997 года. Апроч бізнэсу, спадар Махамед аль-Фаед займаецца і дабрачыннасцю. Якраз у гэтым яму і дапамагае графіня Рэйні Спэнсэр.

Жыллё маё

КУПІЦЬ ПАКОЙ? КАЛІ ЛАСКА!

Набыццё пакоя ў сталіцы застаецца ледзь не адзіным спосабам для тых, хто хоча замацавацца ў Мінску: каштуе ён танней, чым кватэра, да ўсяго ў гэтай, ужо асабістай уласнасці, можна зарэгістравацца і адчуваць сябе сапраўдным мінчанінам. Няхай пакой і маленькі, разам з суседзямі, затое свой! Прыкладна так разважаюць людзі, якія мараць пра сталічнае жыллё. Цяпер самы час ажыццяўляць мары: цэны на пакоі, як і на кватэры, зніжаюцца. Розніца паміж коштам на пакой і на самую танную «аднапакаёўку» складае ад 15 тыс. долараў.

Фота Пятра ФАМІНА.

— Нерухомасць са студзеня патаннела, і вельмі, — кажа **дырэктар агенцтва нерухомасці «Твая сталіца» Людміла КРАСОЎСКАЯ**. — Калі ў пачатку года пакой у Мінску можна было купіць у сярэднім за 29—33 тыс. долараў ЗША, то сёння такая пакупка абыходзіцца прыкладна ў 22—24 тысячы. Напрыклад, у чатырохпакаёвай кватэры прадаецца пакой 14 метраў, гаспадары просяць 19 тысяч, у двухпакаёвай хрушчоўцы пакой 17 метраў — 21 тысяча, у двухпакаёвай, больш сучаснай кватэры, пакой 14 метраў — 22 тысячы, але ўсе ўладальнікі не супраць і крыху знізіць цану. Самы танны пакой каштуе цяпер 15—17 тысяч. Што тут казаць, калі аднапакаёвую кватэру можна знайсці за 35 тысяч долараў, а да новага года яна каштавала 60.

У цэлым пакояў на рынку няшмат. У агульным аб'ёме продажаў кватэр у сталіцы здзелкі з пакоямі займаюць прыкладна 10—15 працэнтаў. Раней іх купляли часцей, бо розніца ў кошце пакоя і кватэры была даволі вялікая. Сёння на рынку шмат танных «аднушак», якія і бяруць больш ахвотна.

Пакоі, у асноўным, набываюць іншагароднія студэнты, былыя муж-жонка, якія пасля скасавання шлюбу мараць раз'ехацца, маладыя, якія яшчэ не паспелі накапіць грошы на асобную кватэру, а жыць з бацькамі не хочуць.

Што датычыцца арэнды пакояў, то іх праз агенцтва здымаюць не часта, ды і прапаноў няшмат (напэўна, гаспадары шукаюць сабе кватарантаў самастойна, не прыбягаючы да паслуг агенцтваў). Зразумела, што зняць пакой танней, чым кватэру. Гэта каштуе прыкладна 70—80 долараў ЗША ў месяц плюс 50 працэнтаў камунальных плацяжоў (цана можа мяняцца ў залежнасці ад месца знаходжання кватэры).

Праўда, у апошні час арэндная плата і на кватэры знізілася. Зараз «аднушку» можна знайсці за 150 долараў. Але найбольшы абвал цэнаў — на арэнду трохпакаёвых кватэр. Той, хто марыць жыць менавіта ў такой, можа зняць яе і за 280 долараў. Бяруць «трохпакаёўкі» на траіх часта студэнты. Калі падзяліць кошт арэнднай платы, атрымліваецца прыкладна такая ж цана, якую гаспадары просяць за пакой. Розніца толькі ў тым, што жыць у такой кватэры будуць знаёмыя людзі.

— Прыкладна праз месяц чакаецца бум і на набыццё кватэр, і на іх арэнду, — прагназуе Людміла Васільеўна. — Былыя школьнікі стануць студэнтамі і іншагароднія будуць шукаць жыллё ў сталіцы. Некаторым бацькі купяць кватэру, пакой, каб дзіця не пакутавала на здымных. Таму тым, хто хоча абзавесціся ўласным жыллём, самы час паспяшацца: магчыма, хутка такога выбару, як цяпер, ужо не будзе. Гэтая тэндэнцыя назіраецца амаль кожны год: у канцы лета заўсёды разбіраюць малагабарытныя кватэры. І здымаюць у гэты час часцей «аднапакаёўкі», таму можа і арэнднае плата падняцца.

Але, бадай, самае галоўнае пры набыцці пакоя — каб чалавек цвёрда разумеў, што купляе ён не асобнае жыллё, а хоць і ўласную маёмасць, усё ж з суседзямі. Таму будзе не лішнім правесці бытавую экспертызу: з кім давядзецца жыць побач.

Мае знаёмыя, калі куплялі пакой у «двушцы», на жаль, такую экспертызу не правялі. Жыць там яны не збіраліся, хацелі толькі прапісацца (тады яшчэ не было рэгістрацыі), здаваць свой пакой і здымаць асобную кватэру. Праблемы пачаліся адразу пасля набыцця ўласнасці. Гаспадар другога пакоя чамусьці лічыў кватэру толькі сваёй асабістай, здаваў яе (сам жыў з сужыцелькай у яе доме) і нікога ў кватэру не пускаў. Новыя гаспадары пасля пакупкі не маглі патрапіць туды нават з міліцыяй, бо набылі яны не канкрэтны пакой, а 1/2 кватэры. Участковы міліцыянер толькі паціскаў плячыма, маўляў, пакой у карыстанне не вылучаны, толькі пасля адпаведнай працэдуры можна патрапіць у кватэру. (Затое другі гаспадар меў права здаваць усю кватэру і атрымліваць за гэта грошы.) Новы ўладальнік нават не мог прапісаць сваю жонку, бо другі гаспадар на гэта дазволу не даваў. Муж быў вымушаны падарыць сваёй жонцы 1/4 кватэры, каб яна, як уласнік, магла прапісацца.

Толькі пасля звяртання ў суд маладая пара зайшла ў сваю кватэру. Быў вызначаны парадак карыстання пакоямі, згодна з якім новыя гаспадары і іх сын атрымалі магчымасць карыстацца большым. Закончылася гэтая гісторыя добра, але можна толькі ўявіць, колькі нерваў яна «з'ела».

Ці яшчэ адзін выпадак. Калі я яшчэ вучылася і не было дзе жыць, мяне пусціла да сябе аднакурсніца. У яе быў пакой у чатырохпакаёвай кватэры, які яна ніяк не магла прадаць. Пасля першай жа ночы на новым месцы стала зразумела чаму. Прачнулася я ад шуму вады, якая лілася на нашы дзверы. «Падпальваюць», — чамусьці прыйшла ў галаву страшная думка, бо ад сяброўкі я ведала, што суседзі па кватэры з ёю ў даволі напружаных адносінах з-за частых бытавых сутычак. (Яна нават некалькі разоў выклікала міліцыю, калі жыць з хлопцамі, якія вельмі любілі, напіўшыся, на ўсю моц уключаць музыку, станавілася немагчыма.) Ад гэтага ж шуму прачнулася і сяброўка. Яна адчыніла дзверы і... убачыла вельмі п'янага суседа, які пераблытаў прыбіральню з нашым пакоем і рабіў сваю мокрую справу прама на дзверы. Не хочацца расказваць, што было далей, як было непрыемна, агідна потым глядзець на гэтага чалавека.

Праўда, сяброўка пазней прадала свой пакой. За два гады там змяніліся тры ўладальнікі: разабраўшыся, што і як, людзі стараліся пазбавіцца ад такой уласнасці. А вось апошнюю гаспадыню застаў знакаміты фінансавы крызіс і прадаць свой пакойчык з такімі суседзямі яна, як ні старалася, не можа. У кватэры ўжо два разы быў патоп, калі п'яныя хлопцы проста забываліся зачыніць краны (на шчасце, кватэра знаходзіцца на першым паверсе і нікога не затапіла), адзін раз — пажар. На гэты раз сусед «пад мухай» не патушыў цыгарэту, загарэўся матрац, фіранкі і лінолеум у яго пакоі. Дзякуй Богу, суседзі па лесвічнай пляцоўцы, адчуўшы пах дыму, своечасова выклікалі «пажарную». Я ўжо не кажу пра стан месцаў агульнага карыстання, якія нават за сабой хлопцы не прыбіраюць.

Гаспадыня злашчаснай маёмасці ўжо стамілася выклікаць міліцыю, калі пасля чарговай папойкі яе суседзі па кватэры пачынаюць высвятляць адносіны. Калі ўсё ж яна звяртаецца па дапамогу да ўчастковага, за гэта потым хлопцы ёй помсцяць, напрыклад, выкручваюць усе краны ў кватэры, і дзяўчына не можа карыстацца вадой.

Што тут казаць, калі іншы раз і з роднымі бывае цяжка ўжыцца, а тут...

— Да нас не часта звяртаюцца людзі наконт спрэчных пакояў ці доляў у кватэры, — кажа **адвакат юрыдычнай кансультацыі Маскоўскага раёна Сяргей ЛЯГЧЫЛІН**. — Але ўсё ж пытанні ўзнікаюць. Самае папулярнае — ці мае чалавек права на пэўную долю ў кватэры. Адказ тут такі: калі размова ідзе пра прыватызацыю кватэры, у якой удзельнічала некалькі чалавек, напрыклад, бацькі, дзеці, бабулі, дзядулі, то ва ўсіх іх ёсць квоты. Гэта значыць пры падзеле кватэры кожнаму дастаецца пэўная доля ў ёй. Напрыклад, калі разглядаць трохпакаёвую кватэру і сям'ю з трох чалавек, то кожны становіцца ўладальнікам ізаляванага пакоя, а падсобныя памяшканні застаюцца ў долевай уласнасці.

Пры продажы пакоя патрэбна ведаць, што ў астатніх пайшчыкаў ёсць права пераважнай пакупкі. У такім выпадку праз натарыяльную кантору чалавек, які хоча прадаць сваю ўласнасць, абавязаны пісьмова паведаміць астатнім пра свой намер. Толькі пасля адмовы суседзяў ад пакупкі на працягу месяца можна шукаць іншага пакупніка.

Калі вы прапанавалі чалавеку, які мае права пераважнай пакупкі, пакой па адной цане, а пасля яго пісьмовай адмовы прадалі па больш нізкай, ён мае права на працягу трох месяцаў патрабаваць у судовым парадку перавесці на яго правы і абавязкі пакупніка.

Іншая справа, калі размова ідзе пра вызначэнне парадку карыстання пакоем з дзяржаўнага жыллёвага фонду. Права карыстання азначае, што чалавек можа жыць у пакоі, але нічога большага з ім ён зрабіць не мае права. У гэтым выпадку ніякія дагаворы адчужэння грамадзянін не можа ажыццяўляць.

— Іншы раз даводзіцца сутыкацца з юрыдычнай непісьменнасцю людзей, — дзеліцца Сяргей Анатольевіч. — Некаторыя пасля падзелу асабовага рахунку і вылучэння ім на карыстанне ізаляванага пакоя з дзяржаўнага жыллёвага фонду пачынаюць лічыць яго сваім і стараюцца прадаць.

Толькі ўласнік мае права распараджацца сваёй маёмасцю, як хоча: дарыць, мяняць, завяшчаць, прадаваць. Праўда, абмежаванні ёсць і тут. Калі ў пакоі зарэгістравана няпоўнагадовае дзіця ці яшчэ хто з членаў сям'і ўладальніка, то любыя здзелкі могуць здзейсняцца толькі з іх дазволу. Аднак, як правіла, пакой знаходзіцца ва ўласнасці ў аднаго чалавека.

Што датычыцца кватэры, якую муж і жонка атрымалі праз жыллёва-будаўнічыя кааператывы, то за імі замацоўваецца па 1/2 долі. Дзеці ўладальнікамі не становяцца, а маюць права толькі карыстацца кватэрай.

Марына ЛЯВОШКА.

ЗАО Банк ВТБ (Беларусь)

Республика Беларусь, 220004, г. Минск, ул. К. Цеткин, 51

Лицензия на осуществление банковской деятельности от 27.11.2007 г. № 23, выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 101165625

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 июля 2009 года

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	2009 г.	2008 г.
1	2	3	4	5
1	АКТИВЫ			
2	Денежные средства	1101	27 122,5	7 988,9
3	Средства в Национальном банке	1102	58 392,0	66 547,0
4	Ценные бумаги:	1103	35 746,4	44 129,0
	для торговли	11031	35 746,4	44 129,0
	удерживаемые до погашения	11032	-	-
	в наличии для продажи	11033	-	-
5	Кредиты и другие средства в банках	1105	441 114,6	355 977,9
6	Кредиты клиентам	1106	1 029 298,9	618 520,5
7	Долгосрочные финансовые вложения	1107	470,7	450,7
8	Основные средства и нематериальные активы	1108	51 319,7	27 543,0
9	Прочие активы	1109	12 425,1	6 406,3
10	ИТОГО активы	110	1 655 889,9	1 127 563,3
11	ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
12	Средства Национального банка	1202	9 034,5	-
13	Кредиты и другие средства банков	1205	597 370,3	260 769,8
14	Средства клиентов	1206	826 207,5	727 621,7
15	Ценные бумаги, выпущенные банком	1208	2 854,2	-
16	Прочие обязательства	1209	20 911,5	9 921,7
17	ВСЕГО обязательства	120	1 456 378,0	998 313,2
18	КАПИТАЛ			
19	Уставный фонд	1211	84 370,2	40 005,6
20	Эмиссионный доход	1212	34 320,3	34 320,3
21	Резервный фонд	1213	16 891,6	13 553,6
22	Накопленная прибыль	1214	51 488,9	33 160,0
23	Фонд переоценки статей баланса	1215	12 440,9	8 210,6
24	ВСЕГО капитал	121	199 511,9	129 250,1
25	ИТОГО обязательства и капитал	12	1 655 889,9	1 127 563,3
26	ТРЕБОВАНИЯ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА НА ВНЕБАЛАНСОВЫХ СЧЕТАХ			
27	Требования	1301	830 924,4	258 584,2
28	Обязательства	1302	547 943,8	489 059,9

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ на 1 июля 2009 года

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	2009 г.	2008 г.
1	2	3	4	5
1	Процентные доходы	2011	76 223,9	31 582,8
2	Процентные расходы	2012	39 802,4	16 558,2
3	Чистые процентные доходы	201	36 421,5	15 024,6
4	Комиссионные доходы	2021	15 144,5	8 735,7
5	Комиссионные расходы	2022	2 719,8	885,5
6	Чистые комиссионные доходы	202	12 424,7	7 850,2
7	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	203	805,4	6 600,8
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204	31,4	15,0
9	Доход в форме дивидендов	205	0,1	0,1
10	Чистые отчисления в резервы	206	18 904,7	(-650,9)
11	Прочие доходы	207	21 868,1	2 460,0
12	Операционные расходы	208	25 455,0	19 367,2
13	Прочие расходы	209	10 646,7	1 240,8
14	Налог на прибыль	210	2 785,4	1 808,7
15	ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	2	13 759,4	10 184,9

Исполняющий обязанности Председателя Правления Ю.В. Цедрик

Главный бухгалтер М.В. Дудко

Дата подписания "07" июля 2009 г.

БЕЗ ШАНЦАЎ НА ВЫЖЫВАННЕ

11 ліпеня ў Гродзенскім раёне адбылася аварыя, што не мае з пачатку года аналагаў па наступствах. Вадзіцель «Фальксваген-Пасата» рухаўся з боку гарпасёлка Сапоцкін у напрамку вёскі Зарачанка. Спусціўшыся з горкі, машына стала рухацца хаатычна: то ў левы, то ў правы бок. Не здолеўшы ўтрымаць аўтамабіль, вадзіцель «Фальксвагена» выехаў на сустрэчную. А па ёй рухаўся КамАЗ. У выніку лабавога сутыкнення аўтамабілі зліліся ў адзінае цэлае, не пакінуўшы людзям, якія ехалі ў «Пасаце», шанцаў на выжыванне: машыну настолькі змяла, што нават пры старанным аглядзе немагчыма было вызначыць дакладную колькасць загінулых. Каб расцягнуць разбітыя машыны, давялося выкарыстаць трактар і два КамАЗы. Толькі тады высветлілася, што загінулі два чалавекі: вадзіцель і сямігадовая суседская дзяўчынка.

Алег ДУК, старшы інспектар УДАІ УУС Гродзенскага аблвыканкама.

Невычэрпны студзянец

У Касцюковіцкім раёне ўпарадкавалі старажытную крыніцу, ваду з якой мясцовыя людзі лічаць святой і гаючай.

Фота Мікалая ЦІТОВА.

Студзянецкая крыніца вядомая як мінімум пяць стагоддзяў. Столькі ж, колькі і раённы цэнтр Касцюковічы. За мінулым часам гэту крыніцу назвалі «студзянцом», і яна дала назву мястэчку, якое працвітала. Калісьці ў Студзянцы былі два праваслаўныя храмы, касцёл, сінагога, дзве школы і дзясяткі крамаў.

У Касцюковіцкім раёне расказваюць гісторыю, якая адбылася напрыканцы XIX стагоддзя. Мясцовы памешчык Уладзімір Цеханавецкі, заможны і паважаны чалавек, быў заклапочаны адсутнасцю спадчынніка. Больш за дзясятак гадоў у шлюбе не нараджалася дзіця. Муж з жонкай не знаходзілі дапамогі ў лепшых дактароў у еўрапейскіх сталіцах. Але тут памешчыку расказалі пра святую крыніцу.

У дзень Святога Духа ў 1896-м годзе Цеханавецкія прайшлі хросным ходам, а пасля малебну каля крыніцы акуняліся ў купель. Пры ўсім народзе памешчык паабяцаў: калі народзіцца сын — будзе над крыніцай царква. Усё так і спраўдзілася.

Студзянецкая крыніца заўсёды прыцягвала паломнікаў. Нават калі ў 1930-м годзе былі зруйнаваныя і капліца на крыніцы, і ўсе храмы мястэчка. У саракавых гадах на крыніцы з'явіўся новы зруб і крыж.

Сёння Студзянец — невялікая ціхая вёсачка. Часы мяняюцца, але людзі па-ранейшаму ідуць набраць гаючай вады і павязаць на высокі дубовы крыж ля крыніцы ручнікі і стужкі. Цяпер там можна зноў, як і больш за сто гадоў таму, акунуцца ў ледзяную, але гаючую купель.

Касцюковіцкія ўлады з дапамогай буйных прадпрыемстваў раёна навялі парадак на месцы старажытнага калодзежа-студзянца. Выява царквы, якую пабудаваў над крыніцай Цеханавецкі, не захавалася. Але цяпер на месцы ўнікальнага помніка прыроды ажыццявілі новы праект: прасторны дубовы зруб пад дахам, дзе можна атрымаць асалоду ад свежай крынічнай вады і чыстай аўры стагоддзямі намоленага месца.

Ілона ІВАНОВА.

Бегалі дзяўчаты на «шпільках»...

У гэтую суботу, 11 ліпеня, у нямецкай сталіцы адбыўся чарговы спрынтарскі забег на шпільках Glamour Stiletto Run 2009. Пераможніцы, якая прабегла дыстанцыю з вынікам 14,2 секунды і паставіла новы рэкорд у гэтым новым, гламурным відзе спорту, дастаўся галоўны прыз у дзесяць тысяч еўра.

Удзельніцы забегу павінны прабегчы стаметроўку на абцасах, вышынёй не меней за 7 сантыметраў і таўшчынёй не больш за 1,5 сантыметра. Абавязковая ўмова для ўдзельніц забегу — бегчы менавіта на «шпільках». Абцасы ўсіх іншых фасонаў, хай і высокія, — па-за фарматам. Модны часопіс Glamour адабраў для ўдзелу ў забегу 100 дзяўчын з усёй Германіі. Удзельніцы забегу спаборнічалі за галоўны прыз — падарункавы сертыфікат на суму 10 тысяч еўра. Стаметроўка ў модным абутку — гэта праверка сябе, сваёй спартыўнай формы і пачуцця гумару. Пераможніцай спаборніцтваў стала жыхарка нямецкай сталіцы — 22-гадовая студэнтка Юлія Плехер. Дзяўчына прыйшла да фінішу пад запаветным нумарам 88. Ёй атрымалася пераадолець 100-метровую дыстанцыю за 14,2 секунды. Такім чынам Юлія паставіла новы рэкорд у гэтай «моднай» спартыўнай дысцыпліне, на паўсекунды апярэдзіўшы былую рэкардсменку, пераможніцу 2007 года. Дарэчы, дзейны сусветны рэкорд у бегу на 100 метраў сярод жанчын складае 10,49 секунды. Альма Фрога з Мюнхена і Барбара Рынк з горада Швальбах хоць і саступілі пераможніцы ў хуткасці, але затое атрымалі каштоўныя прызы за самыя прыгожыя туфлі і самую элегантную сукенку.

Падрыхтаваў Іван КУПАРВАС.

Рэдакцыя газеты «Звязда» віншуе **з 50-годдзем** прэс-аташэ Нацыянальнага алімпійскага камітэта Беларусі **Пятра РАБУХІНА**.

Зычым юбіляру моцнага здароўя, сямейнага дабрабыту, новых творчых палётаў і натхнення на карысць айчыннаму спорту і алімпійскаму руху.

Звяздоўцы.

Краіна здароўя

Выпуск № 24 (138)

«Прамая лінія»

ЯКІЯ ХВАРОБЫ ПАГРАЖАЮЦЬ ВАЧАМ НАШЫХ ДЗЯЦЕЙ

Сёння ўсё больш дзяцей становяцца пацыентамі афтальмолагаў. Якія прычыны зніжэння зроку ў дашкольнікаў? Як пазбегнуць зрокавых перагрузак падлеткам? Ці маецца генетычная схільнасць да тых або іншых захворванняў вачэй? Што рабіць, калі зрок пачаў падаць? На гэтыя і іншыя пытанні, звязаныя з работай органаў зроку ў дзяцей, падчас «прамой лініі» адкажа **галоўны дзіцячы афтальмолаг Міністэрства аховы здароўя, доктар медыцынскіх навук, дацэнт кафедры афтальмалогіі БелМАПА Вікторыя Леанідаўна КРАСІЛЬНІКАВА.**

«Прамая лінія» адбудзецца 17 ліпеня, у пятніцу з 15.00 да 16.00 па нумарах 8 (017) 292 38 92 і 292 38 21. Папярэднія пытанні можна пакінуць па тэлефоне 8 (017) 287 18 36 (Вольга Шаўко).

Інфарм-укол

ВІРУС ГЕРПЕСУ ЯК ПРЫЧЫНА НЕЎРАЛГІІ

Неўралгіі — моцныя прыступы болю, якія ідуць па шляху аднаго з нерваў, звычайна з'яўляюцца пасля 40 гадоў і часцей ад іх пакутуюць людзі больш сталага ўзросту.

Адрозніваюць неўралгіі языкаглотачныя, патылічныя, міжрабрынныя. Неўралгія трайнічнага нерва, найбольш звычайная з усіх, характарызуецца моцнымі, вострымі, падобнымі на ўдар току болямі з аднаго боку твару. Гэты від неўралгіі ў жанчын сустракаецца ў 3 разы часцей, чым у мужчын.

Даследчыкі вызначылі, што некаторыя з неўралгій абавязаны сваім узнікненнем вірусу herpes zoster, які выклікае апаясвальны лішай (постгерпетычную неўралгію), або вірусу herpes simplex. Постгерпетычная неўралгія бывае пакутнай. Звычайна яна праяўляецца моцным болем, а не кароткачасовымі стрэламі. Дотык або рух, нават такі, як хванне, могуць выклікаць новы болевы прыступ. Нервовыя болі могуць цягнуцца тыднямі, а часам і гадамі пасля знікнення ўсіх іншых прыкмет герпетоіднай інфекцыі.

ЗДАРОВЕНЬКІМ ВОЧКАМ

Каб мець добры зрок, трымайцеся наступных рэкамендацый:

- Правярайце зрок рэгулярна.
- Абараняйце вочы ад яркага сонечнага святла. Купіце (у спецыялізаваных аптэках) цёмныя акуляры не толькі сабе, але і дзецям.
- Ужывайце ежу, багатую на вітамін А і бэта-карацін — моркву, дыню.
- Калі неабходна, карэктуйце зрок правільна падабранымі акулярамі.
- Выкарыстоўвайце добрае асвятленне.
- Лячыце такія хранічныя захворванні, як дыябет і артэрыяльная гіпертэнзія.
- Тэрмінова звярніцеся да ўрача, калі ў вас раптам з'явіліся цёмныя плямы перад вачыма, успышкі святла або пагоршыўся зрок.

ЦІ РАБІЦЬ ПІРСІНГ У ВЕРХНЯЙ ЧАСТЦЫ ВУХА?

Лепей не праколваць храшч у верхняй частцы вуха. Інфекцыя ў гэтым месцы можа выклікаць пашкоджванне храшча, што прывядзе да сур'ёзнай дэфармацыі вуха.

Храсток вызначае форму вонкавага вуха. Ён жыве за кошт пажыўных рэчываў, якія пакрываюць яго тканкі. Запаленне або інфіцыраванне гэтай тканкі можа прывесці да адслаення пажыўнага слою, што пазбавіць храсток магчымасці харчавацца. Што горш, прымяненне антыбіётыкаў у гэтым выпадку не дае выніку, паколькі кроў не ў стане данесці да храстка лекі. Мочка вуха мае сваю ўласную сістэму кровазабеспячэння, якая эфектыўна рэагуе на антыбіётыкі.

Вядучая рубрыкі Святлана БАРЫСЕНКА.

Едзеце на мора? Увільгатняйце скуру

Фота БЕЛТА.

У многіх з нас лета асацыюецца з паездкай на мора, без якога і водпуск — не водпуск. Але не ўсе ведаюць, што пасля кантакту з салёнай марской вадой і паўднёвым сонцам наша скура хутчэй пачынае страчваць вільгаць, абветрываецца, а значыць — і старэе раней часу. Як жа правільна даглядаць скуру ў летні час?

Вядома, што сонца ў вялікай колькасці шкоднае. Яго актыўнасць за апошнія гады павялічылася настолькі, што без ахоўных сродкаў скура, асабліва далікатная жаночая, пашкоджваецца даволі моцна. З'яўляюцца дачасныя маршчыны, пігментныя плямы, папіломы, радзімкі. Таму кожная жанчына павінна ўзяць за правіла выходзіць на вуліцу ў летнія дні не толькі ў цёмных акулярах, але і папярэдне нанёсшы на скуру сонцаахоўны крэм.

Набор касметалагічных працэдур, якія ў гэты перыяд прапануюць у салонах прыгажосці, адрозніваецца ад тых, якія праводзяцца восенню ці зімой. Летам не рэкамендуюцца пілінгі, асабліва хімічныя, з гліколевымі кіслотамі, працэдуры шліфавання. Лёгкія фруктовыя пілінгі трэба рабіць з вялікай асцярожнасцю, а лепш і зусім не рабіць. Як раяць касметолагі, не варта праводзіць у летні перыяд і курсы масажу твару, шыі, нават крыамасаж непажаданы, паколькі ён дадаткова сушыць скуру. З-за спякоты кровазварот у дробных сасудах твару і так значна ўзмацняецца, а энергічны масаж можа негатыўна адбіцца на жанчынах з далікатнай структурай скуры. Таксама можа з'явіцца або ўзмацніцца разацэя, стаць больш выражанай сасудзістая сетка ў вобласці падбародка, скул. І як часта бывае, схаваць бачныя сасуды на твары затым бывае значна цяжэй.

Галоўная задача ўсіх касметычных працэдур лета — гэта, безумоўна, увільгатненне. У склад увільгатняльных крэмаў звычайна ўваходзяць тлустыя кіслоты, малочная кіслата, вітаміны і натуральны алей шыпшыны, персіка, абрыкоса. Каб пасля вяртання з марскога ўзбярэжжа скура не пачала лушчыцца і не агрубела, заняцца яе ўвільгатненнем варта яшчэ да водпуску. Карысна, напрыклад, прайсці курс увільгатняльных масак у касметычным салоне або накладваць маскі самастойна ў хатніх умовах.

Увільгатняльныя маскі паляпшаюць мікрацыркуляцыю крыві, рэгулююць баланс вадкасці ў эпідэрмісе, замаруджваюць утварэнне маршчын. Прычым іх абавязкова наносяць на скуру вакол вачэй і на вусны. Апошнія пасля марскога купання часта трэскаюцца, а ў іх куточках з'яўляюцца непрыемныя «заеды».

Летам не варта забываць і пра шыю, бо яна першай «выдае» ўзрост. Яе скуру таксама трэба як мага больш увільгатняць. Інакш многім жанчынам пасля адпачынку на моры ўжо восенню давядзецца хаваць яго наступствы пад шыйную хусцінку.

УВІЛЬГАТНЯЛЬНАЯ МАСКА

для сухой і нармальнай скуры: да 2 ст. лыжак варанага гарбуза або працёртых яблыкаў дадаць 1 ст. лыжку аліўкавага або соевага алею;

для тлустай скуры: ачысціць памідор ад лупіны, добра расціснуць, дадаць 1 ч. лыжку крухмалу і ўсё перамяшаць;

для нармальнай і камбінаванай скуры: узяць па 1 ст. лыжцы маркоўнага, агурочнага, лімоннага соку і бульбянога крухмалу.

Пры адчувальнай і сухой скуры трэба адразу пераключыцца на ашчадны догляд. Ваду пры ўмыванні часова замяніць адварам рамонку або рамонку з ліпавым цветам.

Тым, хто працяглы час знаходзіцца на паветры, варта рабіць кампрэсы: накладваць на ачышчаную скуру марлевыя сурвэткі, змочаныя ў адвары траў (ліпавага цвету, рамонку, пялёсткаў ружы, лісця мяты — 2 ст. лыжкі сумесі заліць шклянкай кіпеню).

Летам неабходна звярнуць асаблівую ўвагу і на догляд валасоў. Уплыў сонечнага святла на іх добра вядомы: яно высушвае водна-ліпідную абалонку воласа, стрыжань становіцца сухім, шурпатым; валасы дрэнна расчэсваюцца, знікае бляск, цьмянеюць як натуральныя, так і афарбаваныя валасы. Спалучэнне сонечнага святла і марской вады садзейнічае «вымыванню» керацыну з валасянога стрыжня. Апошні становіцца практычна мёртвым і лёгка выпадае нават пры малой траўме. Усіх гэтых непрыемнасцяў можна пазбегнуць, калі выкарыстоўваць летам касметыку з УФ-фільтрамі і сродкі для аднаўлення — сывараткі, бальзамы, пажыўныя маскі.

Каб адчуць эфект ад маскі, неабходна рабіць яе не радзей як раз на тыдзень на працягу 1—2 месяцаў. Не трэба рабіць разнастайныя маскі, лепш выбраць адну, прайсці курс, а потым ужо спрабаваць іншыя.

Маска для сухіх валасоў: змяшаць ільняны алей з гарэлкай у роўных прапорцыях і ўціраць у валасы на працягу 10 хвілін лёгкімі рухамі, затым ухутаць галаву ручніком і трымаць паўгадзіны;

для тлустых валасоў: 2 ст. лыжкі сухіх кветак рамонку заліць 50 мл кіпеню і настойваць 3-4 гадзіны, пасля чаго працадзіць. Узбіць яечны бялок у моцную пену, змяшаць яго з настоем рамонку. Атрыманую сумесь уцерці ў валасы і скуру галавы. Пакінуць да поўнага высыхання, пасля чаго вымыць галаву цёплай вадой з шампунем. Рэгулярнае выкарыстанне гэтай маскі не толькі дапаможа вырашыць праблему з празмернай сальнасцю валасоў, але і зробіць іх больш мяккімі і шаўкавістымі;

апаласквальнік супраць выпадзення: 4 ст. лыжкі кораню аеру заліць 0,5 л гатаванай вады і настояць. Настой папярэдняе выпадзенне валасоў, паляпшае іх рост, пазбаўляе ад перхаці.

Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.

Доктар адкажа

Ёсць пытанні? Тэлефануйце...

На наступным тыдні дзяжурыць на «гарачай» лініі Міністэрства аховы здароўя (222 70 80) плануюць:

20 ліпеня — намеснік галоўнага ўрача РНПЦ пульманалогіі і фтызіятрыі Георгій Сяргеевіч АЎДЗЕЕЎ.

21 ліпеня — намеснік дырэктара Рэспубліканскага цэнтра экспертызы і выпрабаванняў у ахове здароўя Сяргей Іванавіч ЗІНЧАНКА.

22 ліпеня — галоўны ўрач Мінскай абласной дзіцячай бальніцы Дзмітрый Уладзіміравіч ЗАЙЦАЎ.

23 ліпеня — намеснік дырэктара НДІ эпідэміялогіі і мікрабіялогіі Аляксандр Сяргеевіч ПЯТКЕВІЧ.

24 ліпеня — галоўны спецыяліст упраўлення па ліцэнзаванні Міністэрства аховы здароўя Генадзь Мікалаевіч РЭУНОЎ.

У графіку магчымыя змяненні.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Дыскусія

У ПАЦЫЕНТАЎ ЁСЦЬ ПРАВЫ?

Пытанні правоў пацыентаў у Беларусі па сёння застаюцца тэмай, якая не выходзіць за межы вузкага прафесійнага абмеркавання. Аб правах спажыўцоў, дзякуючы шырокай асветніцкай рабоце, што праводзіцца спажывецкай грамадскасцю і сродкамі масавай інфармацыі, ведаюць, напэўна, усе, і актыўна карыстаюцца палажэннямі Закона «Аб абароне правоў спажыўцоў». Але калі пацікавіцца ў людзей: ці часта ім даводзіцца карыстацца правамі пацыентаў, многія, напэўна, увогуле здзівяцца, што ў пацыентаў, аказваецца, ёсць нейкія правы. Між іншым, правы пацыентаў занатаваныя ў Законе Рэспублікі Беларусь «Аб ахове здароўя» і Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, у законах «Аб аказанні псіхіятрычнай дапамогі», «Аб трансплантацыі органаў і тканак», «Аб донарстве крыві і яе кампанентаў», у шматлікіх нарматыўных прававых актах Міністэрства аховы здароўя, і зноў такі — у Законе «Аб абароне правоў спажыўцоў». Праўда, у апошнім выпадку размова ідзе пераважна аб платнай медыцыне. Цікавая дыскусія на тэму правоў пацыентаў была арганізавана грамадскім аб'яднаннем «Цэнтр сацыяльных інавацый» у рамках «круглага стала», удзельнікамі якога сталі эксперты ў галіне аховы здароўя, спецыялісты медыцынскага права, прадстаўнікі грамадскіх арганізацый і сродкаў масавай інфармацыі.

Кандыдат сацыялагічных навук Аксана ШЭЛЕСТ агучыла папярэднія звесткі сацыялагічнага апытання, якое было арганізавана з мэтай высвятлення агульнай сітуацыі з рэалізацыяй правоў пацыентаў у Беларусі.

— Апытанне праводзілася ў форме сацыялагічнага інтэрв'ю, якое не заганяе рэспандэнтаў у жорсткія рамкі і не падказвае ім адказы. Гэта было апраўдана, паколькі дазволіла атрымаць больш аб'ектыўную карціну, — патлумачыла Аксана Шэлест. — Дарэчы, некаторыя інтэрв'ю нам давялося адбракаваць па прычыне некампетэнтнасці нашых рэспандэнтаў, хоць мы, заўважу, звярталіся да людзей, якія павінны былі быць інфармаваныя ў прапанавай тэме. Фактычна мы зафіксавалі веданне аб няведанні правоў пацыентаў. Каб атрымаць усебаковую ацэнку праблемы, мы спрабавалі ахапіць сацыялагічным апытаннем усіх, хто тым ці іншым чынам мае дачыненне да рэалізацыі правоў пацыентаў: гэта прадстаўнікі сістэмы аховы здароўя, медыцынскай супольнасці, грамадскія арганізацыі медыкаў, людзі, якія займаюцца абаронай правоў пацыентаў, журналісты і праваабаронцы. Паколькі даследаванне яшчэ не завяршылася, я магу гаварыць толькі аб відавочных рэчах. Нас, напрыклад, цікавіла разуменне правоў пацыента і ацэнка іх значнасці. У прынцыпе, усе апытаныя аднадушныя ў тым, што правы пацыента маюць вельмі важнае значэнне, аднак на больш глыбокія пытанні, для чаго яны патрэбныя, у чым заключаецца іх значнасць, які ўплыў яны робяць на грамадства, разуменне ў рэспандэнтаў даволі павярхоўнае.

Аднадушныя рэспандэнты і ў тым, што правы пацыентаў павінны быць прапісаны ў заканадаўстве. Многія называлі тое, што правы пацыентаў хоць і занатаваныя ў заканадаўстве, але механізмы іх рэалізацыі адсутнічаюць. У якасці прыкладу можна прывесці права пацыента на выбар урача і ўстановы аховы здароўя, якое немагчыма рэалізаваць у поўнай меры ў дзяржаўнай медыцыне з-за эканамічных прычын і наяўнасці кадравага дэфіцыту. Пэўная частка рэспандэнтаў лічаць, што праблем з рэалізацыяй правоў пацыентаў няма з той прычыны, што пацыенты не вельмі інфармаваныя аб сваіх правах.

Медыцынскія работнікі, у сваю чаргу, называлі не зусім адэкватнае разуменне пацыентамі сваіх правоў, якое можа прыводзіць да парушэння правоў саміх медыцынскіх работнікаў. ***Вельмі далікатны момант, з якім нам давялося сутыкнуцца, гэта скаргі пацыентаў.*** Многія прызнаюць, што фактычна адзіным механізмам рэалізацыі пацыентамі іх правоў з'яўляюцца скаргі ў вышэйшыя інстанцыі . І мы вымушаныя канстатаваць , што прадстаўнікі медыцынскай супольнасці вельмі незадаволеныя гэтым механізмам, паколькі скаргі не заўсёды бываюць абгрунтаваныя, а некаторыя скаржнікі ствараюць медыкам, з іх слоў, проста невыносныя ўмовы працы. З іншага боку, гэтым механізмам незадаволеныя і самі пацыенты, паколькі ён знаходзіцца ўнутры сістэмы аховы здароўя, працэдура разгляду і вырашэння канфліктных сітуацый не адкрытая і не празрыстая, і пацыент ніяк не можа на яе ўплываць.

Таксама нашы рэспандэнты ўказвалі на недастатковае асвятленне тэмы правоў пацыентаў у СМІ. Гэтаму пытанню надаюць увагу, хутчэй, спецыялізаваныя выданні, а не выданні, якія фарміруюць грамадскую думку. Часцей за ўсё ў СМІ назіраецца перакос у бок сенсацыйнасці, асвятляецца тэма памылак медыцынскага персаналу, неналежнага выканання сваіх абавязкаў.

На думку ўрача-судмедэксперта **Андрэя ФАМЕНКІ**, які працуе ў дзяржаўнай службе судова-медыцынскіх экспертыз, пацыентаў пераважна хвалююць дзяржаўныя гарантыі па забеспячэнні як даступнасці, так і якасці паслуг, забеспячэнне лекавымі сродкамі, сродкамі медыцынскага прызначэння і, безумоўна, стаўленне да іх медыцынскага персаналу, гэта значыць, пытанні сацыяльнага плана. А медыцынскія работнікі бачаць сваю задачу перш за ўсё ў тым, каб аказваць высакаякасную медыцынскую дапамогу. У іх разуменні правы пацыентаў адыходзяць на другі план у параўнанні з патрэбамі пацыентаў. Аб абавязках пацыентаў весці размову з медыкамі значна радзей,чым аб іх правах. Медыкі справядліва лічаць, што выкананне пацыентамі іх абавязкаў спрыяльна ўплывае як на ход лячэння, так і на яго вынікі. Увогуле самая распаўсюджаная пазіцыя — «урач заўсёды мае рацыю, таму навошта з пацыентам раіцца і ставіць яго ў вядомасць аб ходзе лячэння?» Хоць хвораму не менш чым кампетэнтнасць урача патрэбныя яго ўвага, добразычлівасць, дакладныя і ясныя рэкамендацыі, адным словам, супрацоўніцтва ў барацьбе з хваробай. А любое неасцярожна сказанае слова, дрэнны настрой лёгка могуць паслужыць дэтанатарам канфлікту.

Андрэй Фаменка лічыць, што ў Беларусі назіраецца яркая выражаны ўхіл у бок дэкларавання правоў пацыента пры адсутнасці механізмаў па іх рэалізацыі. Аднак нярэдка парушаюцца нават тыя правы, для рэалізацыі якіх не патрабуецца задзейнічання ніякіх дадатковых эканамічных рэсурсаў. У якасці прыкладу ён прывёў права пацыента на захаванне канфідэнцыйнасці медыцынскай інфармацыі.

— У нас можна, патэлефанаваўшы ў бальніцу, назваўшы сваяком хворага і атрымаць ва ўрача, які яго лечыць, усю інфармацыю аб стане здароўя. Напэўна, тэлефонныя стасункі не могуць спрыяць захаванню ўрачэбнай тайны, — рэзюмаваў Андрэй Фаменка. — Здараецца, што ўрачы забываюць атрымаць згоду пацыента на медыцынскае ўмяшанне, асабліва калі размова ідзе аб аказанні экстраннай дапамогі, ці не даюць пацыенту ўсю інфармацыю аб яго здароўі. У медыцынскай праграме на беларускім тэлебачанні, прысвечанай лячэнню анкалагічных захворванняў, пацікавіліся меркаваннем вядомага спецыяліста: а ці трэба паведамляць пацыенту пра тое, што ў яго знойдзена цяжкае захворванне? І той без цені сумнення адказвае, што такая інфармацыя можа дрэнна адбіцца на псіхічным стане хворага і пагоршыць яго здароўе. Прабачце, але Закон «Аб ахове здароўя» прадугледжвае адназначнае трактаванне гэтага пытання: **пацыент мае права на поўную і праўдзівую інфармацыю аб стане свайго здароўя**.

— Нашы пацыенты забываюць ці не ведаюць, што яны маюць права ўдзельнічаць у лячэбным працэсе, у запаўненні медыцынскай дакументацыі, у выбары метадаў лячэння, прадастаўленні ім у поўным аб'ёме інфармацыі на даступнай для іх мове без складаных і незразумелых медыцынскіх тэрмінаў. Яны маюць права азнаёміцца з запісамі ў амбулаторнай картцы, патрабаваць унясення ў картку тых ці іншых запісаў, пакінуць пад гэтымі запісамі свой подпіс, — дзеліцца сваім меркаваннем **юрыст грамадскага аб'яднання «Абарона правоў спажыўцоў» Кацярына АРЛОЎСКАЯ**. — Калі б да ўрача прыходзіў адукаваны пацыент, які ведае свае правы, медыцынскі работнік абавязаны быў бы паважаць такога пацыента і лічыцца з яго меркаваннем. Яшчэ да пачатку медыцынскага ўмяшання павінен быць наладжаны дыялог паміж урачом і пацыентам: урач павінен з пацыентам размаўляць, паведаміць яму пра плюсы і мінусы таго ці іншага спосабу лячэння, пра магчымыя рызыкі, ускладненні, пабочныя эфекты ад лячэбных прэпаратаў. І пацыент павінен рабіць свядомы выбар, толькі ў гэтым выпадку можна весці размову пра інфармаваную згоду па формуле «зразумеў, згодны, дазваляю». Але як гэта можна рэалізаваць у дзяржаўнай медыцыне пры жорсткіх лімітах часу, адведзеных на прыём пацыентаў, дэфіцыце кадраў і хранічнай перагружанасці ўрачоў? На мой погляд, штуршком да ўсведамлення пацыентам сваіх правоў стала развіццё ў нашай краіне платнай медыцыны, калі пацыенты сталі плаціць за сваё лячэнне. Дзеля справядлівасці трэба сказаць, што Закон «Аб абароне правоў спажыўцоў» значна пашырае правы пацыента, які ўступае з медыцынскай установай у грашова-дагаварныя адносіны (у адрозненне ад бясплатнай медыцыны), і больш-менш зразумела апісвае, як павінен дзейнічаць пацыент у канфліктнай сітуацыі. А пацыент, які атрымаў бясплатную медыцынскую дапамогу, у прынцыпе губляецца, калі гэта дапамога была аказана яму някасна. Ён не ведае, што можна патрабаваць, у каго, у якім памеры, куды трэба звяртацца і колькі часу гэта можа заняць. Пацыенты не ведаюць, як не дапусціць праблемную сітуацыю і як выйсці з яе з мінімальнымі стратамі для здароўя, нерваў і кашалька. Закон добра працуе як у судовым, так і ў дасудовым парадку. Ні аднаму з прыватнікаў не патрэбная канфліктная сітуацыя за межамі медыцынскай арганізацыі, звязаная з някасна аказанай медыцынскай паслугай. Вырашэнне праблемы ў дасудовым парадку выгаднае для ўрачоў, якія вярнулі грошы і закрылі праблему, але нявыгаднае для пацыентаў, якія атрымалі шкоду для здароўя і не ведаюць, што ім рабіць далей... Праўда, вельмі часта ў пацыентаў на першы план выходзіць зусім не здароўе, а грошы. Яны шчыра радуюцца, што вярнулі іх, вось толькі вяртанне грошай не вырашае праблемы са здароўем. Праз пэўны час уся медыцынская дакументацыя запаўняецца «правільна», і паспрабуй штосьці даказаць у судзе. Літаральна на кожным кроку мы сутыкаемся з сітуацыямі, калі амбулаторныя карткі хворага «губляюцца». У медыцынскай установе нават могуць «прыгадаць», што амбулаторную картку забраў сам пацыент. Пацыенты не захоўваюць чэкі і гарантыйныя талоны, дарэчы, апошнія далёка не заўсёды выдаюцца ў прыватных медыцынскіх установах. А суд, хачу ўсіх запэўніць, самае складанае і ў псіхалагічным, і ў матэрыяльным плане выпрабаванне. У 99,9 працэнта выпадкаў судом прызначаецца правядзенне незалежнай судова-медыцынскай экспертызы. Такая экспертыза можа доўжыцца і два, і чатыры, і шэсць месяцаў. У маёй практыцы былі судовыя працэсы, якія цягнуліся два гады. І, прызнаюся, што іх вынік не варты такіх пакутаў.

Трэба адзначыць, што Кацярына Арлоўская мае і медыцынскую, і юрыдычную адукацыю, і спецыялізуецца якраз на медыцынскім праве. Таму ёй блізкая пазіцыя не толькі пацыентаў, але і медыцынскіх работнікаў:

— Пацыенты і ўрачы пастаянна парушаюць правы адно аднаго. Няведанне сваіх правоў зусім не спрыяе наладжванню дыялогу.Таму я горача падтрымліваю ідэю стварэння праекта па абароне правоў медыцынскіх работнікаў, якія абароненыя, на мой погляд, не проста слаба, а вельмі слаба. Мне часта даводзіцца кансультаваць медыкаў у сувязі з тым, што нярэдка пацыенты пачынаюць злоўжываць сваімі правамі. Здараецца, што ўрач выконвае волю пацыентаў, а віна затым кладзецца менавіта на яго. Таму я глыбока перакананая, што нам патрэбная арганізацыя, якая б спецыялізавалася на медыцынскім праве і займалася абаронай правоў як пацыентаў, так і медыцынскіх работнікаў. Працаваць у ёй павінны людзі, якія маюць не толькі юрыдычную, але і медыцынскую адукацыю, паколькі медыцына — галіна вельмі спецыфічная. Невыпадкова медыцынскія справы так не любяць у нашых судах.

Між іншым, сярод экспертаў няма аднадушнай думкі наконт таго, ці патрэбны ў Беларусі асобны Закон «Аб правах пацыента». Ёсць меркаванне, што карыстацца такім законам было б значна прасцей, чым стосам заканадаўчых і нарматыўных прававых актаў. Асабліва калі б у ім былі прапісаны і механізмы па рэалізацыі гэтых правоў. Асобныя законы аб правах пацыентаў ёсць у Фінляндыі, Даніі, Нідэрландах, Літве.

А напрыканцы хацелася б агучыць даволі цікавыя вынікі сацыялагічнага апытання, праведзенага сярод пацыентаў расійскай сталіцы супрацоўнікамі кафедры біямедыцынскай этыкі Расійскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта М. Пірагова. На пытанне, як вы ставіцеся да ўрача, які прычыніў шкоду вам ці здароўю вашых блізкіх, 35 працэнтаў рэспандэнтаў адказалі, што даравалі яму. 21 працэнт удзельнікаў апытання паведамілі, што звярнуліся ў суд, 22 працэнты пашкадавалі аб тым, што не звярнуліся ў судовую інстанцыю. «Ніколі не дарую» паведамілі 19 працэнтаў рэспандэнтаў. ***Цікава, што група пацыентаў-урачоў (100 працэнтаў) аднеслі сябе да пазіцыі «Ніколі не дарую».*** На пытанне, ці павінен урач паведамляць хвораму аб яго безнадзейным дыягназе, станоўчы адказ далі каля 52 працэнтаў удзельнікаў даследавання. 22,7 працэнта далі адмоўны адказ, і прыкладна такая ж колькасць не змаглі даць адказу на гэта пытанне. Паспяховасць лячэння 63 працэнты звязваюць з асобай лечачага ўрача, 28 працэнтаў — з метадамі лячэння і якасцю лекавых сродкаў і 12 працэнтаў — з узроўнем і статусам лячэбнай установы. Неэфектыўнасць лячэння, у сваю чаргу, 67 працэнтаў звязваюць з узроўнем медыцынскай падрыхтоўкі ўрача, 27 працэнтаў— з чалавечымі якасцямі ўрача і адсутнасцю чалавекалюбства. Адным словам, для пацыентаў маюць значэнне не толькі спецыяльныя веды ўрача, але і давер да яго, а таксама маральныя якасці.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ПАЦЫЕНТ МАЕ ПРАВА НА:

- ❒ выбар урача і арганізацыі аховы здароўя;
- ❒ удзел у выбары метадаў аказання медыцынскай дапамогі;
- ❒ паважлівае і гуманнае стаўленне з боку медыцынскіх работнікаў;
- ❒ інфармаваную згоду на медыцынскае ўмяшанне;
- ❒ выбар асобаў, якім можа паведамляцца інфармацыя аб стане яго здароўя;
- ❒ захаванне ўрачэбнай тайны;
- ❒ добраахвотны ўдзел у медыцынскіх даследаваннях;
- ❒ доступ да медыцынскай дакументацыі;
- ❒ адмову ад аказання медыцынскай дапамогі, за выключэннем некаторых выпадкаў;
- ❒ права на абскарджанне неправамоцных дзеянняў медыцынскіх работнікаў.

ЧАЙ ДЛЯ ПАХУДЗЕННЯ: НЕ НАШКОДЗЬ!

Сёння ў кожнай аптэцы можна знайсці чай для пахудзення на любы густ і дастатак. Ці сапраўды такія чаі дапамагаюць пазбавіцца ад лішняй вагі і паскорыць абмен рэчываў? А можа, прыносяць больш шкоды, чым карысці? Давайце разбяромся.

Вырашыўшы скарыстацца дапамогай цуда-чаю, задумайцеся: якіх вынікаў вы ад яго чакаеце? Справа ў тым, што, на жаль, гэтыя сродкі не здольныя «спальваць» тлушчавыя адкладанні. Максімальны эфект, якога можна дасягнуць, — гэта так званае ачышчэнне арганізма. Гэта значыць, што пасля прыёму такога чаю ваша вага можа і знізіцца, але адбудзецца гэта за кошт паслабляльнага і мачагоннага дзеяння траў у складзе напою. У гэтым і заключаецца асноўная небяспека: працяглы прыём паслабляльных і мачагонных сродкаў можа прывесці да непрыемных наступстваў. Яго недахоп пагражае не толькі з'яўленнем мышачнай слабасці, але і сур'ёзнымі парушэннямі функцыі нырак. Пры гэтым, натуральна, адбываецца хуткая страта вагі, якая і надае аптымізму дамам у працэсе пахудзення. Насамрэч яна кароткачасовая і сведчыць толькі аб страце вадкасці, у якой мае патрэбу жаночы арганізм. Яшчэ адна небяспека, якую нясуць у сабе цуда-сродкі, — узнікненне залежнасці, як псіхалагічнай, так і фізічнай. Многія жанчыны, якія доўгі час прымалі ачышчальныя чаі, ужо не могуць ад іх адмовіцца, бо арганізм адвучыўся выводзіць прадукты жыццядзейнасці самастойна. Іншыя свята вераць, што толькі чай дапамагае ім трымаць форму і без яго яны абавязкова распаўнеюць.

Але гэта не азначае, што пра чаі для пахудзення варта забыцца раз і назаўсёды. Проста трэба ўважліва выконваць умовы іх прыёму і, самае галоўнае, адрозніваць якасны чай ад падробак. Жанчыны, якія маюць лішнюю вагу, часта пакутуюць ад запораў і затрымкі вадкасці, таму чай з мяккім паслабляльным і мачагонным дзеяннем дапаможа ім «зрушыцца з мёртвай кропкі». Правіла адно: захоўвайце меру і разлічвайце ўласныя сілы. У любым выпадку, ачышчальны чай можа быць толькі часткай праграмы карэкцыі вагі, а зусім не яе асновай.

Выбіраючы чай у аптэцы, не варта арыентавацца на цану — добры прадукт не абавязкова шмат каштуе. Для пачатку ўважліва разгледзьце ўпакоўку. На ёй павінны стаяць усе неабходныя звесткі: назва і адрас фірмы-вытворцы, указанне на гігіенічны сертыфікат, тэрмін прыдатнасці, поўны спіс інгрэдыентаў, правілы прыёму, фармакалагічнае дзеянне, супрацьпаказанні. Якія прыкметы сведчаць аб тым, што чай не вызначаецца высокай якасцю? Калі вытворцы абяцаюць не толькі ачышчэнне арганізма, але і «спальванне тлушчу», а яшчэ і гарантуюць пазбаўленне ад дзясятка хранічных захворванняў, то ад прыёму такога чаю вы, хутчэй за ўсё, атрымаеце толькі непрыемнасці. Тое ж самае датычыцца і прадукту, які «падыходзіць усім». Убачыўшы ў спісе інгрэдыентаў розныя араматызатары, стабілізатары і іншыя хімічныя рэчывы, задумайцеся: як такі чай зможа «ачысціць» вас ад шлакаў?

Сёння ў аптэках прапанавана вялікая колькасць найменняў ачышчальнага чаю. Як зразумець, які з іх падыходзіць менавіта вам? Уважліва чытайце склад прадукту: калі на адзін з кампанентаў у вас была алергічная рэакцыя або вы проста дрэнна яго пераносіце, гэты чай не для вас.

Калі вы пакуль не вырашылі, які напой выбраць, паспрабуйце прыгатаваць чай для пахудзення самастойна.

- Вазьміце 80 г лісця ажыны, 10 г лісця бярозы і 10 г лісця падбелу. Змяшайце травы, заліце іх кіпенем у прапорцыі 1:20, патрымайце 15 хвілін на водзяной лазні пад накрыўкай, астудзіце і працадзіце. Гэты збор можна піць па шклянцы перад снеданнем і абедам.
- Вазьміце па 50 г стальніку каючага, гарычкі сіняй, лісця і кветак зверабою, крываўніку, лісця трыпутніку і шышак хмелю. 2 ст. лыжкі гэтай сумесі і палову лімона трэба заліць 600 мл кіпеню і штодзень выпіваць па 75 г атрыманага настою.
- Складзіце збор з 3 частак карыны крушыны, 2 частак лісця мяты, 3 частак лісця крапівы і 1 часткі кораня аеру. 1 ст. лыжку сумесі заліце 1,5 шк. кіпеню, пакіньце на 4 гадзіны, а затым працадзіце. Прымайце па паўшклянкі 3 разы на дзень за паўгадзіны да яды.

УВАГА! Памятайце, што некаторыя чаі для пахудзення (а дакладней, іх кампаненты) могуць выклікаць алергічныя рэакцыі, прывесці да парушэння работы сэрца, парушыць мікрафлору кішэчніка. З асаблівай асцярожнасцю трэба выкарыстоўваць чай пры наяўнасці камянёў у жоўцевым пухіры, а таксама пры цяжарнасці. Не ўсе чаі падыходзяць і гіпертонікам.

Зніжэнню вагі садзейнічаюць: эфедра кітайская, чай аалонг, зялёны чай, каміфора, фукус дробнапузырысты, гарцынія камбаджыйская, александрыйскі ліст (касія вастралістая).

Аказваюць паслабляльны эфект: александрыйскі ліст, кара крушыны, медуніца, трава скрыпеню;

мачагонны: хвошч, хрызантэма кітайская, каркадэ, каляндула, лакрычнік, лопух, цыкорыя;

жаўцягонны: куркума, гарычка, корань дзьмухаўца, мята.

Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.

З АСАБІСТАГА ВОПЫТУ

*Аўтару гэтых радкоў аднойчы давялося трапіць у не вельмі прыемную сітуацыю пры звароце ў прыватную стаматалагічную фірму. Першы раз урач, да якога я была запісана на прыём, спазнілася на працу, таму яе давялося чакаць з паўгадзіны. А ў другі раз (гэта было ў перарыве паміж майскімі святамі) яна ўвогуле не прыйшла на працу. Неаднаразовыя званкі адміністратара «прагульшчыцы» пралілі святло — доктар, з яе слоў, «пераблытала змены». Магчыма, я паверыла б у такое тлумачэнне, аднак урач абсалютна не разгубілася, не захвалявалася, калі ёй паведамілі, што яе чакаюць пацыенты па запісе, і не кінулася на працу (па прынцыпе, як выйшла, так выйшла). Пікантнасць сітуацыі заключалася яшчэ і ў тым, што ва ўрача, які абяцаў мне завяршыць распачатае лячэнне, заставаўся ўсяго адзін працоўны дзень перад водпускам. «Няхай прыходзіць заўтра», — паведаміла доктарка адміністратару па тэлефоне, хоць гэты дзень у яе быў увесь распісаны, а мне патрабавалася ад гадзіны да дзвюх, і яна гэта цудоўна ведала. Магчыма, калі б я выйшла за сцены стаматалагічнай фірмы, то паступіла так, як робіць пераважная большасць пакрыўджаных пацыентаў — махнула рукой і пайшла ў іншую фірму. Але я папрасіла даць мне Кнігу для заўваг і прапаноў, дзе і занатавала свае прэтэнзіі да работы стаматолага. Праз пэўны час атрымала па пошце афіцыйныя прабачэнні: «Паважаная Надзея Анатольеўна, дзякуй Вам за заўвагу, якая дапаможа нам палепшыць работу стаматалагічнага кабінета і ўзмоцніць кантроль за работай урачоў. Пры высвятленні гэтай сітуацыі было вызначана, што ўрач пераблытала змены, у выніку ча

Усміхайцеся — вас здымаюць!

На дыягнастычных станцыях з'явіліся камеры відэаназірання. Прыклад таму — станцыя ў Слуцку філіяла УП «Белтэхагляд».

Прайсці з першага разу дзяржаўны тэхнічны агляд удаецца не ўсім. Таму аўтаўладальнікі не заўсёды згодныя з вынікамі дзяржтэхагляду. Зразумець іх можна — рамантуюць свайго жалезнага каня, аддаюць грошы за рамонт, а на штосьці, здавалася б, нязначнае не звяртаюць увагі. Аднак калі размова ідзе аб бяспецы, то гаварыць пра больш ці менш важныя рэчы не мае сэнсу. Вось і даводзіцца некаторым аўтаўладальнікам паўторна прыязджаць на дыягнастычную станцыю.

Усталяванне відэаназірання на дыягнастычнай станцыі ў Слуцку значна палегчыла працу яе супрацоўнікаў, бо канфліктныя выпадкі цяпер можна вырашаць значна хутчэй. Часам імпульсіўныя аўтаўладальнікі пачынаюць неабгрунтавана спрачацца і даказваць сваю праўду. У такіх выпадках супрацоўнікі дыягнастычнай станцыі просяць кліента паводзіць сябе больш карэктна, нагадваючы аб тым, што вядзецца відэаназіранне. Такія просьбы часта палягчаюць разуменне паміж супрацоўнікамі станцыі і аўтаўладальнікамі. Для таго, каб зразумець, хто мае рацыю, а хто вінаваты, дастаткова прагледзець неабходны часавы адрэзак на экране манітора камп'ютара. Дарэчы, інфармацыя захоўваецца ў архіве на працягу паўтара месяца.

Названыя самыя небяспечныя дзіцячыя аўтакрэслы

Далёка не ўсе аўтамабільныя сядзенні для дзяцей сапраўды абараняюць пры аварыі. Брытанская даследчая кампанія Which? правяла незалежнае тэставанне і высветліла, якія крэслы купляць не варта.

Рэдактар выдання Which? Рычард Хедлэнд сцвярджае: «Вы можаце купіць самае бяспечнае аўтакрэсла на рынку, але, каб абараніць дзіця, яно павінна быць усталявана правільна. Мы знайшлі, што некаторыя сядзенні вельмі цяжка прымацаваць, а некаторыя забяспечваюць вельмі нізкую абарону пры аварыі, — гэта проста недапушчальна».

Самую горшую адзнаку, па выніках Which?, атрымала сядзенне Renolux Next Confort. У яго самая высокая верагоднасць няправільнага ўсталявання. Крэсла не спадабалася настолькі, што эксперты прысвоілі яму адзнаку «Не купляйце».

Іншая мадэль гэтай жа фірмы пад нумарам 360 зручнейшая ў выкарыстанні, але ў выпадку аварыі вельмі дрэнна абараняе дзіця. Малеча ў такой мадэлі можа стукнуцца аб пярэдняе сядзенне.

Затое добра паказалі сябе наступныя аўтакрэслы: Britax Baby-Safe Sleeper, Maxi Cosi Cabriofix, Mamas & Papas Primo Viaggio, KiddyInfinity Pro і Britax KidFix.

Беларусы сталі набываць менш новых аўто

Аб'ём продажаў новых замежных аўтамабіляў у Беларусі ў першым паўгоддзі 2009 года скараціўся на 25 %. Па выніках года гэты паказчык можа скласці «мінус 40 %». Такія папярэднія звесткі прывялі на прэс-канферэнцыі эксперты імпарцёра Volkswagen у Беларусі.

У параўнанні з рынкамі Расіі і Украіны, дзе падзенне аб'ёмаў продажаў новых машын ужо склала 50 % і 70 % адпаведна, Беларусь са сваімі 25 % выглядае даволі нядрэнна.

Volvo адклікае больш за 8 тысяч аўтамабіляў мадэляў V70 і S80

Шведскі аўтавытворца Volvo Cars адклікае каля

8,5 тысячы аўтамабіляў мадэляў V70 і S80 з-за магчымага дэфекту ў помпе для падачы паліва.

Як паведаміў 9 ліпеня прадстаўнік кампаніі Штэфан Элфстром, 95 % аўтамабіляў 2008 і 2009 гадоў выпуску, якія падлягаюць адкліканню, былі прададзены ў Швецыі. Астатнія рэалізаваныя ў 15 еўрапейскіх краінах.

У снежні 2007 года кампанія Volvo Cars адклікала 49,5 тысячы аўтамабіляў з-за дэфектаў у фільтрах цвёрдых часціц выхлапу дызельных рухавікоў. У ліпеня-падзе таго ж года Volvo таксама была змушана адклікаць 56 тысяч аўтамабіляў з-за праблем з падушкамі бяспекі і рухавікамі, нагадвае РІА «Навіны».

На складзе ў Рыме загарэлася тысяча аўтамабіляў

У нядзелю на складзе аўтамабіляў, размешчаным на поўдні Рыма, адбыўся пажар, паведамляе тэлеканал Sky-TG24.

Паводле папярэдніх звестак, на пляцы прыкладна дзесяці тысяч квадратных метраў гарэлі каля тысячы аўтамабіляў. Як распавёў тэлеканалу адзін з пажарных, агонь распаўсюдзіўся на суседнія будынкі, дзе захоўваліся шыны і запасныя часткі. Пажарным спатрэбілася каля 24 гадзін, каб справіцца з агнём.

10 гадоў з канфіскацыяй за метамфетамін

Суд Пухавіцкага раёна Мінскай вобласці прызнаў непрацуючага жыхара Мінска вінаватым у незаконным набыцці, захаванні, перавозцы і збыце асабліва небяспечнага псіхатропнага рэчыва ў асабліва буйным памеры і прызначыў яму пакаранне ў выглядзе 10 гадоў пазбаўлення волі з адбываннем у папраўчай калоніі ўзмоцненага рэжыму з канфіскацыяй маёмасці.

Інфармацыю аб магчымым дачыненні 33-гадовага жыхара сталіцы да захавання і збыту псіхатропнага рэчыва, прызначанага для распаўсюджвання ў моладзевым асяродку, супрацоўнікі ўпраўлення КДБ па г. Мінску і Мінскай вобласці атрымалі падчас правядзення комплексу аператыўна-вышуковых дзеянняў у межах барацьбы з незаконным абаротам наркатычных сродкаў.

Зламыснік быў затрыманы аператыўнай групай чэкістаў у момант збыту метамфетаміну на тэрыторыі Пухавіцкага раёна. Падчас вобыску ў машыне знайшлі пакет з небяспечным рэчывам вагой каля 1 кг.

Паводле ацэнак экспертаў, мінімальны кошт канфіскаванай партыі на чорным рынку складае каля 25 тысяч долараў у выпадку аптовага продажу і больш за 100 тысяч долараў пры рэалізацыі фасаваных доз для разовага ўжывання.

Святлана БАРЫСЕНКА.

Кошт адной цыгарэты

Без даху над галавой засталіся грамадзяне з вёскі Прудок Калінкавіцкага раёна. Між тым, прычынай стала традыцыйная цыгарэта, якую 68-гадовы гаспадар у нецвярозым стане сярод белага дня кінуў у калідоры свайго дома.

Пажар заўважылі суседзі, яны ж вывелі з дому п'янага Ч.В., які спаў на верандзе. Да прыбыцця каманды МНС агонь тушыла добравольная пажарная дружына, якую арганізаваў кіраўнік мясцовай гаспадаркі КСУП «Прудоцкае» Сяргей Ярасевіч. Тры пажарныя машыны і 11 выратавальнікаў змаглі прыпыніць распаўсюджванне полымя, але ж справа ўскладнілася выбухам газавага балона, напоўненага напярэдадні. Яго асколак праляцеў некалькі дзясяткаў метраў і трапіў на дах суседскага хлява.

У выніку пажару дом з бярвення, адкуль разгарэўся агонь, значна пацярпеў, знішчаны ўсе надворныя пабудовы і назапашаныя дровы. Пашкоджаны шыферны дах суседскага хлява.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Золатавалютныя рэзервы павялічыліся больш як на $215 млн...

Паводле папярэдніх звестак, золатавалютныя рэзервы Беларусі ў нацыянальным выражэнні на 10 ліпеня гэтага года склалі 3877,4 мільёна долараў ЗША.

Як паведамілі карэспандэнту «Звязды» ва ўпраўленні інфармацыі Нацыянальнага банка Беларусі, з пачатку гэтага года золатавалютныя рэзервы ўдалося павялічыць на 215,2 мільёна долараў ЗША, ці на 5,9 працэнта: іх рост адбываецца, нягледзячы на тое, што попыт на замежную валюту з боку суб'ектаў гаспадарання і насельніцтва таксама вялікі. У выражэнні ж Міжнароднага валютнага фонду, дзе ў адрозненне ад нацыянальнага вызначэння не ўлічваюцца рэзервы ў АКВ, каштоўных металах, якія адрозніваюцца ад манетарнага золата, і каштоўных камянях, рэзервы ўзраслі на 380,8 мільёна долараў, ці на 12,4 працэнта, і склалі 3441,9 мільёна долараў.

Як падкрэсліваюць у Нацбанку, цяперашні памер золатавалютных рэзерваў нашай краіны дазваляе галоўнаму банку краіны забяспечваць стабільнасць дынамікі курсу нацыянальнай валюты ў межах, што вызначаны асноўнымі напрамкамі грашова-крэдытнай палітыкі на гэты год. Нагадаем, што 22 чэрвеня Нацбанк пашырыў прагнозны калідор хістання курса беларускага рубля да кошыка валют да плюс-мінус 10 працэнтаў: дапускаюцца хістанні кошту кошыка валют ад 864 да 1056 рублёў. На сёння курс нацыянальнай валюты да кошыка валют складае Br1003.05. Між іншым, вызначаны сёння Нацбанкам курс беларускага рубля да еўра пераадолеў мяжу ў 4 тысячы рублёў і склаў Br 4016.64 за адзін еўра: у параўнанні з учарашнім курсам ён знізіўся на 0,64 працэнта. Да долара зніжэнне курса рубля склала 0,52 працэнта — курс на 14 ліпеня вызначаны на ўзроўні 2882 рублі за адзін долар. А вось да расійскага рубля наш умацаваўся на 2,59 працэнта — да 87,18 беларускага рубля за 1 долар.

Ігар ШЧУЧЭНКА.

Крымінал, здарэнні

ЛІХІ АБГОН ЗАВЯРШЫЎСЯ ШПІТАЛІЗАЦЫЯЙ

12 ліпеня ў Быхаўскім раёне на шашы каля вёскі Глухская Сяліба аўтамабіль «Таёта РАВ-4» пайшоў на абгон па правай узбочыне. Вадзіцель, 21-гадовы магіляўчанін, з кіраваннем не справіўся, і машына перакулілася. У выніку малады чалавек, які быў за рулём, а таксама і ўсе чатыры пасажыры, шпіталізаваныя з рознымі траўмамі. Сярод апошніх быў і 5-гадовы хлопчык, паведаміла Магілёўская ДАІ.

У гэты ж дзень на Быхаўшчыне адбылося яшчэ адно дарожна-транспартнае здарэнне. У вёсцы В'юн трактар, якім кіраваў 32-гадовы мужчына, наехаў на пешахода. Мужчына, якому было 34 гады, памёр. Дарэчы, абодва ўдзельнікі здарэння на вясковай вуліцы былі прыезджымі людзьмі: трактарам кіраваў жыхар Віцебскай вобласці, а ахвярай стаў жыхар Оршы.

КУПАЛЬСКАЕ ХУЛІГАНСТВА

12 ліпеня Крычаўскі РАУС распачаў крымінальную справу супраць двух школьнікаў. Два вучні 9-га класа, 1993 і 1994 гадоў нараджэння, абвінавачваюцца ў хуліганстве. На Купалле, а менавіта 7 ліпеня на золку, падлеткі на вуліцы Камсамольскай у Крычаве пашкодзілі 10 пралётаў дэкаратыўнай агароджы. У міліцыі лічаць, што народнае свята — гэта адна справа, а хуліганскія памкненні — зусім іншая, крымінальная.

Алена КАЗЛОВА.

ДЭПУТАТ АРЫШТАВАНЫ ПА ПАДАЗРЭННІ Ў АТРЫМАННІ ХАБАРУ

Дэпутат Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў, намеснік старшыні Ліберальна-дэмакратычнай партыі Беларусі Уладзімір Карунас арыштаваны па падазрэнні ў атрыманні хабару ў памеры каля $9 тыс. Пра гэта паведаміў старшы памочнік пракурора Мінска па прававым забеспячэнні, інфармацыі і грамадскіх сувязях Сяргей Балашоў.

6 ліпеня ў дачыненні да Карунаса ўзбуджана крымінальная справа і абрана мера стрымання ў выглядзе ўзяцця пад варту. Цяпер ён знаходзіцца ў СІЗА на вул. Валадарскага ў Мінску. Як патлумачыў Сяргей Балашоў, падзеі, па якіх прад'яўлена абвінавачанне, адбыліся ў перыяд з 2007 па 2009 год. «Гэта працяглае шматэпізоднае злачынства, а не некалькі хабараў», — удакладніў ён.

Кар. БЕЛТА.

СКУТАРЫСТКА НЕ САСТУПІЛА «МЕРСЕДЭСУ»

У Гомельскай вобласці за паўгода павялічылася колькасць дарожна-транспартных здарэнняў з удзелам матацыклістаў.

Сёлета іх зарэгістравана 48 (летась за 6 месяцаў — 34). Больш і пацярпелых. Шэсць у гэтым годзе загінула і 45 паранена. П'янымі матацыклістамі здзейснена 15 ДТЗ. Пры гэтым па віне аматараў хутка і з грукатам рухацца зарэгістравана 38 дарожных здарэнняў, у якіх 6 чалавек загінулі і 35 атрымалі раненні. Супрацоўнікі ўпраўлення ДАІ Гомельскага аблвыканкама прыводзяць прыклады. Так, 26-гадовы мужчына на матацыкле «Хонда» ў Гомелі сутыкнуўся з аўтамабілем «Аўдзі», які рухаўся ў сустрэчным накірунку і паварочваў налева. У выніку ДТЗ праз некалькі гадзін матацыкліст памёр. Не паступіла дарогу «Мерседэсу» 54-гадовая кіроўца скутара, якая выязджала з дачнага кааператыва каля Лоева і сутыкнулася з машынай. У выніку — смерць жанчыны на месцы здарэння. Прама ў дрэвы ўехалі п'яныя кіроўцы матацыклаў у вёсцы Замосце Калінкавіцкага раёна і ў гарадскім пасёлку Акцябрскі. Апошні, 18-гадовы, да таго ж, не меў пасведчання на ваджэнне. Статыстыка сведчыць, што больш за ўсё аварый з вадзіцелямі матацыклаў адбываецца перад выхаднымі або ў выхадныя дні. Менавіта таму цяпер ДАІ праводзіць у Гомельскай вобласці дэкаду ДАІ, накіраваную на прафілактыку дарожна-транспартнага траўматызму сярод матацыклістаў.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

УДАРЫЛА ТОКАМ

На аб'екце «Аквапарк», які знаходзіцца ў кобрынскім парку імя Суворава, праводзяцца электрамантажныя работы, падчас якіх удар токам атрымаў 48-гадовы электрык Пінскага будаўнічага ўпраўлення. Смяротна траўмаванага чалавека выратаваць не ўдалося.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Муз-news

У Мінску пройдзе «Грунвальдскі фэст»

15 ліпеня ў сталічным клубе «Рэактар» трэці год запар пройдзе патрыятычна-музычны фэст, прысвечаны бітве 1410 года, дзе продкі беларусаў, літоўцаў і палякаў перамаглі рыцараў Тэўтонскага ордэна.

«Грунвальдскі фэст» — першы ў Беларусі мілітарыстычны фестываль, прысвечаны гонару і славе ліцвінскай зброі і высакароднаму духу нашых продкаў, — знаёмяць са сваім «дзіцем» арганізатары. — Таму ў музычных стылях удзельнікаў няма абмежаванняў — ад фолку да року. Галоўнае — каб гэтая музыка была заснавана на сярэднявечных і народных беларускіх мелодыях».

Сёлета ўдзел у фэсце возьмуць гурты «Стары Ольса», «Расалія», «Litvintroll», «Рокаш», «Яварына» і іншыя калектывы.

Вера Карэтнікава памяняла пашпарт на аўтограф

Нядаўна спявачка ў складзе беларускай дэлегацыі паехала ў Францыю на здымкі тэлепраекта «Бітва тытанаў» (працяг леташняй «Бітвы гарадоў»). Аднак ужо на беларуска-польскай мяжы ў артысткі раптам без тлумачэння прычын адабралі пашпарт.

«Я спачатку спалохалася, падумала, магчыма, з візай нейкія праблемы, хоць рабілі ўсім разам, — расказвае Вера. — Але потым падышоў памежнік і вярнуў мой пашпарт са словамі: «Вера Уладзіміраўна, можаце прадоўжыць паездку, але толькі пасля таго, як... дасце аўтограф!». Думала, ён жартуе і трэба проста распісацца недзе ў дакументах. Але высветлілася, што гэта сапраўды мой прыхільнік».

Вядучая рубрыкі Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

Папаўненне ў гродзенскіх якаў

Фота Леаніда ШЧАГЛОВА, БЕЛТА.

У Гродзенскім заапарку нарадзіўся як. Работнікі заапарка пакуль не могуць высветліць пол нованароджанага, паколькі мама нікога не падпускае да дзіцяняці. Яна сама абагравае яго і корміць малаком. Гэта ўжо другое дзіцяня дарослай пары дамашніх якаў Чарныша і Гольфы. Акрамя яка ў выхадныя ў заапарку з'явілася на свет дзіцяня ў пары еўрапейскіх ланей.

На здымку: які Чарныш і Гольфа з дзіцем.

Ураджайная Універсіяда

Спорт-тайм

25-я летняя Універсіяда ў Сербіі завяршылася для Беларусі рэкордам па колькасці заваяваных залатых медалёў. Чатыры ўзнагароды вышэйшай пробы — лепшае дасягненне айчынных спартсменаў за час выступлення на студэнцкіх гульнях. Сёлетнія сталі дзявятымі для беларусаў у суверэннай гісторыі.

Усяго ў актыве беларускай каманды 11 медалёў і 12-е месца ў камандным заліку сярод 145 краін. Дзве залатыя ўзнагароды ў скарбонку каманды прынеслі лёгкаатлеты: кідальнік молата Юрый Шаюнаў і дзесяціборац Мікалай Шабянок, яшчэ два залатыя медалі на рахунку плыўчых — рэкорд Універсіяды на 50 м вольным стылем устанавіла Аляксандра Герасіменя, а на 50 м батэрфляем перамогу з нацыянальным рэкордам атрымала Святлана Хахлова.

Сярэбранымі прызёркамі сталі Аляксандра Герасіменя на дыстанцыі 100 м вольным стылем і шабліст Аляксандр Буйкевіч. Бронзу заваявалі штурхальніца ядра Алена Копец, дзюдаіст Яўген Бядулін у вагавой катэгорыі да 100 кг, бягуння Вольга Мініна на дыстанцыі 10 тыс.м, Ігар Расахацкі ў таэквандо ў катэгорыі 84 кг, а таксама Аляксандра Герасіменя ў плаванні на спіне на дыстанцыі 50 м.

Перамогу ў агульнакамандным заліку святкавала зборная Расіі, у актыве якой 76 узнагародаў (27 залатых, 22 сярэбраныя і 27 бронзавых). На другім месцы размясцілася зборная Кітая з 22 залатымі, 21 сярэбраным і 15 бронзавымі медалямі. Замкнула тройку лепшых каманда Паўднёвай Карэі, на рахунку якой 21 залатая, 11 сярэбраных і 15 бронзавых узнагародаў. Знамянальна, што па агульнай колькасці медалёў на другім месцы знаходзяцца японцы, якія 73 разы ўздымаліся на п'едэстал Універсіяды-2009.

Мінск прымае чэмпіянат Еўропы

Учора ў Мінску, Барысаве і Маладзечне стартаваў футбольны чэмпіянат Еўропы сярод дзяўчат да 19 гадоў. Зборная Беларусі настроена змагацца як мінімум за пятае месца, паведаміў галоўны трэнер нашай каманды Дзмітрый Шаўчук. «Зразумела, як і іншыя ўдзельнікі, мы разлічваем трапіць у паўфінал.

Наконт фіналу загадваць не будзем. Задача-мінімум — пятае месца. Мы таксама хочам трапіць на чэмпіянат свету», — адзначыў Шаўчук. Трэнер заявіў, што задаволены падрыхтоўкай да турніру. «Усе лічаць нас загадкавай камандай. Гатоўнасць яе ацэньваю як баявую», — расказаў трэнер. Беларусь дэбютуе на падобных спаборніцтвах упершыню, таму, паводле слоў трэнера, мае намер вучыцца ў моцных і «заявіць пра сябе ў Еўропе». Інфармацыі пра супернікаў няшмат. «Штосьці ёсць, але адкуль — гэта наш сакрэт», — сказаў трэнер гаспадароў.

Трэнеры ўсіх васьмі каманд заяўляюць пра намер змагацца за паўфінал. Большасць з іх фаварытам называе Германію, каманда якой неаднаразова выйгравала чэмпіянат Еўропы ў гэтай узроставай катэгорыі. У папярэднюю групу «А» ўваходзяць Беларусь, Швейцарыя, Францыя і Германія, у групу «В» — Швецыя, Англія, Ісландыя і Нарвегія.

Да Лігі чэмпіёнаў — з чатырнаццаціачковай перавагай

Адбыліся матчы апошняга, 13 тура першага круга чэмпіянату краіны па футболе ў вышэйшай лізе. БАТЭ ў Гомелі разграміў аднайменны клуб (3:0) і напыканцы першага круга інтрыгі вакол сёлетняга чэмпіёна амаль няма. У барысаўскага клуба чатырнаццаць ачкоў адрыву, якія даюць магчымасць спакойна рыхтавацца да старту ў Лізе чэмпіёнаў, які, дарэчы, адбудзецца сёння ў Македоніі, гэта будзе гульня супраць клуба «Скоп'е». У бамбардзірскай гонцы Сяргей Крывец дагнаў Максіма Скавыша, і ў абодвух цяпер па 10 забітых мячоў.

«Мінск» на сваім полі перайграў «Смаргонь» (2:0), якая, здаецца, вырашыла канчаткова замацаваць за сабой падвал турнірнай табліцы. Крыху кур'ёзным голам у вароты дынамаўцаў з Брэста здабыў на сваім полі тры ачкі «Нафтан» (1:0). Першую ў сезоне выязную перамогу святкавала ў гэтыя выхадныя сталічнае «Дынама». З мінімальным лікам (1:0) на магілёўскім стадыёне «Спартак» падапечныя Славаліюба Мусліна перайгралі мясцовы «Днепр». Прычым адзіны гол забіў былы дняпровец Аляксандр Гаўрушка. У Мінску МТЗ-РІПА прымаў «Віцебск» і прайграў 1:2. Госці ў першым тайме мелі перавагу ў два мячы. У другім тайме трактаразаводцы скарацілі разрыў у ліку. Але большага, нягледзячы на прыкметную тэрытарыяльную і гульнявую перавагу, зрабіць не змаглі. Адзначым, што два ўзяцці варот віцябчан арбітр адмяніў. І калі мяч Кварацхелія быў забіты хутчэй за ўсё і сапраўды з афсайду, то аўтагол віцябчан быў «чысты», і чаму яго не залічылі, застаецца загадкай. Гэты эпізод знайшоў адлюстраванне ў пасляматчавым каментарыі галоўнага трэнера МТЗ-РІПА Юрыя Пунтуса, які сказаў, што ў яго проста няма слоў, адны думкі, і калі свой забівае свайму, ніякія відэапаўторы не патрэбныя. Што датычыць арбітраў, то поле яны пакідалі пад аховай міліцыі.

Становішча каманд: БАТЭ — 34 ачкі, «Нафтан» — 22, «Дынама» (Мн) — 22, «Тарпеда» — 22, «Днепр» — 20, «Нёман» — 19, «Дынама» (Бр) — 19, «Мінск» — 18, «Гомель» — 18, «Шахцёр» — 18, МТЗ-РІПА — 14, «Віцебск» — 13, «Граніт» — 12, «Смаргонь» — 5.

Македонцы пераможаныя

Беларусь выйграла матч Кубка Дэвіса ў каманды Македоніі з лікам 4:1 і захавала прапіску ў першай групе Еўра-Афрыканскай зоны. Гэта вырашылася ў апошні гульнявы дзень, калі ў сустрэчы першых ракетак каманд Уладзімір Ігнацік перайграў Дзімітара Грабуловскі — 6:3, 6:1, 6:4. У заключнай сустрэчы, дзе згулялі другія ракеткі, Андрэй Васілеўскі таксама перамог Ілью Марціноскі — 6:4, 6:2. Нагадаем, што ў суботу ў парнай сустрэчы беларусы Максім Мірны і Аляксандр Буры былі мацнейшымі за македонскі дуэт Дзімітар Грабуловскі/Лазар Магдзінчаў.

Фонд «Минскоблгосимущество»

22 июля 2009 года в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5

ПРОВОДИТ ПОВТОРНЫЙ АУКЦИОН

по продаже объектов, находящихся в собственности Логойского района, и права заключения договоров аренды земельных участков, необходимых для их обслуживания, которые составляют единый предмет аукциона

На аукционные торги выставляются:

Лот № 1: Административное здание (инв. № 601/С-14945), расположенное по адресу: Минская область, г. Логойск, ул. Победы, 102, общей площадью 915,4 кв.м, 1978 года постройки. Здание двухэтажное, фундамент – блоки, стены и перегородки кирпичные, перекрытия – железобетонные плиты, крыша совмещенная, рулонная. Имеются инженерные коммуникации. В состав имущества входит асф./бетонная площадка площадью 571 кв.м. Срок аренды земельного участка – 99 лет, площадь – 0,1926 га. **Условия использования земельного участка:** для обслуживания здания.

Начальная цена предмета аукциона, рублей 304 346 562 (в том числе: недвижимое имущество – 293 450 698, право аренды земельного участка – 10 895 864). **Сумма задатка** – 30 000 000 рублей.

Лот № 2: Здание казармы 4/1 (инв. № 601/С-15094), расположенное по адресу: Минская область, г.п. Плещеницы, Военный городок 4, общей площадью 1606,6 кв.м, 1937 года постройки. Здание двухэтажное. Фундамент, стены и перегородки кирпичные, перекрытия – железобетон, крыша совмещенная, рулонная. Имеются инженерные коммуникации. Срок аренды земельного участка – 99 лет, площадь – 0,1089 га. **Условия использования земельного участка:** для обслуживания здания.

Начальная цена предмета аукциона, рублей 294 531 176 (в том числе: недвижимое имущество – 292 824 168, право аренды земельного участка – 1 707 008). **Сумма задатка** – 29 000 000 рублей.

Продавец: Районное унитарное предприятие «Логойский комхоз», расположенное по адресу: Минская область, г. Логойск, ул. Заводская, 36, тел. 8 (01774) 55 4 67. **Арендодатель земельных участков:** Логойский районный исполнительный комитет.

Сумма задатка перечисляется на расчетный счет фонда «Минскоблгосимущество» **№ 3642000000028 в ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Минске, код 795, ул. Мясникова, 32, УНН 100128686.** ***Фотографии продаваемых объектов, а также информация об объявленном аукционе и предмете аукциона дополнительно размещены на официальном сайте:*** **www.minsk-region. gov. by.**

Подробное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 1 апреля 2009 г. № 60.

ПОБЕДИТЕЛЬ ОБЯЗАН:

В течение 10 рабочих дней со дня принятия райисполкомом решения о предоставлении победителю аукциона земельного участка возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, а также расходы, связанные с формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией создания земельного участка; внести плату, взимаемую за право заключения договора аренды земельного участка; после совершения победителем аукциона названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, с ним в установленном порядке Продавцом имущества заключается договор купли-продажи недвижимого имущества, а Арендодателем земельного участка – договор аренды земельного участка; после заключения с райисполкомом договора аренды земельного участка в 2-х месячный срок со дня даты принятия решения о передаче победителю земельного участка осуществить государственную регистрацию права на земельный участок.

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявка (заявление) на участие в нем подана только одним участником, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов. Фонд «Минскоблгосимущество» вправе отказаться от проведения аукциона (продажи конкретного предмета аукциона) в любое время, но не позднее чем за три дня до даты его проведения.

Заявки на участие в аукционе принимаются ежедневно в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 320, тел.: 224-39-76, 500 47 10 .** Последний день подачи заявок **«21» июля 2009 г. до 17.00. Заключительная регистрация участников «22» июля 2009 г. с 11.00 до 11.50.** К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

БУДАЎНІЦТВА АЭС У БЕЛАРУСІ ТРЭБА РАЗГЛЯДАЦЬ ЯК ІНАВАЦЫЙНЫ ПРАЕКТ

У Мінску прайшла II Міжнародная канферэнцыя «Атамная энергія ў XXI стагоддзі». На ёй абмяркоўваліся самыя актуальныя пытанні сучаснага развіцця атамнай энергетыкі: навуковае суправаджэнне развіцця атамнай энергетыкі, бяспека і кантроль радыяцыйнай абстаноўкі, праблемы перапрацоўкі і захавання радыеактыўных адходаў і інш. Асаблівая ўвага надавалася пытанням, звязаным з будаўніцтвам АЭС у Беларусі. Вынікі канферэнцыі былі падведзены на «круглым стале», які прайшоў у Аб'яднаным інстытуце энергетычных і ядзерных праблем — Сосны НАН Беларусі.

Аб магчымым удзеле беларускай прамысловасці ў будаўніцтве АЭС расказаў загадчык лабараторыі інстытута Іван Кулікоў. Паводле яго слоў, задзейнічанне айчынных прадпрыемстваў у згаданым праекце ў перспектыве абумовіць развіццё высокатэхналагічных галін прамысловасці, стварэнне дадатковых працоўных месцаў, далейшы ўдзел беларускіх прадпрыемстваў у рэалізацыі расійскіх маштабных праектаў па будаўніцтве АЭС унутры Расійскай Федэрацыі і за яе межамі, павышэнне інвестыцыйнай актыўнасці і адукацыйнага ўзроўню спецыялістаў, стварэнне новых кірункаў навукі.

Ён падкрэсліў, што падключэнне айчынных прадпрыемстваў да будаўніцтва АЭС дасць магутны імпульс да развіцця высокатэхналагічных вытворчасцяў і прывядзе да памяншэння кошту беларускай АЭС. Ужо вызначаны спіс верагодных кандыдатаў, куды ўвайшлі прадпрыемствы машынабудаўнічага комплексу, прыборабудавання, будаўнічай індустрыі і прадпрыемствы Мінэнерга.

— Атамную станцыю ў Рэспубліцы Беларусь нельга разглядаць толькі як сродак вырашэння энергетычнай праблемы, — заявіў І. Кулікоў. — З улікам таго, што мы абралі інавацыйны шлях развіцця, атамную станцыю трэба разглядаць як інавацыйны праект, які дасць штуршок для развіцця многіх галін нашай прамысловасці. Гэта, як лакамотыў, які пацягне за сабой развіццё новых кірункаў на шляху інавацыйнага развіцця.

Іван Кулікоў акрэсліў і асноўныя праблемы, з якімі давядзецца сутыкнуцца пры прыцягненні айчынных прадпрыемстваў да ўдзелу ў будаўніцтве АЭС. Найперш гэта апераджальнае (да заключэння кантракта на будаўніцтва станцыі) атрыманне адпаведнай тэхнічнай і нарматыўнай дакументацыі, а таксама дазвольных дакументаў на вытворчасць адпаведных відаў абсталявання для АЭС. Другі момант — падрыхтоўка прадпрыемстваў да вытворчасці новага абсталявання і павелічэнне іх наяўных магутнасцяў. Трэці момант, які Кулікоў абазначыў як ключавы, — фінансаванне прадпрыемстваў для рэканструкцыі і ўкаранення новых тэхналогій.

Паводле яго слоў, сёння ў Рэспубліцы Беларусь ёсць дастатковая колькасць машынабудаўнічых, электратэхнічных, прыборабудаўнічых і будаўнічых прадпрыемстваў, здольных выпрабляць канкрэтнае абсталяванне і матэрыялы для будучай атамнай станцыі. Застаецца завяршыць аналіз ступені гатоўнасці прадпрыемстваў, ацаніць іх фінансавы стан, забяспечыць кадрамі.

Мяркуецца, што на будучай беларускай АЭС колькасць запрошаных спецыялістаў не будзе перавышаць 20 працэнтаў працоўнага штату. Пра гэта паведаміў загадчык лабараторыі інстытута Аляксандр Трыфанаў. Ён нагадаў, што для бяспечнага развіцця ядзернай энергетыкі неабходна мець высококваліфікаваны персанал. Каб забяспечыць будучую беларускую АЭС сваімі маладымі кадрамі, летась была прынята адпаведная дзяржаўная праграма. Яна ўключае ўвядзенне ў навучальныя ўстановы новых профільных прадметаў, арганізацыю стажыровак будучых спецыялістаў-атамнікаў за мяжой, а таксама стварэнне навучальных цэнтраў у самой Беларусі. Мяркуецца, што такіх цэнтраў будзе два — адзін пры АЭС, другі — на базе Аб'яднанага інстытута энергетычных і ядзерных праблем — Сосны. Як патлумачыў Аляксандр Трыфанаў, апошні будзе мець камп'ютарныя пакоі, лабараторыі, цэхі. Навучацца тут будзе не толькі кіраўніцкі персанал, але і штат усіх асноўных блокаў, і рамонтная служба.

Ужо створана некалькі сімулятараў — праграм для навучання рознага ўзроўню складанасці. Зараз неабходна падрыхтаваць праграмнае забеспячэнне вучэбнага цэнтра і працягваць далейшую каардынацыю з МАГАТЭ.

Пры праектаванні, будаўніцтве, аналізе эксплуатацыі, ацэнцы бяспекі на АЭС важнае значэнне маюць высокавытворчыя камп'ютарныя тэхналогіі і адпаведнае праграмнае забеспячэнне. У атамнай энергетыцы гэта адзін з магістральных кірункаў развіцця. Як адзначыў загадчык лабараторыі «АІЭЯП — Сосны» Леанід Бабічаў, ставіць эксперыменты на АЭС ніхто не хоча, таму сусветная супольнасць на сёння распрацавала даволі вялікі інструментарый камп'ютарнага мадэлявання і аналізу такіх сітуацый. Як вядома, Рэспубліка Беларусь заўсёды вылучалася выдатнымі работамі ў галіне інфармацыйных тэхналогій. Першы суперкамп'ютар, створаны ў межах праекта Саюзнай дзяржавы — СКІФ-К500, быў пабудаваны менавіта ў Беларусі. Зараз ён перададзены ў «АІЭЯП — Сосны». Яго сістэма і архітэктура дазваляе прымяняць усе найноўшыя методыкі суперкамп'ютарных разлікаў і пры неабходнасці пераносіць іх на больш магутныя машыны. СКІФ-К500 мяркуецца задзейнічаць для правядзення разлікаў бяспекі пры павышэнні эфектыўнасці беларускай АЭС. У перспектыве неабходна стварыць матэматычную мадэль атамнай электрастанцыі. Гэта дазволіць адсочваць усе асноўныя працэсы, што адбываюцца на станцыі, выконваць адпаведныя разлікі і ўносіць карэктывы. Паводле слоў Л. Бабіча, адзін дзень прастою АЭС абыходзіцца ў 1 млн долараў. Калі з дапамогай матэматычнай мадэлі атрымаецца пралічыць найбольш аптымальную схему перагрузак паліва і іншыя велічыні, якія ўплываюць на эфектыўнасць АЭС, гэта дасць адчувальны эканамічны эфект. Акрамя таго, матэматычная мадэль атамнай станцыі павысіць бяспеку АЭС.

Для ўсіх пастаўленых перад інстытутам задач не хопіць інтэлектуальных і вылічальных магчымасцяў. У планах — стварэнне ГРЫД-структуры (аб'яднання інфармацыйных рэсурсаў некалькіх устаноў у адзіную сістэму). У Расіі ўжо ёсць аналагічная ГРЫД-структура, куды ўваходзяць усе асноўныя інстытуты ядзернага профілю. Яна дазваляе з дапамогай абароненых камунікацый абменьвацца вылічальнымі рэсурсамі і функцыяную як адзіная віртуальная арганізацыя. На першым этапе мяркуецца стварэнне аб'яднанай сеткі «АІЭЯП — Сосны» з Аб'яднаным інстытутам праблем інфарматыкі НАН Беларусі і ДБУ, каб адпрацаваць механіку ўзаемадзеяння і прымяняць напрацаваныя сучасныя метады ў

Адкрытае акцыянернае таварыства “Гродзенская тытунёвая фабрыка “Нёман”:

СУСВЕТНЫЯ ТРАДЫЦЫІ ЯКАСЦІ, ПРАВЕРАНЫЯ ЧАСАМ

Айчыннаму флагману тытунёвай галіны – 148 гадоў

Сённяшнія пазіцыі прадпрыемства на беларускім рынку даволі моцныя — прадукцыя ГТФ займае на ім каля 64 працэнтаў. Больш за тое: ААТ «Гродзенская тытунёвая фабрыка «Нёман» наладзіла экспартныя пастаўкі ў суседнюю Літву. Зразумела, што займець выхад у Еўрасаюз — справа даволі няпростая. Хоць, кіруючыся народнай мудрасцю, трэба сказаць: хто шукае — той знаходзіць. Галоўнае, лічыць генеральны дырэктар ААТ ГТФ «Нёман» Юрый ЧАРНЫШОЎ, ніколі не адступаць перад цяжкасцямі, а настойліва ісці наперад.

Даўно прыкмечана, што жыццё — абсалютна непрадказальная рэч. Гэта значыць, што сёння табе можа спадарожнічаць удача і будзе шанцаваць ва ўсім, а заўтра ўсё кардынальна зменіцца ці ўвогуле можа наступіць сусветны эканамічны крызіс. І тады твае вясёлкавыя планы могуць пераўтварыцца ў віртуальную рэальнасць, пасля чаго ўся далейшая эфектыўная дзейнасць будзе пад вялікім пытаннем. У разрэзе такіх жыццёвых законаў можна разглядаць і жыццё-быццё шматлікіх айчынных прадпрыемстваў. Сярод іх — адкрытае акцыянернае таварыства «Гродзенская тытунёвая фабрыка «Нёман».

Сёлета спаўняецца роўна дзесяць гадоў, як на гэтым прадпрыемстве пад патранатам кіраўніка дзяржавы Аляксандра Лукашэнкі пачалася капітальная мадэрнізацыя вытворчасці, якая працягвалася тры гады. У выніку рэканструкцыі была створана прагрэсіўная тытунёвая вытворчасць, укаранёны сучасныя тэхналогіі саусіравання і араматызацыі рэзанага тытуню, новыя тэхналогіі апрацоўкі тытунёвай жылкі і тытуню гатунку Берлей, а таксама ўстаноўлена спадарожнае ім абсталяванне для падрыхтоўкі рэзанага тытуню і вытворчасці цыгарэт. Адпаведна, што пачатак XXI стагоддзя ў біяграфіі ГТФ «Нёман» стаіць асобна, хоць пасля правядзення грандыёзнай рэканструкцыі фабрыцы не ўдалося дасягнуць неабходных абаротаў, каб выйсці з крызісу. Спатрэбілася яшчэ некалькі гадоў, каб прадпрыемства ўздыхнула з верай у светлую будучыню. І гэта адбылося з прыходам цяперашняга генеральнага дырэктара Юрыя ЧАРНЫШОВА.

З таго часу тут не губляюць аптымізму і энтузіязму. У перапляценні з прафесійным майстэрствам працоўнага калектыву і ўменнем кіруючага персаналу належным чынам арганізаваць работу, слова «крызіс» тут разумеюць па-свойму.

Зрэшты, трывалasці і загартаванасці вытворцам прадукцыі з маркай ГТФ «Нёман» не займаць. За свае амаль паўтары сотні гадоў працоўнай біяграфіі «табачка», як яе пяшчотна называюць ў народзе, шмат чаго пабачыла на сваім вяку. Прадпрыемства неаднаразова адчувала на сабе падзенні і ўзлёты. У канцы XIX стагоддзя яна ўваходзіла ў лік вядучых тытунёвых вытворчасцяў не толькі Паўночна-Заходняга краю і Польшчы, але і ўсёй Расійскай імперыі. І гэта нягледзячы на тое, што канец XIX—пачатак XX стагоддзя звязаны са з'яўленнем у Беларусі мноства тытунёвых фабрык. У часы Савецкага Саюза прадпрыемства лічылася флагманам тытунёвай галіны і ўваходзіла ў тройку найбуйнейшых вытворцаў цыгарэт і папярос у СССР.

Лінія аўтаматычнай упакоўкі прадукцыі. За дзейнасцю механізмаў сочыць машыніст Аляксей ПІЦКО.

Сённяшні поспех ГТФ «Нёман» — гэта высокі прафесійны ўзровень кіраўніцтва прадпрыемства, вялікая працаздольнасць калектыву, мадэрнізацыя вытворчасці.

Імпартазамяшчэнню — шырокую дарогу ў рамках дзяржаўнай праграмы

Улічваючы агульнасусветныя тэндэнцыі развіцця рынку, якія характарызуюцца павелічэннем попыту на больш бяспечную прадукцыю, ГТФ «Нёман» паставіла перад сабой задачу па задавальненні патрэбаў пакупнікоў праз выпуск высакаякаснай імпартазамяшчальнай прадукцыі.

На прадпрыемстве цалкам выконваецца дзяржаўная праграма імпартазамяшчэння, якая працягваецца. Яе вынікам павінна стаць пранікненне прадукцыі з маркай ГТФ «Нёман» на беларускі рынак на 60—65 працэнтаў.

ГТФ «Нёман» не толькі пацвярджае статус вытворцы высакаякаснай прадукцыі, але і строга прытрымліваецца зацверджанай стратэгіі, выконвае даручэнні кіраўніка дзяржавы і Урада Беларусі па рэалізацыі праграмы імпартазамяшчэння, апраўдваючы тую падтрымку, якая аказваецца ГТФ «Нёман» кіраўніцтвам дзяржавы.

- Сёння ГТФ «Нёман» працуе з поўнай загрузкай і забяспечвае работай звыш 1000 чалавек, якія маюць значны вопыт працы ў тытунёвай прамысловасці. У тым ліку кіруючы састаў — з лепшых айчынных кіраўнікоў.
- Сярэдні заробак на ААТ ГТФ «Нёман» адзін з самых высокіх у Гродзенскім рэгіёне.
- Удалае і гарманічнае спалучэнне традыцый, прафесійнага майстэрства кадраў і найноўшых тэхналогій сталі надзейнымі спадарожнікамі ГТФ на шляху да свайго пакупніка.

ЯКАСЦЬ — КЛЮЧ ДА КАНКУРЭНТАЗДОЛЬНАСЦІ І РОСКВІТУ ПРАДПРЫЕМСТВА.

Якасць — перш за ўсё

На фабрыцы лічаць, што сучасны тытунёвы рынак патрабуе вытворчасці сучасных цыгарэт, якія прыносілі б найменшую шкоду здароўю чалавека, які, на жаль, далёка не заўсёды задумваецца, што курыць. Таму ў плане якасці на ГТФ зроблена вельмі шмат. Адным з немалаважных фактараў, якія пацвярджаюць высокую якасць выпускаемай прадукцыі, з'яўляецца атрыманне фабрыкай першага ў тытунёвай галіне сертыфікату на адпаведнасць сістэмы менеджменту якасці міжнародным стандартам СТБ ISO 9001-2001.

Сучасны тытунёвы рынак адэкватна рэагуе толькі на якасную прадукцыю. Асноўны паказчык якасці — попыт. Для дасягнення гэтай мэты на ГТФ праводзіцца сур'ёзная работа па распрацоўцы асартыментнай палітыкі ў рэчышчы агульнасусветных тэндэнцый рынку. Вядома, што для яго характэрнае павелічэнне прапановы на прадукцыю з паніжаным утрыманнем шкодных рэчываў. Цяпер з мэтай зніжэння шкодных рэчываў фабрыка ўдасканаліла сваю вытворчасць. Такая аперацыя абышлася прадпрыемству ў 300 тысяч еўра. Праўда, дзякуючы такому захаду будуць выкананы патрабаванні Еўрапейскай канвенцыі па барацьбе з курэннем. Акрамя таго, закуплена абсталяванне, якое вызначае паказчык чаднага газу (СО) у прадукцыі. І яшчэ: для дасягнення максімальна магчымых патрэбаў спажыўцоў, падтрымання пастаяннага высокага ўзроўню якасці выпускаемай на фабрыцы прадукцыі ва ўсіх абласных цэнтрах створаны грамадскія дэгустацыйныя камісіі. За якасцю вырабаў строга сочаць і на самім прадпрыемстве: ёсць дэгустацыйная група, якая складаецца з галоўных спецыялістаў.

Навінкі ўласнай вытворчасці — «Фэст», VIP, «Minsk Superslims», «Queen Superslims» «Queen Elite»

На ГТФ «Нёман» штодня эксперыментуюць над выпускам новых марак уласных цыгарэт. Работа гэта, гаворыць Юрый Чарнышоў, надзвычай сур'ёзная, адказная і карпатлівая. Кіраўніцтва прадпрыемства лічыць, што такі ход з новымі назвамі цыгарэт, створаных на аснове натуральных кампанентаў і з мінімальным утрыманнем нікаціну, шкодных смол і СО пашырыць кола прыхільнікаў прадукцыі з маркай ГТФ «Нёман».

НАШЫ ПАСТАЎШЧЫКІ

ГТФ «Нёман» закупляе высакаякасную сыравіну і матэрыялы для вырабу тытунёвай прадукцыі за мяжой. Тытунь пастаўляецца больш чым з 20 краін свету, сярод якіх Індыя, Грэцыя, Бразілія, Кітай, Аргенціна, Інданезія, Калумбія, Балгарыя, Іран, Паўднёва-Афрыканская Рэспубліка, Ліван, Зімбабве, Малдова, Азербайджан, Балгарыя, Турцыя. Пастаўкі матэрыялаў ідуць з Германіі, Францыі, Фінляндыі, Літвы, Славеніі, Расіі, Балгарыі, Аўстрыі, Кітая.

Праўда, ГТФ «Нёман» цяпер актыўна супрацоўнічае і з айчыннымі пастаўшчыкамі. Сёння для прадпрыемства працуе звыш дзясятка беларускіх партнёраў. Такое супрацоўніцтва для ГТФ выгаднае.

Дзень сённяшні

Рэаліі сённяшняга дня дыктуюць вытворцам любой прадукцыі свае ўмовы. У разрэзе сусветнага эканамічнага крызісу вытворчасць і рэалізацыя тавару тым больш павінны быць як адзінае цэлае, інакш любое прадпрыемства чакае няўдача.

На ГТФ «Нёман» выдатна знаёмыя з законамі і метадамі паспяховага бізнэсу і прымяняюць сваё ўменне на справе. Напрыклад, не мець вялікіх складскіх запасаў, а прыкладаць максімум намаганняў для павелічэння продажаў сваёй прадукцыі. Як вынік, за 6 месяцаў 2009 года аб'ём паставак прадукцыі, у тым ліку і кантрактнай з маркай «Брыціш Амерыкан Табако», на ўнутраны рынак значна вырас. І гэта нягледзячы на агульнае змяншэнне даходаў у насельніцтва. Пры гэтым на прадпрыемстве за першае паўгоддзе ўкладзена ў вытворчасць і мадэрнізацыю абсталявання ўласных інвестыцый больш за 22 мільярды рублёў.

Агульная сума надзённых падаткаў, якую заплаціла ГТФ «Нёман» у дзяржаўны бюджэт, за 2008 год склала 119 мільярдаў рублёў. Сёлета гэты паказчык павінен быць перакрыты.

На ўсіх стадыях тэхналагічных працэсаў праводзіцца пастаянны кантроль якасці паўфабрыкатаў і гатовай прадукцыі.

Дасканалае камп'ютарызаванае абсталяванне выдатна ўпісалася на вытворчых тэрыторыях. Згадзіцеся, што такі сучасны цэх спрыяе прэстыжу не толькі фабрыкі, але і ўсёй галіны. Працаваць на новым абсталяванні даручана самым дасведчаным работнікам — маладому спецыялісту, машыністу-рэгуліроўшчыку Юрыю ЯКУБА і машыністу Таццяне АРЫСТАРХАВАЙ.

З гісторыі курэння тытуню

- 6000 гадоў да нашай эры. Па ацэнках экспертаў, тытунёвы куст поўнасцю сфарміраваўся і прыняў цяперашні выгляд.
- 600—1000 гг. да н.э. Гватэмала. Першае графічнае выяўленне курыльшчыка. Знойдзены гліняны посуд, на якім намаляваны індзеец мая, які курыць скручаныя лісты тытуню, перацягнутыя ніткай. Курэнне індзейцы Мая называлі сік'ар.
- 15 кастрычніка 1492 года тытунь быў прапанаваны Хрыстафору Калумбу амерыканскімі індзейцамі як падарунак.
- 1497 год. Роберт Пэйн, спадарожнік Калумба ў другім падарожжы 1493 года, піша сваю першую справаздачу аб тытуні і яго выкарыстанні.
- 1519 год. Мексіка. Картэз заваёўвае сталіцу ацтэкаў і сустракае там людзей, якія курылі прататыпы нашых цыгарэт.
- 1531 год. Санта-Дамінга. Пачынаецца еўрапейская культывацыя тытуню.
- 1558 год. Першае з'яўленне тытуню ў Партугаліі.
- 1559 год. Першае з'яўленне тытуню ў Іспаніі.
- 1633 год. Масачусет (ЗША). Забараняецца публічнае курэнне тытуню.
- 1634 год. Расія. Цар Аляксей уводзіць пакаранне за курэнне. Першае парушэнне — порка, вырыванне ноздраў і ссылка ў Сібір, другое — смяротная казнь.
- 1847 год. Англія. Філіп Морыс адкрывае сваю першую тытунёвую краму, у якой прадаюцца турэцкія цыгарэты ручной скруткі.
- 1854 год. Англія. Уладальнік лонданскай тытунёвай крамы Філіп Морыс пачынае вырабляць свае ўласныя цыгарэты.
- 1861 год. Па просьбе Лейбы Шарашэўскага створана Гродзенкая тытунёвая фабрыка.

Адкрытае акцыянернае таварыства «Гродзенская тытунёвая фабрыка «Нёман» наладзіла экспартныя пастаўкі ў Літву

З гісторыі прадпрыемства

Архіўныя матэрыялы сведчаць, што 17 ліпеня 1861 года Гродзенскім губернскім праўленнем разбіралася прашэнне купцоў Адама Гардона і Лейбы Шарашэўскага аб дазволе адкрыць у Гродне тытунёвую фабрыку. Просьба апошняга была задаволена.

Фабрычны бізнэс Шарашэўскіх практычна стаў веснікам некалькіх вядомых цяпер на Захадзе фірмаў. У 1847 годзе была заснавана кампанія «Philip Morris», якая спецыялізавалася напачатку на цыгарэтах ручной скруткі з турэцкага тытуню. У 1849 годзе ў Сент-Луісе заснавана кампанія «J.E.Liggett and Brother», а ў 1850 годзе ў Яраслаўлі (Расія) утворана тытунёвая фабрыка «Балканская зорка».

Станаўленне і росквіт прадпрыемства звязаны з імем яго ўладальніка Іоселя Шарашэўскага. Атрымаўшы ў спадчыну ў 1880 гадах невялікую вытворчасць ад свайго бацькі Лейбы, ён, дзякуючы сваім адмысловым прадпрымальніцкім здольнасцям, вывеў гродзенскую фабрыку ў лік вядучых тытунёвых вытворчасцяў не толькі Паўночна-Заходняга краю і Польшчы, але і Расійскай імперыі. Надалей ён першы і адзіны наладзіў вытворчасць папярос.

Высокія патрабаванні да якасці прадукцыі былі характэрны для купцоў Шарашэўскіх, бо надпісы на іх сведчылі: «Якасць супраць ранейшага значна палепшана». Прадукцыя фабрыкі была шырока вядома як у Расійскай імперыі, так і за яе межамі. Фабрыка мела таварны знак, зацверджаны ўрадам Расіі, і выпускала курыцельны тытунь, папяросы, цыгары і махорку.

За адносна кароткі час прадукцыя гродзенскага прадпрыемства змагла заваяваць вялікую папулярнасць у свеце курыльшчыкаў. У 1882 годзе на прамысловай выставе ў Маскве папяросы Гродзенскай тытунёвай фабрыкі былі ўдастоены медаля Аляксандра Імператара Усерасійскага. «Серабро» было заваявана праз два гады ў Амстэрдаме і Новым Арлеане. А крыху пазней — і ў Парыжы.

Беларускі перыяд

Пасля аб'яднання Заходняй Беларусі з СССР у 1939 годзе пачалася рэканструкцыя прадпрыемства, аднак у пачатку Вялікай Айчыннай вайны фабрыка была практычна поўнасцю разбурана. Аднаўленне яе пачалося толькі пасля 1945 года.

У 1964 годзе ў Беларусі створана вытворчае аб'яднанне «Нёман», і гродзенская тытунёвая фабрыка стала галаўным прадпрыемствам аб'яднання. У часы Савецкага Саюза фабрыка паўнапраўна лічылася флагманам айчыннай вытворчасці цыгарэт і папярос, уваходзіла ў тройку найбуйнейшых вытворчасцяў гэтага віду прадукцыі ў краіне.

29 снежня 2000 года ГТФ «Нёман» была зарэгістравана Гродзенскім выканаўчым камітэтам, як «Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Гродзенская тытунёвая фабрыка «Нёман».

З 2007 года — ГТФ «Нёман» з'яўляецца адкрытым акцыянерным таварыствам, 100 % акцый з'яўляюцца дзяржаўнымі.

— Высакаякасны тавар павінен мець такую ж высакаякасную ўпакоўку, — сказала машыніст упакоўкі Вольга РУСЕЛІК, дэманструючы перад аб'ектывам, як аўтаматы «апранаюць» прадукцыю ў прывабныя пачкі.

ААТ ГТФ «Нёман» — гэта:

- шырокі асартымент прадукцыі;
- высокая якасць;
- зручныя ўмовы для заключэння дагавораў.

Запрашаем да супрацоўніцтва!

Наш адрас:
Рэспубліка Беларусь, 230771, г. Гродна, вул. Арджанікідзе, 18
www.tabak.by
e-mail:info@tabak.by

Аддзел маркетынгу:
Тэл.:+375-152-522-074; 522-076.
Тэл/факс: +375-152-522-075.

Аддзел рэалізацыі:
Тэл.:+375-152-525-206; 524-952.
Тэл/факс:+375-152-541-974

Матэрыялы інфармацыйнай старонкі падрыхтаваў Уладзімір ЗДАНОВІЧ, фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

— Ад добрага настрою ў значнай меры залежыць выніковасць працы, — слушна сцвярджае таваразнаўца аддзела рэалізацыі Вольга КЛАЧКО. Не толькі настрою, але і добраму самаадчуванню спрыяе стракатае жывое ўпрыгажэнне вытворчых тэрыторый: кветкі ў цэхах і аддзелах, маляўнічыя клумбы ў дварах.

Зараз адкрытае акцыянернае таварыства «Гродзенская тытунёвая фабрыка «Нёман» развіваецца як стабільнае і дынамічнае прадпрыемства, мае на мэце асваенне ўсё новых рынкаў і пашырэнне наменклатуры выпускаемай прадукцыі.

Новую прадукцыю — на новым абсталяванні

На ААТ ГТФ «Нёман» выдатна разумеюць: для таго, каб паляпшаць якасць сваёй прадукцыі, неабходна замяняць старое абсталяванне на новае, высокапрадукцыйнае, якое да таго ж дазваляе зменшыць расход электраэнергіі на вытворчасці. У 2007—2009 гадах ГТФ «Нёман» набыта сучаснае абсталяванне з выкарыстаннем інавацыйных тэхналогій — 3 цыгарэтна-ўпаковачныя лініі, у тым ліку 1 італьянская лінія G.D 2006 года выпуску (кошт 4,5 мільёна еўра, магутнасць 1,39 млрд штук адзінак прадукцыі ў год). Апошняй знакавай падзеяй у жыцці гродзенскай «табачкі» можна лічыць закупку ў межах трэцяга этапу рэканструкцыі па замежнай крэдытнай лініі новага абсталявання (2 лініі) германскай вытворчасці HAUNI-FOCKE агульным коштам 10,1 мільёна еўра, магутнасць — 2,85 млрд штук адзінак прадукцыі у год. Можна смела сцвярджаць, што цяпер збыліся самыя смелыя планы прадпрыемства па набыцці цыгарэтна-ўпаковачнай машыны для вытворчасці прадукцыі фармату «Супер Слім» высокага і сярэдняга цэнавага сегмента як па кантрактнай вытворчасці з сусветнавядомымі кампаніямі, так і сваіх марак, якія дагэтуль пастаўляліся ў нашу краіну выключна па імпарце. Аналагаў такога абсталявання ў Беларусі няма.

Цяпер па тэхнічна-тэхналагічным аснашчэнні ГТФ «Нёман» наўрад ці саступіць расійскім альбо ўкраінскім вытворцам тытунёвай прадукцыі, у тым ліку і па кантрактнай вытворчасці.

У адкрытым акцыянерным таварыстве «Гродзенская тытунёвая фабрыка «Нёман» лічаць, што новае абсталяванне акупіцца за 3-4 гады

Задавальненне спажыўца — найважнейшы кірунак работы па павышэнні якасці і асноўная мэта фабрыкі

Кантралёр Людміла ХАРТОЎСКАЯ (на здымку зверху) карыстаецца на сваім працоўным месцы самым сучасным абсталяваннем. Высокая якасць прадукцыі забяспечваецца не толькі надзейным кантролем, але і планамерным абнаўленнем абсталявання. Так, напрыклад, у вытворчы працэс нядаўна паспяхова ўкаранілі тэхніку вядомай маркі «HAUNI». Каля сучаснага абсталявання фотааб'ектыў убачыў машыніста Алу ЛЕСІНУ.

Вакансій у Беларусі на 9,1 % больш, чым беспрацоўных

Пра гэта паведамілі ў галоўным упраўленні палітыкі занятасці і народанасельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны.

Заяўленая наймальнікамі патрэбнасць у кадрах перавысіла 45,5 тыс., а статус беспрацоўнага мелі 41,7 тыс. жыхароў краіны. Такім чынам, магчымасць умоўнага працаўладкавання беспрацоўных на вакансіі раўняецца на 1 ліпеня гэтага года 109,1 % (для параўнання: на 1 чэрвеня — 104,2 %, а год таму гэты паказчык быў 160,9 %).

На рынку працы рэспублікі па-ранейшаму адчуваецца структурны дысбаланс попыту і прапанавання рабочай сілы (73,4 % вакансій — па рабочых спецыяльнасцях), значны і тэрытарыяльны дысбаланс.

Практычна кожная трэцяя вакансія з агульнарэспубліканскага банка звестак — у Мінску (15,7 тыс.). Пры гэтым свабодных працоўных месцаў у сталіцы ў 3,5 раза больш, чым беспрацоўных. У Мінскай вобласці колькасць вакансій таксама перавышае колькасць беспрацоўных (на 970). А ў астатніх рэгіёнах краіны попыт на рабочую сілу меншы, чым яе прапанаванне.

Як ужо паведамлялася, сярод самых запатрабаваных спецыялістаў — муляр, страхар, абліцоўшчык-плітачнік, цясляр, тынкоўшчык, вадзіцель, машыніст бульдозера, экскаватара і г.д. Карыстаюцца попытам урачы, інжынеры розных профіляў. У сельскай мясцовасці асабліва запатрабаваныя аператары машыннага даення, жывёлаводы, механізатары, ветурачы і інш. У той жа час назіраецца лішак кадраў па некалькіх прафесіях і спецыяльнасцях (бухгалтар, эканаміст, юрыст, педагог і г.д.).

Варта адзначыць, што колькасць вакансій пачала зніжацца ў цэлым па рэспубліцы яшчэ ў кастрычніку мінулага года (да гэтага на працягу некалькіх гадоў патрэбнасць у кадрах расла). У студзені—красавіку гэтага года працэс працягваўся. Як вынік, у сярэдзіне сакавіка колькасць беспрацоўных упершыню перавысіла колькасць вакансій. Аднак у маі сітуацыя змянілася ў пазітыўны бок: павышэнне патрэбнасці ў рабочай сіле пацягнула павелічэнне колькасці вакансій у банку звестак дзяржаўнай службы занятасці. І гэты працэс працягваецца.

У Мінпрацы і сацабароны адзначылі, што пастаянна актуалізуецца аўтаматызаваная інфармацыйная сістэма «Агульнарэспубліканскі банк вакансій», забяспечаны свабодны доступ да яго ўсіх грамадзян, якія хочуць працаўладкавацца або памяняць месца працы. Гэта садзейнічае стварэнню спрыяльных умоў для павышэння працоўнай мабільнасці насельніцтва.

Алена ПРУС, БЕЛТА.

ПРА СУД БОСКІ І ЛЮДСКІ

У царкве Пакрова Божай Маці прайшла прэзентацыя кнігі «Біблія аб правасуддзі, праве, маралі». Укладальнікам кнігі выступіў заслужаны юрыст Беларусі, прафесар, доктар юрыдычных навук, Старшыня Вышэйшага Гаспадарчага Суда Рэспублікі Беларусь Віктар Камянкоў. Кніга выдадзена ТАА «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» пры ўдзеле рэдакцыі часопіса «Юрыст».

На прэзентацыі прысутнічалі Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі Філарэт, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі, старшыня Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь П. Міклашэвіч, старшыня Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь В. Сукала, намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь В. Міцкевіч, кіраўнікі іншых дзяржаўных органаў, рэктары вядучых ВНУ рэспублікі.

Кніга «Біблія аб правасуддзі, праве, маралі» — свайго роду анталогія біблейскіх апавяданняў на тэму права. Як піша аб ёй сам укладальнік, «гэта спроба паглядзець на сучаснае права, правасуддзе і мараль праз прызму Закона Божага». Аднак змест, характар і структура анталогіі такія, што яна ўспрымаецца не толькі як звод «падказак», так неабходных у складаных жыццёвых сітуацыях, але, у першую чаргу, як апалогія Божых законаў, паколькі менавіта яны, як паказана ў кнізе, з'яўляюцца асновай права, крыніцай правасуддзя, крытэрыем маралі і, значыць, — умовай культурнага і матэрыяльнага працвітання народа.

Для зручнасці карыстання ўкладальнік класіфікаваў біблейскія прававыя прэцэдэнты, вылучыўшы сем вялікіх раздзелаў, якія адпавядаюць асноўным галінам сучаснага права.

У прадмове прадстаўлена цікавая спроба параўнання некаторых нормаў дзейнага заканадаўства Беларусі з біблейскімі прававымі рэкамендацыямі і запаветамі ў сферы дзяржаўнай улады, прынцыпаў пакарання, пытанняў грамадзянскага і гаспадарчага права, падаткаабкладання, сямейнага заканадаўства. Свядомая адмова ўкладальніка ад каментарыя свяшчэнных тэкстаў і тым самым навязвання чытачу свайго бачання і разумення выкладзеных у іх сітуацый дае чытачу поўную свабоду інтэрпрэтацыі і разам з тым прымушае да напружанага пошуку тых сэнсаў, якія адкрываюцца кожнаму «ў яго меру» (Еф.4:16).

Алена ДЗЕВОЙНА.

ЦУКАР ЗАМЕСТ НАРКОТЫКУ

не ад вялікага гуманізму прапанаваў сваім «клієнтам» у Калінкавіцкім раёне раней несудзімы 22-гадовы грамадзянін. Так ён рабіў не заўсёды, а ў выпадках, калі лічыў, што наркаман «пад дозай» не зможа адрозніць гэтыя рэчывы. Вось і каля крамы «Спадарожнік» у Калінкавічах ён збыў грамадзяніну, які шукаў амфетамін, парашок белага колеру за 115 тысяч беларускіх рублёў. Як расказаў начальнік упраўлення па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі УУС Гомельскага аблвыканкама Юрый Маркевіч, экспертыза выявіла, што набыты парашок — бясшкодная глюкоза. Затрыманы, які не толькі гандляваў наркотыкамі, але і займаўся ашуканствам, зараз абвінавачваецца і ў збыце забаронена атруты, і ў махлярстве.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ШАХМАТЫ

Пад рэдакцыяй майстра спорту Уладзіміра СЫЧОВА

МАСАВЫ КОНКУРС РАШЭННЯЎ
Заданне № 23



Белыя: Крa4, Фc7, Сg8. (3).
Чорныя: Крb1, Фh1, Сe3. п. b4 (4)
Выйгрыш. (5 ачкоў)
Заданне № 24

Белыя: Крf8, пп: d6. g6. g7. h7 (5).
Чорныя: Крd8, Фa5, Кg5. пп: b7, c5, d7, f7, g2 (8)
Нічыя. (5 ачкоў)
На рашэнне заданняў даецца 15 дзён.

ПРАВЕРЦЕ СВАЕ РАШЭННІ

Змяшчаем рашэнні заданняў №№ 17 і 18 масавага конкурсу рашэнняў, апублікаваных 9.06. г.г.

Заданне № 17. М. Рэзвоў.

1. Крf1 g3 2. Кf2+ gf 3. Се4 Ле5 4. Сb7! Лb5 5. Л:b3+ Л:b7 6. Л:b7 Kb6! 7. Кр:f2 a2 8. Ла7 Кd5 9. Л:a2 Ке3 10. Ла1+ Кf1 11. Л:f1x.

Заданне № 18 Л. Тапко.

1. е8Ф Ле3+ 2. Ф:e3 С:d1 3. Крf1! de 4. Кf2+ Крh2 5. K:g4+! Крg3 6. K:e3 Cd~ 7. Кf5+ і нічыя.

ПРЫЗВАННЕ

Споўнілася 60 гадоў вядомаму беларускаму міжнароднаму гросмайстру Віктару Давыдавічу Купрэйчыку (р. 3.7.1949 г. Мінск). Журналіст. Ён неаднаразовы чэмпіён рэспублікі, пераможца шматлікіх міжнародных турніраў. Удзельнік сямі чэмпіянатаў СССР В. Купрэйчык — «шахматист яркого комбинационного стиля, отличающийся богатой фантазией, отсутствием какого-либо шаблона, всегда готовый идти на риск» (А. Суэтин).

Імяніннік сустракае свой юбілей поўным сілаў і творчых задум. Пажадаем Віктару Давыдавічу моцнага здароўя і новых творчых поспехаў.

Прыводзім адну яго славутую партыю, згуляную ў 1981 годзе на чэмпіянаце СССР.

Г. Агзамаў — В. Купрэйчык

1. d4 Kf6 2. c4 g6 3. Kc3 Cg7 4. e4 d6 5. Ce2 o-o 6. Cg5 Kbd 7 7. Фd2 e5 8. d5 Kc5 9. f3 Cd7 10. h4 Фe8 11. g4 h5 12. o-o-o hg 13. C:f6 C:f6 14. fg Фd8 15. Фe1 Cg7 16. Kh3 f5 17. ef gf 18. g5 b5 19. cb a6 20. b4 ab 21. bc b4 22. Kb1 Л:a2 23. Cc4 Ла5 24. c6 Фb8 25. Фe2 b3 26. cd Фb4 27. Лd2 e4 28. Kf4 Ла1 29. Лh3 Cc3 30. C:b3 C:d2+ 31 Ф:d2 Л:b1+ 32. Кр:b1 Ф:d2 33. Ke6 Лb8 34. d8Ф+ Л:d8 35. K:d8 e3 36. Ke6 e2 37. Лh1 f4 і белыя здаліся.

На свае вочы

ЗА «ФІРМОЙ» У ПОЛЬШЧУ

Паехаўшы па пакупкі ў суседнюю Польшчу, карэспандэнт «Звязды» прайшоўся па тамтэйшых крамах і добра зэканоміў. У гэтым матэрыяле расказана пра польскі шопінг і пра смешныя кошты на фірмовыя рэчы, якія ў нас камерсанты з помпай прадаюць у дарагіх буціках.

Тым, хто захоча модна і танна апрануцца ў Польшчы, пачаць даведацца з атрымання візы. Дзякуй нябёсам, турыстычную шэнгенвізу я зрабіў без праблем. Хоць і давялося пастаяць у чэргах, пабегаць у польскае консульства і выкласці 60 еўра.

Калі радня і сябры даведаліся пра мой ваяж у Варшаву, то кожны звярнуўся з парадамі і сваімі замовамі.

— Сынок, абавязкова прывязі макарону, парашкі і вадкасць для паласкання бялізны, — загадвала матуля. — Сасісак прыхапі, яны там танныя і смачныя.

— Нам прывязі памперсаў, а то паўзаробку з'ядаюць, — замовіў сябар Дзіма тавар для свайго паўгадовага сыночка.

— Зайдзі ў краму з насеннем, — звярнулася суседка па лецішчы Пятроўна. — Знайдзі якіх арыгінальных цюльпанаў, агуркоў, памідораў.

— Лялечку прывязі, маленькую, як з мульціка, — зайшла перад ад'ездам у госці шасцігадовая пляменніца Сафійка.

У бацькоў я пазычыў пузатую валізу, сабраў майкі-шкарпэткі і накіраваўся на чыгуначны вакзал.

Найтанней даехаць з Мінска да Варшавы можна рэйсавым аўтобусам. Дарога ў два бакі абыдзецца тысяч у 160 беларускіх рублёў. Ды ходзіць транспарт не кожны дзень. У гэтым плане жыхарам Брэста і Гродна лягчэй — ім да Польшчы хоць на сабаку едзь, усё адно побач.

На аўтобус я не паспяваў, а каб зэканоміць грошы на падарожжы цягніком, спачатку даехаў у плацкарце да Брэста (17500 рублёў), потым прайшоў мяжу і перасеў на цягнік Мінск—Варшава (105 тысяч). Такім чынам, дарога абышлася ў 123,5 тысячы рублёў. Дарэчы, прамы білет Мінск—Варшава каштуе пад 200 тысяч рублёў.

«Курча, якія ў вас танныя папяросы»

У маім купэ ехалі паляк і маладыя беларус са стыльнай казлінай бародкай. Зямляк Вова паведаміў, што едзе ў Варшаву па канадскую візу. Паляк Мацэк сказаў, што ён з саліднай фірмы, супрацоўнічае з беларускімі малочнымі заводамі.

— Курча, якія танныя ў Беларусі цыгарэты, — пачаў журыцца Мацэк, дапіваючы другую бутэльку беларускага піва. — Сам вязу кантрабанду, распіхаў па кішэнях цэлы блок. На мяжы правяраюць рэдка. А як спытаюцца нашы паны, што вязеш, спакойна кажы: «жэчы особістэ».

Адзінае, што здзівіла, — морапрадукты ў Польшчы ўдвая даражэйшыя за тыя, што прадаюцца ў нас.

І сапраўды, як па плане, суровы польскі пан-мытнік спытаўся ў мяне:

— Чы везеш вудку і папяросы?

Суровы праверыў менавіта маю паўпустую пузатую валізу, а кантрабанда Мацэка засталася незаўважаная. Пан-памежнік паставіў дазвольны штамп у пашпарце — і я ў Еўрасаюзе.

За начной размовай пра беларускіх і польскіх паненак даехалі да Варшавы.

Я здаў валізу ў камеру захоўвання, разгарнуў карту і пайшоў на экскурсію па рынках і гандлёвых цэнтрах.

Ад фірмовых тавараў разбягаліся вочы

Самому арыентавацца ў пакручыстай Варшаве няпроста — чорт нагу зломіць. Да мяне далучыўся польскі калега-журналіст Міхал і наладзіў экскурсію па буйных гандлёвых цэнтрах.

Высветлілася, што рэчавыя рынкі для сучаснага еўрапейца — справа мінулых дзён.

Гандлёвыя пункты знакамітага варшаўскага стадыёна, які ў дзевяностых апранаў палову Беларусі, сёння ўвогуле збіраюцца пазачыняць. А саму арэну чакае рэканструкцыя перад чэмпіянатам Еўропы па футболе 2012 года.

На астатніх польскіх базарчыках, якіх нямала ў кожным спальным раёне, у асноўным гандлююць прадуктамі сельскай гаспадаркі. А звычайны варшаўскі спажывец апранаецца ў велізарных цэнтрах кшталту «Аркадыі», куды мяне найперш прывёз Міхал. Цэнтр уразіў сваімі фантастычнымі габарытамі. У яго, напэўна, улезлі б усе мінскія гіпермаркеты — «Карона», «Прастор», «Гіпа», «Бігз», і яшчэ засталося б месца на невялікі аэрадром. Цэнтры кшталту «Аркадыі» змяшчаюць у сабе вялікі супермаркет з прадуктамі, некалькі соцень фірмовых крамаў з адзеннем, аксесуарамі, бытавой тэхнікай, дзясяткі разнастайных кавярняў — ад амерыканскіх да японскіх, кінатэатр, тэлестудыі і іншыя прыбамбасы. Прасцей кажучы, правесці ў Аркадыі можна цэлы дзень, а кошты там разліччаныя на рознага спажыўца. На месцы ёсць абменнікі і некалькі прыбіральняў.

Прынята лічыць, што месяцы сезонных зніжак у Польшчы — гэта ліпень і студзень. Называецца гэта «пшэцэнай». Але насамрэч круглы год у фірмовых крамах можна натрапіць на зніжкі. Цвёрды кошт зазвычай трымаецца толькі на бялізну і шкарпэткі.

— Бо пшэцэна, як добры каньяк, — навучае мяне мастацтву шопінгу спрактыкаваны Міхал. — Чым даўжэй фірмовая рэч паляжыць на прылаўку, тым больш спакуслівай робіцца цана.

У першую чаргу мяне, маладога кавалера, цікавілі фірмовыя рэчы, а не макарона з насеннем. А крамаў наварочаных у гандлёвым цэнтры — як жаб у сажалцы. Ад фірмовых тавараў разбягаліся вочы.

— Толькі не давай слабіны, — працягваў навучаць Міхал, — не кідайся на ўсе прапановы, не траць грошы, а грунтоўна, гадзіны тры пахадзі па паверхах, пазнаёмся з асартыментам.

У выніку, добра патаптаўшы ногі, нагледзеўшы для сябе тавары, я прыступіў да пакупак.

«Затое ў нас кватэры бардзо дарагія і камунальныя плацяжы высокія. А яшчэ няма глазураваных сыркоў, квасу і зефіру», — адзначыў мой польскі таварыш, і мы пайшлі вячэраць.

У моладзевай краме DC нагледзеў чорныя хуліганскія нагавіцы. Прымерыў, паглядзеўся ў люстэрка — зграбна глядзяцца.

Падобныя бачыў у Мінску за 280 тысяч рублёў. У «Аркадыі» ж нагавіцы каштавалі 100 злотых (каля 91 тысячы рублёў). Ды яшчэ і прадавачка нечакана папрасіла за нагавіцы роўна ўдвая меней. Пытаюся, чым заслужыў такое шчасце.

— То ў нас акцыя, — тлумачыць прадавачка, — купляеш удвая танней, але вярнуць рэч назад ці памяняць немагчыма.

— Ну і добжэ, — пагадзіўся я, — хай сабе носяцца да пенсіі.

За нагавіцы аддаў на нашы грошы 45,5 тысячы рублёў. А на беларускіх рынках нават кітайскія джынсы каштуюць каля 90 тысяч.

У краме з назвай House па «пшэцэнах» выкупіў дзве маднецкія майкі. Адну чорную з доўгімі рукавамі — за 29 злотых (каля 26 тысяч рублёў), другую жоўтую за 19 злотых (каля 17 тысяч). А майкам, па ўсім відаць, зносу няма, і паставу робяць больш зграбнай.

На беларускіх рынках, як я высветліў адразу па прыездзе з Варшавы, майка маскоўскага прывозу каштуе каля 40 тысяч, а турэцкага — пад 60 тысяч.

Знайсці новы пінжак па зніжцы было найцяжэй. Але ў «крутой» для беларуса краме MEXX мне трапіўся патрэбны тавар. Шэры ў палоску пінжак першапачаткова каштаваў 679 злотых (620 тысяч рублёў). Ды калі я пабачыў зніжку, то не паверыў сваім вачам — 189 злотых (173 тысячы).

А мяккія цацкі ў Беларусі яшчэ і таннейшыя на 20-30 працэнтаў.

Зняў з вешалкі патрэбны памер, апрануў і пытаюся ў прадавачкі:

— Як то выглёнда, пані? Ці элеганцка?

— Ладна выглёнда, — падбадзёрвала маладая чарнавокая прадавачка. — І тканіна не мнецца.

Яшчэ раз паглядзеўся ў люстэрка — і сапраўды, з такім пінжаком хоць у жаніхі. Купіў.

У мінскім буціку такая рэч каштуе долараў 300, і то калі пашанцуе.

У польскім гандлёвым цэнтры задаволены карэспандэнт «Звязды» аглядае свае пакупкі.

Цэтлік з маднецкага пінжака, які купіў карэспандэнт «Звязды». Зверху — першапачатковы кошт. Знізу — выніковы кошт са зніжкай.

Удвая танней каштуюць нават памперсы

Прыбарахліўшыся, я пайшоў у краму цацак «Смык», каб знайсці ляльку для сваёй пляменніцы. Але тут зніжкі мяне не здзівілі. Кошты акурат як у нас, толькі асартымент большы. А мяккія цацкі ў Беларусі яшчэ і таннейшыя на 20-30 працэнтаў. Краму ахоўваў дзядзька ва ўніформе, які пільна сачыў за наведвальнікамі.

У выніку я спыніўся на мульцяшным дракончыку Кэці, што хаваецца ў гумовым яйку. Кошт — 55 злотых (каля 50 тысяч рублёў).

Пачак памперсаў (72 штукі) прадаваўся ў аптэцы Superfarm са зніжкай у 7 працэнтаў. Выніковы кошт памперсаў — 45 злотых (41 тысяча рублёў). У нас жа такія самыя абыдуцца ў 70 тысяч рублёў. І то трэба ведаць, дзе купляць.

— Ці жадае пан вітаміны для свайго дзецка? — з усмешкай запыталася прадавачка.

Але пан спяшаўся і пабег у іншую краму. Бо поўным ходам вечарэла.

Закончыў я пакупку адзення парай модных скураных красовак Puma са зніжкай у 40%. Заплаціў 119 злотых (109 тысяч рублёў).

Вядома, у нас такія менш чым за 100 долараў не знойдзеш.

З усіх прадуктаў у Польшчы даражэйшыя толькі марскія

У гэты час у Беларусі ўжо заканчвалася «Калыханка». І я яшчэ паспеў кінуцца ў супермаркет па прадукты. Не буду дэталёва спыняцца на сырах, каўбасах і смятанах, але кошты на прадукты ў сярэдніх польскіх крамах сёння таксама значна ніжэйшыя, чым у нас.

— Польшча па памерах большая за Беларусь, — тлумачыць калега-журналіст Міхал, — дужо робім свайго і не так дужо да нас экспартуецца. Велька канкурэнцыя, для тэго і цэны ніжэйшыя.

Урэшце ў польскім супермаркеце я купіў амаль тыя ж тавары, што бяру ў беларускай краме. Дома плачу за іх каля 80 тысяч рублёў, у Варшаве пакупкі мне абышліся прыкладна ў 64 тысячы на нашы грошы.

Фірмовая гарэлка Absolut (31 злоты ці 28 тысяч рублёў) амаль удвая таннейшая, чым у Беларусі. Што казаць пра розныя віскі і тэкілы.

Адзінае, што здзівіла, — морапрадукты ў Польшчы ўдвая даражэйшыя за тыя, што прадаюцца ў нас.

— На крабавых палачках можна разарыцца, — памахаў я ўказальным пальцам перад Міхалам.

Больш прэтэнзій да коштаў на прадукты ў мяне не ўзнікла.

— Затое ў нас кватэры бардзо дарагія і камунальныя плацяжы высокія. А яшчэ няма глазураваных сыркоў, квасу і зефіру, — адзначыў мой польскі таварыш, і мы пайшлі вячэраць.

Яўген ВАЛОШЫН.
Фота аўтара і выпадковых мінакоў.

На фота карэспандэнт у купленых нагавіцах і майцы здзіўляецца дарагім коштам на беларускіх рынках.

Колькі я зэканоміў на польскім шопінгу?

На нагавіцах я захаваў не менш за 44,5 тысячы рублёў. На майках зэканоміў пад 39 тысяч. Будзем лічыць, што на пінжаку я не выйграў, бо беларускі якасны і стылёвы пінжак каштуе столькі ж. Тое самае з цацкай для пляменніцы.

Затое на скураных красоўках зэканоміў не менш за 171 тысячу. А ім жа зносу няма.

На двух пачках памперсаў — 28 тысяч рублёў. На прадуктах — 16 тысяч. На дзвюх бутэльках якаснай гарэлкі (а больш праз мяжу правозіць нельга) — 44 тысячы рублёў.

Каб нашы мытнікі не падумалі, што я прадпрымальнік, з усіх рэчаў паздымаў этыкеткі. І праблемаў не ўзнікла.

Улічым, што за квіткі на цягнік да Варшавы я аддаў 123,5 тысячы. Вяртаўся ж я вельмі хітра — на танным цягніку да памежнага з Беларуссю Тэрэспаля, потым на электрычцы да Брэста, а адтуль ужо — у горад-герой Мінск. Атрымалася 76 тысяч рублёў. А ўся дарога абышлася ў 199500 рублёў.

Начаваў я ў калегі журналіста, таксама выгадна.

Зэканомленыя 342500 рублёў мінус дарога (199500) — выйшла 143000 рублёў зэканоміі. І пры гэтым улічыце, што я паглядзеў Варшаву і атрымаў вялікую асалоду ад свайго прыгодніцкага падарожжа.

КІРМАШ
штотыднёвы рэкламны выпуск № 15 (615)
аддзел рэкламы 287-17-79
Рэквізіты для аплаты: р/р 3012210270016 у ААТ "Белінвестбанк" г.Мінска, код 739 УНН 100155376

ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

ПРАДАЕЦЦА

❒ Зборна-шчытавы дом, уцеплены, абабіты вагонкай, фінскі. Дом не выкарыстоўваўся. Захоўваецца пад навесам.

Тэл.: 8 01797 46 007; 8 029 952 21 07, 875 46 25.

❒ Кватэра двухпакаёвая, новая. 48 м² у г. Салігорску, 3-і паверх 9-павярховага дома. Цэнтр.

Тэл.: 8 029 862 86 85; 8 029 769 07 11.

❒ Кватэра двухпакаёвая. 39,5/23,5/6,3 у г. Мінску па вул. Пляханава, добры рамонт, мэбля. Цана $64 500.

Тэл. 8 029 145 11 97.

❒ Кватэра двухпакаёвая з усімі выгодамі ў г. Кобрыне.

Тэл. 8 029 824 98 24.

❒ Аўтамабіль «Фальксваген-Гольф», 1996 г.в. 1,8ТД, белы метал, ц/з, г/у, ABS, СД-МРЗ, нефарбаваны. $3650. Магчымы торг.

Тэл. 8 029 771 51 78.

❒ Новыя драўляныя вокны, двайныя, з шуфлядай, 6 шт. 1,20х1,20. Нядорага.

Тэл. 8 029 144 14 13.

❒ Бульбаўборачны аднарадны камбайн Л-601; металічныя падстаўкі для пчаліных вуллёў.

Тэл.: 8 017 97 46 007, 8 029 952 21 07; 8 029 875 46 25.

❒ Цеплагенератар ТГ-Ф-2,5-0,2 м на вадкім паліве для сушкі збожжа; бульдозер ДТ-75; гнаераскідальнік РОУ-6.

Тэл.: 8 01797 46 007; 8 029 952 21 07, 8 029 875 46 25.

❒ Пускач і зборы (з рамонту) да МТЗ; халадзільнік «Мінск-15», б/к, у добрым стане.

Тэл. 8 017 70 655 07.

❒ Бочка п/э на 1000 л у металічнай аплетцы на паддоне, заліўная гарлавіна, зліўны кран, г. Мар'іна Горка.

Тэл. 8 029 343 19 69.

❒ Газавая пліта «Gefest», Брэст, 50х57 см, з эл. грылем і верцелам, новая, нядорага.

Тэл. 8 029 115 56 99.

ЗВЯЗДА

КУПОН ДЛЯ БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБ'ЯВЫ

Запоўніце разборліва, выражце і вышліце на адрас рэдакцыі:
220013 Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 А. Тэлефон для даведак 287 17 79.

АБАВЯЗКОВЫЯ звесткі не для друку: ВАША ПРОЗВІШЧА, АДРАС, ХАТНІ ТЭЛЕФОН.

Пашпарт, серыя_____ №_____ Выдадзены _____

Подпіс _____ Дата _____

Металачарапіца, андулін, прафнасціл, сайдынг.
Абмер, дастаўка.
Тэл. 283 79 27,
маб. (029) 659 47 70, 553 44 33.
УНН 191111338

РАМАНТАВАЎ ПАКОЙ...

У інтэрнаце па вул. Маладагвардзейскай, што ў Брэсце, 32-гадовы мужчына рамантаваў свой пакой. Па неасцярожнасці ці па іншай прычыне ён зваліўся з сёмага паверха. Пакалечанага даставілі ў бальніцу, але праз паўсутак ён памёр.

ПАДПАЛІЎ, АЛЕ НЕ ЎЦЁК

Пенсіянер з Баранавічаў вырашыў адпомсціць знаёмым з пасёлка Усходні. А палове другой ночы ён падпаліў дзверы ў дзвюх кватэрах. Але падпальшчыку не пашанцавала. Праз паўгадзіны яго затрымаў нарад міліцыі.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Логойский сельский исполнительный комитет Логойского района Минской области

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания жилых домов в Логойском районе в том числе:

№ лота	Адрес земельного участка, кадастровый номер	Площадь земельного участка, га	Стартовая цена бел. руб.	Расходы по подготовке землеустроительной документации, бел. руб.
1	д. Нивки 623284604101000022	0,2500	1955800	1206604
2	д. Рудня 623284605101000035	0,2142	2113795	1206604
3	д. Михалово 623284603601000068	0,1907	2419570	1206604
4	д. Рудня 623284605101000034	0,2142	2113795	1206604

Примечание: по ЛОТУ № 2, ЛОТУ № 3, ЛОТУ № 4 имеются ограничения в использовании в связи с нахождением земельного участка в водоохранной зоне реки Гайна.

Задаток в размере 10 % от начальной стоимости земельного участка перечисляется на р/с № 3600619101109 в ЦБУ № 611 филиала № 500 Минское управление ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Логойск, ул. Пролетарская, 1, УНН 600181577. Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок и возместить расходы, связанные с подготовкой землеустроительной документации. Все участники могут ознакомиться с земельными участками и документацией на них. Иные обязанности победителя торгов и порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. **Аукцион состоится 12 августа 2009 года в 10.00 по адресу: г. Логойск, ул. Тимчука, д. 6, ком. 7.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 8 августа 2009 года до 13.00 по адресу: г. Логойск, ул. Тимчука, 6, ком. 9.

Контактные телефоны (801774) 55473, 54350.
Информацию можно найти на сайте www.Logoysk.by

Результаты рекламной игры «Global Gathering Freedom Festival»

Рекламная игра проводилась на всей территории Республики Беларусь в период **с 27 июня по 15 июля 2009 года**. Розыгрыш рекламной игры состоялся 30 июня 2009 года. В ходе розыгрыша было определено 20 победителей, получивших туристические поездки на фестиваль Global Gathering Freedom Festival в Киеве (Украина), проходивший 11 июля 2009 года.

Таблица 1. Победители розыгрыша туристических поездок (Минск – Киев – Минск (автобус и входные билеты на двоих на фестиваль Global Gathering Freedom Festival, выезд 10 июля 2009 года, без питания и проживания)).

	Ф.И.О.
1	Авижа Евгений Иосифович
2	Библя Алексей Леонидович
3	Бильдюкевич Александр
4	Болкун Юлия Анатольевна
5	Бунас Артур Вячеславович
6	Вельянинов Павел Владимирович
7	Горбач Дмитрий Александрович
8	Дедок Евгений Сергеевич
9	Зенюк Дмитрий
10	Казанцев Евгений Юрьевич
11	Ковалёв Игорь Леонидович
12	Курач Вадим Васильевич
13	Леонович Ольга Николаевна
14	Липень Алексей Александрович
15	Соболевский Евгений
16	Уласик Павел Александрович
17	Филиппов Дмитрий Сергеевич
18	Черникович Константин Александрович
19	Шаврей Антон Владимирович
20	Юрчак Вадим Васильевич

Свидетельство № 1466 от 5 июня 2009 года о государственной регистрации правил проведения рекламной игры, выданное Министерством торговли Республики Беларусь.

Первичная профсоюзная организация Слонимского отделения филиала ОАО «БПС-Банк» по Гродненской области заявляет о прекращении своей деятельности: г. Слоним, ул. Брестская, 65 А. УНП 590095371. Свидетельство о государственной регистрации № 598 от 26.07.2007 г., выданное Слонимским райисполкомом. Претензии принимаются в течение 2 месяцев со дня опубликования объявления.

Утеряно **Государственное удостоверение на право охоты** № 0072730 и **карточка учета нарушений** № 0071230 на имя **Широкого Дмитрия Олеговича**.

Дзённік фестывалю

Клон «базарны» — Украіне?

Ва Украіне на поўным сур'ёзе задумваюць «кланіраваць» «базар» і правесці нешта аналагічнае — такое ж маштабнае, каб фестываль таксама стаў вядомым на ўвесь свет. Зайздросцяць? Без пытання.

І пра «клон» гэта не жарт! На прэс-канферэнцыі, прысвечанай Дню Украіны на віцебскім «базары», украінскі ж журналіст запытаў: а чаму б і нам нешта такое не правесці? Намеснік міністра культуры і турызму гэтай краіны прызнаўся: ідэя «ўжо лятае ў паветры».

Наконт таго, чаму ў традыцыйным канцэрце майстроў мастацтваў Украіны ў Летнім амфітэатры выступіў толькі адзін калектыў, а не было «зорак» эстрады з гэтай краіны? Той жа Ратару, напрыклад?

Адказныя асобы ўкраінскай дэлегацыі растлумачылі гэта вельмі проста — мы, маўляў, прывезлі на чарговы «базар» адзін з лепшых прафесійных калектываў краіны — Нацыянальны заслужаны акадэмічны ансамбль танца Украіны імя Паўла Вірскага. Цэлых 150 чалавек. Арганізатарам і кіраўніком гэтага ўнікальнага калектыву з 1955 па 1975 год быў народны артыст СССР, лаўрэат дзяржаўнай прэміі СССР Павел Вірскі. Ён, абапіраючыся на нацыянальныя традыцыі, стварыў пяць канцэртных праграм, харэаграфічныя кампазіцыі, якія і цяпер з'яўляюцца залатым рэпертуарным фондам ансамбля. Калектыў гастраляваў больш чым у 60 краінах. Пасля выступлення ў зале імя Кенэдзі ў ЗША амерыканскія газеты адзначылі, што такога выступлення Вашынгтон яшчэ не бачыў.

Танцоры і раней выступалі на віцебскім фестывалі, і сёлета паказалі цэлы фальклорны спектакль.

Духоўны падарунак фестывалю

Храм у самым цэнтры фестывальнага горада аднавілі літаральна з «народнай» цэглы.

Менавіта так і было: усе ахвотныя маглі заплаціць за цэглу, якую потым выкарыстоўвалі для аднаўлення храма. На цагліне пісалі імёны добрых і неабыякавых людзей, якія не пашкадавалі ўласных грошай.

Духоўны падарунак фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску», якому, нагадаю, сёлета споўнілася 18 гадоў, стаў вельмі сімвалічным. У фестывальным Віцебску, у самым цэнтры старога горада, пасля поўнага аднаўлення (літаральна «з нуля») адкрылася Свята-Уваскрэсенская царква.

Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі Філарэт узначаліў літургію. Ён, а таксама старшыня Віцебскага аблвыканкама Аляксандр Косінец шчыра падзякавалі ўсім, хто дапамог грашыма аднавіць храм, будаўнікоў, мастакоў, якія пастараліся, каб храм стаяў не адно стагоддзе, здзіўляў усіх сваёй знешняй і ўнутранай прыгажосцю.

Гэты храм разбурылі ў сярэдзіне 1930-х, аднаўляць пачалі ў 2001-м. У асноўным работы фінансаваліся з абласнога бюджэту.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Прагуляцца па Даўгаўпілсу

На «Славянскім базары» гэта можна зрабіць, не пакідаючы межаў Віцебска. Дастаткова толькі завітаць на выставу фотакарэспандэнтаў газет гэтага латвійскага горада «Даўгаўпілс. Святы і будні», каб убачыць «твару неагульны выраз», сучаснае жыццё і гістарычны складнік, настрой і аўру горада-пабраціма Віцебска.

Латвія адлічвае свой удзел у фестывалі з 1997 года, але ўпершыню паказвае на ім такую маштабную праграму: моладзевы канцэрт і выступленне камернага сімфанічнага аркестра, выставу работ студэнтаў Даўгаўпілскага ўніверсітэта і фотавыставу, праграму рамансаў і эстрадных песень, а таксама тэатральную пастаноўку «Адэса, горад чараўніцкі...», якая трэці сезон з поспехам ідзе не толькі ў Латвіі, але таксама ў Германіі, а неўзабаве будзе паказана ў Маскве.

Асобна варта адзначыць выставу ўдзельнікаў Міжнародных мастацкіх пленэраў імя Марка Ротка за 2005—2008 гады. Гэты мастак, заснавальнік новага накірунку ў жывапісе — абстрактнага экспрэсіянізму — уславіў свой родны Даўгаўпілс гэтак жа, як Марк Шагал — Віцебск. «Так што цяпер мы будзем сябраваць не толькі гарадамі, але і двума Маркамі», — жартуюць удзельнікі латвійскай дэлегацыі.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Сканворд (11 ліпеня). Па гарызанталі: Брусніцы. Адвакат. Дудар. Цэх. Ялік. Алабама. Удар. Гронка. Абуза. Лодар. Карп. Плакса. Суніца. Рагожа. Рыс. Руб. Струг. Індура. Хам. Марцыпан. Мана. Ірбіс. Уран. Рагу. Бак. Талерка. **Па вертыкалі:** Чарніцы. Епархія. Хорда. Кворум. Нос. Журавіны. Удаў. Лук. Анабар. Ідал. Бура. Наводка. Ірак. Род. Пасаг. Цыкада. Нут. Алтар. Сон. Атара. Фунт. Брук. Завіруха. Муар. Цыган. Прас. Марошка.

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



Райманд ПАЎЛС: «Я АДЧУВАЮ ПРАМЕНЬ, ЯКІ ІДЗЕ АД ЧАЛАВЕКА»

Фестывальны партрэт

ЯГО імя — гэта не толькі сотні шлягераў, назвы і мелодыі якіх адразу ўспліваюць у памяці, але яшчэ дзясяткі таленавітых артыстаў, чыя зорка запалілася ў многім дзякуючы супрацоўніцтву з кампазітарам. Зрэшты, дастаткова назваць усяго некалькіх: Ала Пугачова, Лайма Вайкуле, Ларыса Мондрус, Сафія Ратару, Як Ёла, і знакаміты дзіцячы ансамбль «Зязюлечка», — і адразу зразумела, аб кім гаворка: маэстра, прывітанне, як мы рады вас бачыць! Ці звяртаеце вы сёння ўвагу, хто сядзіць на 8-м радзе і як кружаць над горадам жоўтыя лісты?

Райманд Паўлс упершыню за ўвесь час існавання «Славянскага базару ў Віцебску» наведаў фестываль, і адразу з даволі вялікай праграмай — нумарам у канцэрце адкрыцця, сумесным канцэртам з опернай спявачкай Ілонай Багеле і аншлагавай тэатральнай пастаноўкай «Адэса, горад чараўніцкі...», падчас якой усе 2 гадзіны маэстра сядзеў за піяніна і акампаніраваў спектаклю.

— Маэстра, вы ўпершыню ў гасцях фестывалю...

— Як ні дзіўна, так.

— Раней вас не маглі ўгаварыць або не заставала часу?

— Не тое каб мяне ўгаворвалі, што вы. Я пэўны час не хацеў ехаць з тых меркаванняў, што амаль адначасова ішлі гэтыя два фестывалі — у Юрмале і Віцебску, а ў Юрмале я быў адным з галоўных арганізатараў... Цяпер я да гэтага стаўлюся крыху па-іншаму. *(Задумваецца.)* Напрыклад, у апошні год я пачаў больш выступаць як піяніст і менш пішу ўсіх гэтых песень... Сёння напісаў — усе кажуць, не, у 80-я было лепш. Я махнуў рукой і заняўся толькі музыкай. Таму з'явілася больш вольнага часу, у тым ліку і на тое, каб прыехаць у Віцебск. Я прыехаў паказаць, што яшчэ жывы, яшчэ выходжу на сцэну і не блытаю ноты, хоць узрост у мяне ўжо і не эстрадны, 73 гады.

— Многія адразу пачалі параўноўваць конкурс маладых выканаўцаў у Віцебску з «Новай хваляй», за якой беларусы пільна сочаць вельмі даўно. На ваш погляд, ці ёсць паміж імі падабенства?

— Я лічу, параўноўваць не трэба — кожны конкурс мае сваю аўру, сваю атмасферу. Юрмала — гэта стары конкурс, яшчэ з савецкіх часоў, хоць і абноўлены цяпер. Там акцэнт робіцца на песню, на выканаўцаў. А ў Віцебску, на маю думку, гэта больш фестываль усіх жанраў і розных відаў мастацтва — і тэатральныя пастаноўкі, і канцэрты ўсіх кірункаў. Зразумела, мерапрыемства праходзіць зусім з іншым размахам. Хоць унутры ядро аднолькавае: пошук новых цікавых імёнаў, спроба даць маладым талентам здзейсніць першы скачок у неба. Удасца гэта ці не ўдасца, ужо іншае пытанне — прабіцца складана, а для некаторых паражэнне ў конкурсе можа стаць увогуле канцом кар'еры — калі ты нічым не запомнішся і не спадабаешся гледачу, на табе і прафесіяналы паставяць крыж. Безумоўна, маладых спевакоў вельмі многа дзякуючы ўсім гэтым «фабрыкам», і цяпер дайшло да таго, што — не ведаю як у вас, а ў Латвіі ўсе спяваюць. Усе крычаць, хто ў ноты, хто міма. І тут ёсць палка з двума канцамі — у пагоні за відовішчнасцю і масавасцю конкурсаў мы губляем прафесійнасць. Спяваць могуць усе, але ж ёсць розніца, спяваць у нейкім начным клубе ці на фестывалі такога ўзроўню, як віцебскі — гэта ж дзень і ноч...

— Лайма Вайкуле сказала, што яна перш за ўсё шукае ў маладых выканаўцах унутраны стрыжань, перспектыву. Райманд Вальдэмаравіч, на што вы, як сустаршыня журы «Новай хвалі», звяртаеце ўвагу — на харызму, талент, рэпертуар, чыста чалавечае абаянне?

— Я не магу адказаць на гэта пытанне, хоць яго сапраўды часта задаюць. Напрыклад, амаль усе латышскія спевакі (толькі разумейце мяне правільна) прайшлі цераз мае рукі, але ўсё адно я не растлумачу ў двух словах, хто з іх мне спадабаўся і чаму. Гэта проста прафесійная інтуіцыя, напэўна. Як і вы слухаеце канцэрт у зале, выступае мноства артыстаў і раптам адзін — зачапіў, і вы ўжо можаце сказаць: «Гэта мне падабаецца, а гэта не падабаецца». Тое ж самае і ў мяне — я адчуваю, як бы гэта мовіць, нейкі прамень ад чалавека, штосьці мяне чапляе. Адзін латышскі спявак, які ў свой час выканаў песню «Дэлайла» з рэпертуару знакамітага Тома Джонса, менавіта дзякуючы ёй стаў самым папулярным у Латвіі артыстам! Бо ў гэтай песні я адчуў, што ў хлопца ёсць патэнцыял, ён можа выдатна раскрыцца, а да таго спявак выходзіў з гітарай і нешта сваё выконваў, абсалютна не запамінальнае. Таму гэта справа — на што звяртаеш увагу ў выканаўцу — вельмі суб'ектыўная. Хоць, безумоўна, самае галоўнае — голас, прыемны і цікавы тэмбр, талент (ён павінен быць па змоўчанні). А ўжо далей прыходзіць думка, як гэтага чалавека зрабіць «зоркай». Сёння гэта не проста: запісы ў студыі, здымкі відэа — усё гэта шалёныя грошы... Усё інакш, чым было раней. Я помню, за савецкім часам у Юрмалу прыехала маладая спявачка, здаецца, з Далёкага Усходу — дык мая жонка ёй сукенку дала, бо не было ў чым выступаць... Праўда, што далей было з той дзяўчынай, я не памятаю, хоць Юрмала дала эстрадзе і даволі многа вядомых цяпер выканаўцаў.

Выступленні беларусаў на юрмальскай сцэне Райманд Паўлс не каментуе, дыпламатычна ўхваляе ўсіх — маўляў, кожны выканаўца па-свойму цікавы, таму ён не вылучаў асабіста для сябе фаварытаў ці аўтсайдараў. А пра віцебскае (дый, па вялікім рахунку, і любое іншае) песеннае спаборніцтва мудра заўважае: «Галоўнае, каб з гэтых 16 канкурсантаў хоць адзін ці два артысты застануцца, зачэпяцца за прафесійную сцэну».

— Хоць і не варта слепа разлічваць толькі на конкурс, — дадае маэстра. — Памятаеце, нядаўна на пахаванні Майкла Джэксана раптам выходзіць хлопец 10 гадоў — Божа мой, як ён спявае! Адкуль ён узяўся, хто ён такі — ніхто не ведае, але ўсе проста ахнулі. Або ўзгадаць брытанскую хатнюю гаспадыню з чароўным оперным голасам — нечакана са сваёй кухні так упэўнена ўзышла на эстрадны небасхіл... Таму, магчыма, і ў вас у нейкай далёкай вёсачцы ёсць хлопец, які выдатна спявае — мы ж гэтага не ведаем; і магчыма, ён дзесьці ў канцэрце выпадкова з'явіцца. Таму ролю шчаслівага выпадку таксама нельга недаацэньваць, яна часам нават больш важная, чым нават талент і прыгажосць, разам узятыя.

«Я адчуў, што горад гуляе»

Запланаваная на пяць хвілін наша гутарка атрымалася значна больш доўгай і нечакана задушэўнай, магчыма таму, што нас не цікавіла палітычнае мінулае і сапраўднае дэпутата Райманда Паўлса — толькі творчасць, музыка — і яшчэ крыху пазамузычнае жыццё.

— У Беларусі я быў яшчэ ў савецкі час — цішком, крадком, калі яшчэ межаў не было, паехалі па ракаў, і на ноч засталіся ля нейкага возера. Нас затрымалі і арыштавалі, палічыўшы, відаць, шпіёнамі, — разгаварыўшыся, са смехам узгадаў Райманд Паўлс. — Потым давялося доўга тлумачыць, што мы — грамадзяне Савецкага Саюза. Але ўсё скончылася добра: і ракаў налавілі, і з міліцыяй потым пасмяяліся, выпілі разам.

— Цяпер усё інакш — і межы, і візы, і мытні — але не для свята. Ад фестывальнага Віцебска якія ў вас уражанні?

— Вельмі прыемна здзіўлены чысцінёй і ўтульнасцю горада. Хоць напачатку мяне дабіла, што пад вокнамі гасцініцы ўвесь дзень быў канцэрт, уключылі апаратуру на ўсю магутнасць, і Вайкуле ўжо не ведала, куды падзецца ад шуму... Але я зразумеў, што горад гуляе і адпачывае — і гэта добра, гэта выдатна. У сваім родным горадзе, на жаль, я ўжо даўно не адчуваю такой атмасферы.

«Аб'яві ты песню і ідзі дадому»

А спрачаемся, вы не ведалі, што знакаміты піяніст і кампазітар, якому, здаецца, трэба не тое што берагчы, а застрахаваць свае музычныя рукі, істотна-такі папсаваў іх, працуючы на сваім прысядзібным участку пад Рыгай? «Я дамасед, люблю займацца ўсякімі хатнімі справамі, нават адпачываю больш ахвотна на дачы, а не ва ўсякіх экзатычных краінах, за што на мяне жонка вельмі крыўдзіцца, — прызнаецца маэстра. — Толькі цяпер адпачываю не часта — лічыў, што мая кар'ера даўно закончылася, але, як ні дзіўна, апошнім часам я зноў пачаў вельмі актыўна выступаць, гэта ўжо трэцяя ці чацвёртая маладосць. Вось толькі прыеду, і ўжо ў нядзелю буду выступаць на масавым вясковым музычным свяце, потым — з сімфанічным аркестрам іграць лёгкую музыку, потым пачнецца ўжо «Новая хваля» з усімі сваімі інтрыгамі...». Дарэчы, нягледзячы на распаўсюджаныя чуткі, што летась маэстра пакрыўдзіўся на недарэчныя жарты вядучых «Новай хвалі», у прыватнасці, Ксюшы Сабчак, і вырашыў увогуле выйсці са складу журы, Райманд Паўлс катэгарычна запэўніў: «Пакуль з нашых спевакоў хтосьці будзе ўдзельнічаць у гэтым конкурсе — я буду ў журы. А вядучыя мяне, шчыра кажучы, заўжды раздражняюць, яны спрабуюць жартаваць, а выходзіць нясмешна і не разумна. Лепш аб'яві ты гэтую песню — і ідзі дадому».

З нотнага ліста чытала Вікторыя ЦЕЛЯШУК. Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТОВ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА ПУТЕМ ПРОВЕДЕНИЯ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ

ЗАО «Выставочный центр «Аквабел» Минский район проводит аукцион по продаже объектов недвижимого имущества

№ лота	Наименование объекта	Инвентарный номер	Год постройки	Площадь застройки кв.м	Общая площадь здания, кв.м	Начальная стоимость объектов, бел. руб. с НДС	Размер задатка, бел. руб.
1	Зерносушитель (адрес: район д. Городище Минского р-на)	600/С-43150	1976	752	695,1	450 000 000	4 500 000

Условия проведения аукциона:

Организатором аукциона и продавцом является Закрытое акционерное общество «Выставочный центр «АКВАБЕЛ» Минский район, адрес: Минский район, пересечение Логойского тракта и Минской кольцевой автодороги, Административное здание, комната 302.

Торги состоятся **22.07.2009** года в **10.00** по адресу: Минский район, пересечение Логойского тракта и Минской кольцевой автодороги, Административное здание, 3 этаж, зал совещаний.

Шаг аукциона – 5 % от начальной стоимости объекта.

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица любой формы собственности, а также иностранные инвесторы (иностранные государства, объединения, международные организации, иностранные юридические и физические лица, а также граждане Республики Беларусь, имеющие постоянное место жительства за границей).

Для участия в аукционе необходимо представить следующие документы:

заявление на участие в аукционе и об ознакомлении с объектом;

заверенную банком копию платежного поручения, подтверждающего внесения задатка в размере **4 500 000** белорусских рублей;

юридическими лицами – резидентами Республики Беларусь – доверенность представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), заверенные копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации;

представителями физических лиц – резидентов Республики Беларусь – нотариально заверенную доверенность;

юридическими лицами – нерезидентами Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения;

юридическими и физическими лицами – нерезидентами Республики Беларусь – документ о состоятельности, выданный обслуживающим его банком или иной кредитно-финансовой организацией, с заверенным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык;

представителями юридических и физических лиц – нерезидентов Республики Беларусь – легализованную в установленном порядке доверенность.

Задаток в размере **4 500 000** белорусских рублей перечисляется по безналичному расчету в белорусских рублях на расчетный счет ЗАО «Выставочный центр «АКВАБЕЛ» Минский район» № 3012204960010 в ф-ле Минская городская дирекция ОАО «Белагропромбанк» г. Минск, код 153001963, УНН 600438617.

Задаток возвращается всем участникам аукциона, кроме участников аукциона, выигравших торги, в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня проведения аукциона или с момента регистрации продавцом (организатором аукциона) отказа от участия в аукционе. Участнику аукциона, выигравшему торги, задаток не возвращается, а учитывается при окончательных расчетах.

Победитель аукциона заключает договор купли-продажи в течение 5 (пяти) банковских дней с даты подписания протокола о результатах аукциона. В случае уклонения или отказа от заключения договора задаток победителю аукциона не возвращается.

Оплата стоимости приобретенных на аукционе объектов осуществляется по безналичному расчету в белорусских рублях в течение 10 банковских дней с даты подписания протокола о результатах аукциона.

Заявки на участие в аукционных торгах принимаются до **21.07.2009** г. до **14.00** включительно по адресу: Минский район, пересечение Логойского тракта и Минской кольцевой автодороги, Административное здание, 1 (первый) этаж, комната 103. Тел. (017) 237 91 32, (029) 757 12 02.

Генеральный директор Синкевич Н.Н.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	4.56	21.35	16.39
Віцебск —	4.38	21.32	16.54
Магілёў —	4.46	21.25	16.39
Гомель —	4.51	21.13	16.22
Брэст —	5.12	21.48	16.36
Гродна —	5.22	21.40	16.18

Месяц

Апошняя квадра 15 ліпеня. Месяц у сузор'і Авена.

Імяніны

Пр. *Ангеліны, Пятра.*

К. *Ангеліны, Ізабелы, Марцэля, Нікадзіма, Якуба.*

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

НАДВОР'Е на заўтра

...у суседзяў

ВАРШАВА	+32..+34°С	КІЕЎ	+26..+28°С
РЫГА	+25..+27°С	ВІЛЬНЮС	+28..+30°С
МАСКВА	+22..+24°С	С.-ПЕЦЯРБУРГ	+23..+25°С

Дзве даты

14 ліпеня

1820 год — нарадзіўся Ян Казімір Завіша, вядомы беларускі археолаг. Адным з першых даследаваў стаянкі каменнага веку на тэрыторыі Беларусі. Вывучаў пытанні засялення старажытнымі людзьмі берагоў рэк Вілія, Дняпра і Нёмана, міграцыю і культурныя сувязі славянскіх плямёнаў. Заснаваў і выдаваў на свае сродкі «Археалагічныя ведамасці» (1873—1882).

1789 год — з узяцця Бастыліі, сімвала абсалютызму, пачалася Вялікая Французская рэвалюцыя.

Цытата дня:

«Не будзь занадта пераборлівы. Лепі мець старыя, патрыманыя брыльянты, чым не мець ніякіх».

Марк Твен (1835—1910), амерыканскі пісьменнік.

КАБ ВЫКЛІКАЦЬ ДОЖДЖ

Рытуальныя дзеянні, звязаныя з тым, каб выклікаць на зямлю доўгачаканы дождж, даволі разнастайныя, але ў іх аснове ляжаць магічныя дзеянні з вадой ці каля вады: ракі, калодзежа, крыніцы, возера і г.д.

● Каб выклікаць дождж, жанчыны збіраліся каля калодзежа, асвячалі ваду, чыталі замовы, выконвалі разнастайныя рытуальныя дзеянні.

● Часам звярталіся па дапамогу да душ тапельцаў. Для гэтага ў калодзежы размешвалі ваду палкамі і галасілі, называючы па імені тапельца, напрыклад: «Макарка патануў. Макарка, сынка, вылезь з вады, разлі слёзы па святой зямлі!».

● Каб выклікаць дождж, ішлі да забытых калодзежаў і крыніц, ачышчалі іх, ставілі побач крыжы, капліцы, вешалі іконы.

● Часам, знаходзячыся каля вады (крыніцы, ракі, возера), людзі аблівалі адзін аднаго вадой і казалі: *«Як на цябе вада ільецца, так каб дождж зямлю абліваў»*. Гэты абрад атрымаў у народзе назву «аблівача».

● Часам аблівалі парадзіху ці цяжарную жанчыну, якая ў гэты момант атаясамлівалася з маці-сырой зямлёй; пастуха, які на думку народа, мог «кіраваць» не толькі зямным, але і нябесным статкам.

● Аблівалі тых, хто парушаў пэўныя забароны: тую жанчыну, якая пякла на Благавешчанне хлеб і тым самым наклікала на ўсю вёску такое няшчасце, ці тую, якая ткала ў святочныя дні ці нядзелю; таго, хто ставіў тын не ў свой час і г.д.

● На Палессі доўгі час быў распаўсюджаны звычай «араць» раку, каб пайшоў дождж. Для гэтага самую прыгожую дзяўчыну агалялі, упрыгожвалі вянкамі, і прасілі працягнуць плуг па засохлай рацэ ці нават па самой вадзе.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Усміхнёмся!

Калі галава баліць — яна думае аб піве.

☺

— Цяпер у модзе жаночая эмансіпацыя.

— А што такое «эмансіпацыя»?

— Ты што! Эмансіпацыя — гэта калі жанчыны за правы змагаюцца.

— Калі жанчыны за правы змагаюцца — гэта экзамен у ДАІ.

☺

Звычайна на дні нараджэння імяніннік патрэбен толькі на першыя 5—7 чарак...

☺

— Учора быў на прэм'еры вашай п'есы і цэлую ноч не мог заснуць.

— Так усхвалявала п'еса?

— Не, выспаўся ў тэатры.

☺

Наступіла сесія. Студэнты пацягнуліся да ксераксаў...

КАЛІ ДАЙМАЕ СМАГА

У вёсцы Лясная пад Баранавічамі злодзеі праламалі цагляную кладку, выламалі рашотку і вынеслі з крамы 184 бутэлькі віна, 17 кг каўбасы і 430 пачкаў цыгарэт. Рабаўнікамі былі двое жыхароў гэтай жа вёскі. Міліцыя вылічыла іх хутка, бо абодва ўжо пабывалі ў турме. Пачалі з іх — і не памыліліся. Частку ўкрадзенага ўдалося вярнуць.

У СКЛЕП — НА ПАРУ

Пенсіянер з в. Гартоль Івацэвіцкага раёна моцна абурыўся, калі ўбачыў, што нехта з дзвярэй яго склепа сярод белага дня сарваў навясны замок і вынес адтуль прадукты. Следства вызначыла, што ў склепе пабывалі мясцовыя зладзеі — беспрацоўны са сваёй сяброўкай. Жанчыну затрымалі, а вось яе напарнік збег.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 47 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год. Тыраж 32.345. Індэкс 63850. Зак. № 3767. Нумар падпісаны ў 19.30.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12